КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 25 (248) ◂ 24 чэрвеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



МАСТАК АЛЕСЬ ПУШКІН

Стар. 30–31

**БОГ ДАЎ МНЕ РУКІ. КАЛІ Б ЛЮДЗІ ДАЛІ МНЕ ПРАЦУ**

У дзяржаве каля 507 тысяч інвалідаў. Кожны другі чалавек, які атрымлівае пенсію па інваліднасці, знаходзіцца ў працаздольным узросце, але толькі прыкладна 18 працэнтаў з іх маюць работу

Стар. 6

**КІТАЙЦЫ ХОЧУЦЬ ПАЗБАВІЦЦА АД ДОЛАРАЎ**

Навіна пра тое, што беларускія ўлады кансультуюцца ў кітайцаў наконт сцэнару фінансавай стабілізацыі, выклікала шок у грамадстве — як вядома, у КНР фізічныя асобы не могуць набываць валюту

Стар. 28

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10025

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**БЕЛАРУСКІ НАВУКОВЕЦ У КАНАДЗЕ**

Нарыс Наталлі Гардзіенка з цыклу «Дыяспара»

ПРАТЭСТ

# МАЎКЛІВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

*Сяргей САЛАЎЁЎ*

**«Маё пакаленне стаіць па кутах, маё пакаленне не здолее пець», — спяваў Канстанцін Кінчаў. Зараз маё пакаленне не стаіць па кутах і пяе. Гэта выявілася на акцыі 22 чэрвеня.**

На гулянні «маўклівай рэвалюцыі» сабралася ад трох да пяці тысяч чалавек. Самай шматлікай стала акцыя ў цэнтры Мінска. Паводле розных ацэнак, у ёй узялі ўдзел некалькі тысяч чалавек. Яны планавалі сабрацца на Кастрычніцкай плошчы, аднак, як і ў мінулую сераду, за гадзіну да аб'яўленага пачатку акцыі (19.00) плошча была абнесена металічнымі турнікетамі і ачэплена міліцыяй. Турнікетамі была абнесена і плошча Свабоды.

Гэта нікому не перашкодзіла. Людзі хадзілі па вуліцах, пляскалі ў далоні. А міліцыя не магла нічога зрабіць. Па папярэдняй інфармацыі, затрымана было больш за 200 чалавек. Але што ім можна інкрымінаваць? Нічога. Хутчэй за ўсё, усе затрыманыя будуць адпушчаныя «без складання пратаколаў». А тым, каму выпішуць штрафы, людзі скінуцца па сто рублёў, і гэтыя штрафы аплацяць.

Але ж наколькі ўлада баіцца такога маўклівага пратэсту! У Мінску цягнікі не спыняліся на станцыях метро Кастрычніцкая і Купалаўская. АМАП і міліцыянты выцяскалі людзей з Кастрычніцкай плошчы і праспекту Незалежнасці і потым масава і жорстка затрымлівалі на вуліцах Леніна, Энгельса, Няміга. Аўтазакі, міліцэйскія аўтобусы ездзілі па цэнтры сталіцы і рабілі зачыстку.

Але, зноў паўтаруся, гэта нікога не спыніла. Некалькі соцень чалавек пачалі рух ад вуліцы Камсамольскай у бок плошчы Незалежнасці. На супрацьлеглым баку міліцыя адціскала людзей ад Цэнтральнай кнігарні да Нямігі.





Калі хто памятае «Рэвалюцыю», якую ініцыяваў палітык Андрэй Клімаў, той можа параўнаць колькасць удзельнікаў. Гэтым разам народу было разы ў два больш. То бок, на вуліцы Мінска сапраўды выйшлі тысячы людзей. Гэта — толькі на адну вуліцу, на вуліцу Леніна. А былі ж яшчэ і іншыя вуліцы. І іншыя гарады.

У Брэсце маўклівая акцыя пратэсту, якая выявілася ў прагулцы па горадзе, завяршылася на тым месцы, адкуль і пачалася. Людзі вярнуліся на скрыжаванне вуліц Пушкінскай і Маркса. У двухкіламетровай прагулцы ўдзельнічала каля 600 чалавек.

У цэнтры Магілёва 22 чэрвеня ўдзельнічала больш за 200 чалавек. Трапіць на плошчу Леніна ім не ўдалося. У выніку асноўная маса ўдзельнікаў акцыі, якіх было прыкметна больш, чым супрацоўнікаў міліцыі, сабралася ў скверы насупраць плошчы Леніна. Людзі сядзелі на лавах, стаялі, хадзілі, апладзіравалі машынам.

Усяго акцыі прайшлі больш чым у 40 гарадах краіны.

Усё ж такі сацыяльныя сеткі напужалі ўладу.

На сайце ГУУС Мінгарвыканкама 22 чэрвеня з'явілася папярэджанне, адрасаванае патэнцыйным удзельнікам «сацыяльных рэвалюцый», якія арганізуюцца праз інтэрнэт.

Ягоаўтары называюць «рэвалюцыі праз сацыяльныя сеткі» дурыкамі, якія «пачынаюць перарастаць з разраду дзіцячых нявінных свавольстваў у парушэнне беларускага заканадаўства з таго моманту, калі з віртуальнага свету яны перамясціліся ў свет рэальны».

У ГУУС адзначаюць, што з прававога пункту гледжання вынікі віртуальных заклікаў арганізатараў «сацыяльных рэвалюцый» — цалкам рэальнае, прамое парушэнне заканадаўства: «Арганізатары заклікаюць маўчаць ці мыкаць, тупаць ці пляскаць — для заканадаўства важны, у першую чаргу, сам факт арганізацыі падобных мерапрыемстваў».

Сталічная міліцыя папярэджвае, што беларускае заканадаўства арыентаванае на абарону законных правоў і інтарэсаў кожнага грамадзяніна, таму, калі паміж людзьмі ўзнікае канфлікт, закон абараняе таго, чые правы былі зняважаныя.

«Гэта ж тычыцца і грамадскіх адносін: калі ім прычынены ўрон, то закон проста АБАВЯЗАНЫ стаць на іх абарону, — падкрэсліваецца ў паведамленні ГУУС. — Такім жа прынцыпам кіруюцца і органы ўнутраных спраў, у чые непасрэдныя абавязкі ўваходзіць забеспячэнне ў краіне правапарадку і законнасці. І калі нечыя дзеянні скіраваны на парушэнне закона, то прамым абавязкам праваахоўных органаў з'яўляецца супрацьдзеянне гэтым зламысным намерам».

Арганізатараў акцый у ГУУС называюць «правакатарамі», якія, «знаходзячыся за межамі нашай краіны, бударажаць моладзь і рознымі заклікамі правакуюць яе на масавае парушэнне заканадаўства».

«Урэшце правакатары ўжо ў адкрытую агучваюць сваю галоўную мэту — здзейсніць у Беларусі рэвалюцыю праз сацыяльныя сеткі, — адзначаецца ў паведамленні ГУУС. — Дарэмныя стараннi — не пройдзе гэты нумар. Але… Якой бы недарэчнай ні выглядала гэта мэта, хтосьці можа і ўсур'ёз «клюнуць» на яўна злачынныя намеры! А наступным яго крокам могуць стаць і канкрэтныя дзеянні, якія цягнуць не толькі адміністрацыйную, але і крымінальную адказнасць».

Акрамя таго, 22 чэрвеня, але ўжо на старонцы ГУУС у «Твітэры», з'явіліся 11 неафіцыйных парад прэс-сакратара мінскай міліцыі патэнцыяльным удзельнікам «плошчы» (стыль і арфаграфія захаваныя):

«1. Абавязкова (!) паведаміце бацькам куды ідзяце — каб яны ведалі, дзе вас шукаць у выпадку пападання ў міліцыю.

2. Абавязкова (!) вазьміце з сабой пашпарт — для паскарэння разгляду ў РУУС у выпадку вашага затрымання.

3. Алкагольнае ап'яненне — прыкмета, якая абцяжарвае віну, таму ні-ні перад «плошчэй».

4. Не бярыце з сабой незарэг. сімволікі, колюча-рэжучыя прадметы, якія могуць траўмаваць.

5. Не бярыце так усімі любімымі аб'ёмныя рукзакі — адразу прыцягнеце ўвагу СМ (супрацоўнікаў міліцыі) і яны праверацць іх.

6. Не лезьце з распытваннямі да СМ і не замінайце ім — яны пры выкананні, закон за гэта сурова карае.

7. Улічыце, што здымкі на мабільныя тэлефоны могуць стаць прычынай канфліктнай сітуацыі.

8. Не паддавайцеся правакацыям — вы для арганізатараў «мяса», яны будуць вас штурхаць да парушэння законаў.

9. У Еўропе разганяюць вадамётамі, кулямі і газам. У Мінску — высцяняюць. Не даводзьце сітуацыю да «еўрапейскай»…

10. Калі вы на «плошчы» — то вы праваапарушальнік, з усімі высновамі. Будзьце гатовыя да затрымання і штрафу паводле арт. 23.34 КоАП.

11. І апошняе. Калі адчуваеце пах «смажанага» — паведаміце мне ў твітэры ў DM ваша прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, месцазнаходжанне: раптам дапамагу чым».

Здаецца, і міліцыя стала на бок «правакатараў». Інакш чаму б такія падрабязныя інструкцыі, нават з абяцаннем «дапамагчы»?

Чакаем наступнай серады…

19 СНЕЖНЯ

# МАЦІ ЗА СЫНА…

Таццяна ШАПУЦЬКА

**19 чэрвеня споўнілася паўгады з дня брутульнага разгону вулічнай дэманстрацыі супраць фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.**



Photo.ByMedia.Net

З таго часу сваякі палітвязняў штодня праводзяць малітоўныя акцыі ля касцёла святых Сымона і Алены (Чырвонага касцёла) ў Мінску. 19 чэрвеня акцыя адбылася ў пашыраным фармаце і распачалася малітвай ля касцёла святога Язэпа. Пасля, апрануўшы бел-чырвона-белыя шалікі і трымаючы ў руках бел-чырвона-белыя парасоны, некалькі дзясяткаў чалавек прайшлі шэсцем па праспекце Незалежнасці да Чырвонага касцёла.

Там сваякі палітвязняў апранулі ланцужкі з замацаванымі партрэтамі зняволеных і, узяўшыся за рукі, заспявалі малітвы. У лічаныя секунды да ўдзельнікаў акцыі падбег намеснік кіраўніка мінскай міліцыі Ігар Яўсееў і ў грубай форме загадаў разысціся.

Прысутныя паклалі партрэты на прыступкі помніка архангелу Міхаілу, што знаходзіцца ля касцёла, аднак не сышлі.

Міліцыя і спецназаўцы, якіх выклікаў на дапамогу Яўсееў, удзельнікаў акцыі не кранaлі, але прыгразілі арыштаваць Людмілу Мірзаянаву, маці Фёдара Мірзаянава, якая адзіная не зняла з сябе партрэт сына. Жанчына была вымушаная шукаць паратунку ў касцёле, які пакінула праз чорны выхад у суправаджэнні бацькоў зняволенага маладафронтаўца Эдуарда Лобава і маці экс-кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава, Алы Саннікавай. Спецназаўцы не рызыкнулі арыштоўваць усю групу людзей, аднак яшчэ нейкі час знаходзіліся ў касцёле і сачылі за іншымі ўдзельнікамі акцыі. Тым не менш гэты інцыдэнт не перапыніў супольную малітву, якая традыцыйна скончылася спяваннем гімну «Магутны Божа» і воклічамі «Жыве Беларусь!».

Нагадаем, любы чалавек можа далучыцца да малітоўных акцый, якія адбываюцца штодня а 20 гадзіне ля Чырвонага касцёла ў Мінску.

ДАКЛАД

# БЕЗ ВЫЗВАЛЕННЯ — НІЯКІХ КРЭДЫТАЎ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Міжнароднай супольнасці варта пачаць пастаянны маніторынг сітуацыі ў Беларусі. А ўрадам, фінансавым інстытутам і бізнэсу «улічваць інфармацыю» з правамі чалавека ў Беларусі. Пра гэта заяўлена ў дакладзе аб сітуацыі ў краіне, прадстаўленым у АБСЕ.**

«Мы вітаем разгляд у АБСЕ першага афіцыйнага даклада аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі», — адзначыў у каментары Андрэй Юраў, кіраўнік Міжнароднай назіральнай місіі Камітэта міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

Даклад быў разгледжаны 16 чэрвеня на пасяджэнні Пастаяннай Рады АБСЕ ў Вене. «На падставе шматлікіх сведчанняў даклад апісвае сітуацыю, якая склалася ў Беларусі пасля драматычных падзей 19 снежня мінулага года», — падкрэсліла ў паведамленні Міжнародная назіральная місія. Паводле яе ацэнкі, ён аб'ектыўна адлюстроўвае крызісную сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі і дае рэкамендацыі для выпраўлення. У прыватнасці, па змяненні становішча са свабодай сходаў, асацыяцый і выказвання думак. А таксама па выкананні абавязацельстваў, узятых на сябе краінай у межах АБСЕ і ААН.

Як зазначыла Міжнародная назіральная місія, пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі па палітычных матывах былі затрыманыя і арыштаваныя сотні людзей. Улады ўжываюць жорсткі ціск на недзяржаўныя арганізацыі і СМІ. Міжнародныя назіральнікі і замежныя журналісты не маглі ўехаць у краіну ці неаднаразова высылаліся з яе. Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі імкліва пагаршаецца. На фоне эканамічнага крызісу і росту ў грамадстве незадаволенасці беларускія ўлады працягваюць «закручваць гайкі».

Пасля разгляду даклада, як паведамілі назіральнікі, на чарзе — план дзеянняў. Прадстаўнік Камітэта міжнароднага кантролю Юрый Джыбладзэ ў гэтай сувязі заявіў: «Зараз вельмі важна, каб асноўныя сілы ў міжнароднай супольнасці выпрацавалі агульны план дзеянняў па выхадзе з сістэмнага крызісу ў Беларусі. І ў яго аснове павінны быць не толькі эканамічныя рэформы, але і ў абавязковым парадку канкрэтныя патрабаванні па выкананні міжнародных абавязацельстваў у галіне правоў чалавека. Без вызвалення палітычных зняволеных і сістэмных, вымераных змяненняў у галіне правоў чалавека не павінны прымацца якія-небудзь рашэнні аб выдзатканні крэдытаў і праграм дапамогі. Інакш гэта толькі закансервуе вельмі неспрыяльную сітуацыю. Высновы і рэкамендацыі даклада АБСЕ з'яўляюцца выдатнай асновай для выпрацоўкі такога плана дзеянняў».

Дакумент падрыхтаваны дакладчыкам «Маскоўскага механізму», прафесарам Эмануэлем Дэка (Францыя). Ён правёў інтэрв'ю з экспертамі, удзельнікамі і відавочцамі падзей пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Дакладчык абапіраўся на сведчанні грамадзян, пацярпелых ад неправамерных дзеянняў міліцыі. На матэрыялы судовых пасяджэнняў над удзельнікамі акцыі пратэсту 19 снежня. А таксама на дакументы няўрадавых арганізацый і міжнародных структур.

Рашэнне пра ініцыяванне «Маскоўскага механізму» ў дачыненні да сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі было прынятае 14 краінамі АБСЕ 6 красавіка. Улады Беларусі адмовіліся супрацоўнічаць і прызначыць свайго садакладчыка. І не выдалі візу дакладчыку АБСЕ без тлумачэння прычын.

Нагадаем, што «Маскоўскі механізм» АБСЕ — кантрольная працэдура, аднагалосна прынятая АБСЕ ў 1991 годзе. Яна дазваляе фармаваць місію для ацэнкі сітуацыі ў адной з краін-удзельніц, якая дапускае сістэмныя парушэнні абавязацельстваў у галіне правоў чалавека. І прымаць рашэнні аб мерах рэагавання.

ПАБОРЫ

# АФІЦЫЙНЫ ЧЫНШ

Вольга ХВОІН

**У Заслаўі прадпрымальнікаў абавязалі рамантаваць дарогі, тратуары, будаваць агароджы за ўласны кошт. Не зважаючы на прыбыткі і тэрытарыяльнае размяшчэнне прадпрыемства.**

Юрыдычным асобам разаслалі ліст, у якім гаворыцца, што на падставе рашэння Мінскага райвыканкама ад 29.04.2011 года «Аб замацаванні за юрыдычнымі асобамі Заслаўя, што з'яўляюцца землеўласнікамі, вуліц для правядзення работ па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку» за кожным прадпрыемствам замацаваны пэўны ўчастак горада, дзе трэба пакласці асфальт, зрабіць ліўневыя сцёкі, паставіць плот. Тэрмін выканання гэтай працы пазначаны як 1 ліпеня 2011 года.

Адзін з дробных прадпрымальнікаў горада распавёў, што і раней аказваў дапамогу дзіцячаму садку, таму думаў, што і гэтым разам можна будзе абмежавацца выплатай «падачы» ў прымальным памеры. Але як пабачыў пастанову, то «затрэсліся рукі».

Адзін квадратны метр тратуарнай пліткі каштуе блізу двухсот долараў, а яму выдзелілі «пад шэфства» 250 метраў дарогі з прылеглымі тэрыторыямі. Паводле слоў бізнэсоўца, зрабіць праект, аплаціць работы, пакласці тратуары, паставіць платы, то хоць бы ў дзвесце тысяч долараў упісацца. Прычым гэта нават суседняя вуліца той, дзе месціцца фірма. Калі гэта не будзе зроблена, то ў выканкаме пагражаюць закрыць прадпрыемства. Прадпрымальнік звярнуўся да чыноўнікаў, каб яны паглядзелі яго грашовы штомесячны абарот, які складае 10–15 мільёнаў рублёў, і ўжо потым рабілі такія загады. Аднак на словы дробнага бізнэсоўца ўвагі не звярнулі.

У Заслаўі зарэгістраваныя, працуюць дзясяткі прадпрыемстваў, у іх ліку і буйныя — «Henkel» (выпуск бытавой хіміі), завод па выпуску аддзелачных і будаўнічых матэрыялаў «Ceresit».

ПРЭМІЯ

# ЗА СВАБОДУ ДУМКІ

Вольга ХВОІН

**На малой радзіме Васіля Быкава ў вёсцы Бычкі, што на Ушаччыне, была ўручаная чацвёртая па ліку прэмія імя пісьменніка «За свабоду думкі». Сёлета лаўрэатам прэміі стаў кандыдат у прэзідэнты на выбарах 2010 года, лідар грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!», паэт Уладзімір Някляеў.**



Паэт Уладзімір Някляеў

Лаўрэаты атрымліваюць узнагароду — бронзавую фігурку «За свабоду думкі» аўтарства скульптара Віктара Копача і дыплом. Новага пераможцу прэміі абіраюць лаўрэаты мінулых гадоў. Раней прэмію атрымалі літаратары Рыгор Барадулін, Уладзімір Арлоў, Павал Севярынец, мастак Алесь Пушкін, краязнаўца, арганізатар многіх культурніцкіх імпрэзаў Ада Райчонак. «Год, які прайшоў ад нашай леташняй сустрэчы тут, быў часам выпрабаванняў для ўсіх нас, для нашай краіны. І ў гэтых выпрабаваннях дух Быкава быў з намі. Ён і сёння з намі, калі ў чацвёрты раз уручаецца прэмія «За свабоду думкі», якая прысуджаецца за творчую і грамадскую дзейнасць на карысць свабоды», — выступіў з прамовай перад прысутнымі лаўрэат мінулых гадоў Уладзімір Арлоў.

Заснавальнік прэміі, кіраўнік руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч нагадаў пра неабходнасць у любой барацьбе не забывацца на нацыянальную ідэю. «Нам падаецца, што «каўбасны» пратэст можа ўсё вырашыць. Але калі не будзе ідэі, ідэалогіі, калі не будзем думаць пра нашы нацыянальныя інтарэсы, то і не будзе карыснага выніку», — падкрэсліў палітык.

Уладзімір Някляеў у сваёй прамове прыгадаў сваю апошнюю сустрэчу з Васілём Быкавым: «Не ўспамінаецца драбязы. От нічога не было дробязнага. Ад самага пачатку і да нашай апошняй сустрэчы ў шпіталі, за тры дні, як яго не стала. Я ішоў туды, не ведаючы, з чым прыйсці — гэта зноў жа адносіны з Быкавым. Гэтыя адносіны прымусілі мяне падумаць аб тым, а з чым я зараз прыйду да чалавека, які сам ведае, што яго хутка не стане. А ён ведаў, і прыехаў дахаты паміраць, што б там хто ні гаварыў. Што каштоўнае насамрэч у гэтым свеце? Усё становіцца на свае месцы на такіх вось «быкаўскіх» рубяжах. Гэта чалавек, які ўсё сваё жыццё прастаяў на рубяжах… — На сустрэчу Някляеў прыйшоў з суніцамі і белай ружай. Гэта тое, што звязвала пісьменнікаў пэўнымі ўспамінамі. — Ніякавата таптаўся перад тым, як увайсці ў палату, зноў жа — што сказаць? З жахам думаў, як я вярнуўся з Хельсінкі, з Фінляндыі, дзе жыў у кватэрцы, якую да мяне паўтара гады займаў Васіль Быкаў. Павітаўся, аддаў яму сунічкі, Ірына Міхайлаўна забрала ружу. І ён, надкусваючы сунічку, у яго пацякла кроў з вуснаў, сказаў: «Я вось падумаў, а што ў жыцці трэба чалавеку? Само жыццё, адна жанчына, і адна кветка... Ён не патрабаваў ад жыцця шмат, у тым сэнсе, як гэтага патрабуе большасць людзей, — грошай, лепшай ежы, лепшай адзежы. Ён патрабаваў таго, чаго патрабуе толькі высокі духам чалавек, — сапраўднага напаўнення жыццём».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НАС «ЖЭСТАЧАЙШЭ НАГІНАЮЦЬ»

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Як не дзіўна, але супрацьстаянне Беларусі і Расіі ўступіла ў новую фазу. Гэта адразу і не бачна. Але калі ўглядзецца ў працэсы — відавочна. Нас «жэстачайшэ нагінаюць».**




Шмат што казаў Аляксандр Рыгоравіч. «У зямлянкі пойдзем, але не схілімся». «Ніхто нас на калені не паставіць». Але спрабуюць ставіць і будуць працягваць гэта рабіць. І вінаватыя ў гэтым мы самі.

З вялікай ласкі ААТ «Інтэр РАО ЕЭС» вырашыла адтэрмінаваць да 27 чэрвеня спыненне паставак электраэнергіі ў Беларусь. Раней кампанія планавала іх перапыніць 22 чэрвеня па прычыне запазычанасці канцэрна «Белэнерга».

«Толькі што прайшлі перамовы, кансультацыі з нашымі беларускімі партнёрамі, прынятае рашэнне да панядзелка адтэрмінаваць адключэнне паставак электраэнергіі ў Беларусь», — прыводзіць РІА «Новости» словы прадстаўніка кампаніі.

Кампанія «Інтэр РАО ЕЭС» 9 чэрвеня абмежавала пастаўкі электраэнергіі ў Беларусь у сувязі з запазычанасцю (1,5 мільярда расійскіх рублёў), што ўзнікла з-за праблемы з купляй валюты на беларускім рынку. Па выніках двухбаковых перамоў былі падпісаны графік плацяжоў, згодна з якім беларускі бок абавязваецца пагасіць запазычанасць за расійскую электраэнергію да 5 ліпеня.

13 чэрвеня кампанія цалкам аднавіла аб'ёмы паставак электраэнергіі ў Беларусь, а ўжо 15 чэрвеня канцэрн «Белэнерга» ажыццявіў першы транш у рамках пагашэння запазычанасці перад «Інтэр РАО ЕЭС» за пастаўленую электраэнергію.

Між тым ужо 17 чэрвеня кіраўнік расійскай кампаніі Барыс Кавальчук у кулуарах Пецярбургскага эканамічнага форуму заявіў, што ў выпадку пратэрміноўкі плацяжоў пастаўкі электраэнергіі ў Беларусь могуць спыніцца цалкам. Ён нагадаў, што «Інтэр РАО ЕЭС» некалькі разоў пераносіла тэрміны пагашэння запазычанасці за пастаўленую ў Беларусь электраэнергію.

Ці не капец нам прыйшоў? Калі мы нават за электраэнергію не можам разлічыцца? У такім выпадку беларускія ЖРЭА, ЖКХ і іншыя пададуць у суд. І высяляюць «злосных неплацельшчыкаў» з іхніх кватэраў, апісваюць маёмасць у кошт пагашэння запазычанасці. А што зараз рабіць «сінявокай»? Апісваць маёмасць?

Дзяржава пакуль супрацьіцца. Кіраўнік дзяржкарпарацыі «Растэхналогіі» Сяргей Чэмезаў заявіў, што перамовы паміж расійскім КАМАЗам і беларускім МАЗам аб магчымым аб'яднанні актываў не прасоўваюцца з палітычных прычынаў. «Мы вялі перамовы з Мінскам, але пакуль не прасунуліся: тут, па ўсёй бачнасці, уплывае чыста палітычная сітуацыя», — заявіў Чэмезаў.

«Пакуль ні пра што не можам дамовіцца», — дадаў Чэмезаў. Разам з тым ён адзначыў, што ў выпадку, калі МАЗ будзе гатовы да супрацоўніцтва з КАМАЗам, то перамовы працягнуцца.

Афіцыйны Мінск тармозіць, як можа. Валюты ў краіне няма. Чым мы будзем разлічвацца за электрычнасць, за МАЗ і гэтак далей?

Кіраўнік «Растэхналогіі» Сяргей Чэмезаў заявіў, што перамовы паміж расійскім КАМАЗам і беларускім МАЗам аб аб'яднанні не прасоўваюцца з палітычных прычынаў ААН

Вядома чым. Мы ўжо часткова прадалі «Беларуськалій». Як паведамляецца, «Беларуськалій» атрымаў ад продажу свайго пакета акцый у ЗАТ «Міжнародная калійная кампанія» (МКК) 282,22 мільёна расійскіх рублёў. Гэта афіцыйная інфармацыя. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні беларускага акцыянернага таварыства.

Раней беларускія ўлады неаднаразова заяўлялі, што «Беларуськалій» плануе выйсці са складу акцыянераў МКК. На іх думку, са стварэннем «Беларускай калійнай кампаніі» ў прадпрыемства адпала патрэба ў трэйдэрскіх паслугах МКК, а такім чынам, і ў тым, каб валодаць уласнасцю ў гэтай кампаніі.

Ну навошта «Беларуськалію» прадаваць свае актывы? Нават калі МКК не патрэбная, гэта ўсё ж такі грошы. А калі яны прадалі сваю долю — гэта азначае, што «Беларуськалію» гэтыя грошы патрэбныя. Азначае, што «Беларуськалій» знаходзіцца ў крытычным становішчы з-за недахопу валюты. Таму і быў вымушаны прадаць сваю долю.

А тым часам у Беларусі нарастае пратэст. Не ўтаймоўваецца Някляеў. На тыдні адбудзецца з'езд рэспубліканскага даследча-асветнага грамадскага аб'яднання «Гавары праўду!». Аб'яднанне будзе займацца тым жа, чым займалася аднайменная кампанія. Устаноўчы з'езд аб'яднання адбудзецца ў Мінску 18 чэрвеня. Гэта ўжо другая спроба легалізацыі кампаніі «Гавары праўду!». Першая, зробленая ў лістападзе мінулага года, была беспаспяховай — Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі.

У працы з'езда ўдзельнічалі 56 дэлегатаў з Мінска і абласцей Беларусі. Кіраўніком арганізацыі аднагалосна быў абраны Някляеў.

«Асноўны кірунак нашай працы — гэта сацыяльныя праблемы, — паведаміў ён. — Мы як былі разам з людзьмі, так і будзем разам з імі, дапамагаючы ім вырашаць канкрэтныя праблемы. Праз гэта, праз размову з людзьмі, праблемы, якія хвалююць іх штодзённа, мы будзем выходзіць на больш агульныя пытанні, пытанні нашага грамадскапалітычнага жыцця».

Страта стагоддзя. Калегія гаспадарчага суда Мінска 21 чэрвеня адмовіла ў задавальненні касацыйнай скаргі Партыі БНФ на рашэнне па іску ЖРЭА аб высяленні партыі з офіса. Такім чынам, рашэнне суда аб высяленні набыло моц, і цяпер ад партыі на законных падставах могуць патрабаваць вызваліць офіс.

Старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч на пасяджэнні калегіі заявіў, што лічыць законным знаходжанне партыі ў офісе, які арандуюць у ЖРЭА. Ён выказаў жаданне абмеркаваць новыя ўмовы арэнды офіса, у тым ліку пра павышэнне яе кошту, аднак прадстаўнік ЖРЭА ад перамоў адмовілася.

Нагадаем, гаспадарчы суд Мінска 10 мая прыняў рашэнне выселіць Партыю БНФ, грамадскае аб'яднанне «БНФ «Адраджэнне», а таксама іх мінскія гарадскія і абласныя структуры са сталічнага офіса па праспекце Машэрава, 8. Гэта памяшканне арандавалася арганізацыямі з 1992 года. Тэрмін арэнды скончыўся 31 сакавіка 2011 года.

Памяшканне офіса БНФ з'яўляецца не толькі офісам, але і месцам, дзе праводзяцца шматлікія мастацкія акцыі: выставы карцін, прэзентацыі фільмаў, музычных дыскаў, уручэнне грамадскіх узнагарод у галіне культуры і мастацтва і г.д. Заразмы пазбаўляемся вялікай культурніцкай пляцоўкі, што прыкра.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ЛЕАНІД КОЗІК



Кіраўнік Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі станоўча ацаніў Антыкрызісную праграму Аб'яднанай грамадзянскай партыі, паведамляе партыйны інтэрнэт-сайт. Галоўны прафсаюзнік мяркуе, што ў праграме прапанаваныя магчымыя інструменты і шляхі выхаду з цяперашняй эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы, і многія яе палажэнні знойдуць адлюстраванне ў пытаннях збалансаванага развіцця эканомікі краіны.

«Дзякуем вам за прадстаўленую магчымасць азнаёміцца з Антыкрызіснай праграмай для Беларусі, якая носіць, на нашу думку, шматпланавы характар прапанаваных мераў і акрэслівае магчымыя інструменты і шляхі выхаду з наяўнай эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы, — гаворыцца ў лісце, які прыйшоў у офіс АГП, за подпісам старшыні ФПБ Леаніда Козіка. — Мяркуем, што многія палажэнні праграмы ў будучыні знойдуць сваё адлюстраванне ў пытаннях збалансаванага развіцця эканомікі краіны».

Намеснік старшыні АГП Леў Марголін лічыць такі адказ пазітыўным момантам. «Федэрацыя прафсаюзаў, у адрозненне ад урада і Адміністрацыі прэзідэнта, даволі аператыўна адрэагавала на Антыкрызісную праграму і, мяркуючы па ўсім, там яе нават прачыталі, — адзначыў Леў Марголін. — З асноўнымі палажэннямі, выкладзенымі ў праграме, сапраўды вельмі складана спрачацца, таму яны і не спрачаюцца. Іншая справа — ім працсей, таму што не ім выконваць гэтую праграму і пераконваць Лукашэнку ў тым, што трэба зрабіць так, а не інакш. Таму яны, нічога не страчваючы, могуць даваць цалкам высокую ацэнку Антыкрызіснай праграме. Але гэта ўжо сам па сабе факт. Раней такога не было».

### ЮРЫЙ АЛЫМАЎ



Аляксандр Лукашэнка 20 чэрвеня падпісаў указ аб прызначэнні Юрыя Алымава выконваючым абавязкі старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі. Старшыня Нацбанку Пётр Пракаповіч будзе праходзіць рэабілітацыю пасля аперацыі на сэрцы, якую яму зрабілі ў красавіку. Нагадаем, на бальнічным кіраўнік Нацбанку быў больш за паўтара месяцы. На працу ён выйшаў акурат перад маштабнай дэвальвацыяй беларускага рубля — 23 мая.

Юрый Алымаў з верасня 2001 года да гэтага часу працаваў першым намеснікам старшыні праўлення гэтага ведамства. Юры Алымаў нарадзіўся ў Кыргызстане ў 1957 годзе. Скончыў Ленінградскі фінансава-эканамічны інстытут ім. М. А. Вазнясенскага, Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, магістратуру Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. У 1985–1986 гадах быў старшым эканамістам Светлагорскага гарадскога фінансавага аддзела, 1986–1989 гадах — загадчыкам ашчаднай касай Светлагорскага раёна, 1989–1993 — намеснікам старшыні Светлагорскага гарвыканкама, 1993–1997 — намеснікам начальніка Гомельскага абласнога ўпраўлення ААБ «Беларусбанк», 1997–1998 — намеснікам старшыні праўлення ААБ «Беларусбанк», 1998–2001 — намеснікам старшыні праўлення Нацбанка Беларусі.

### СЯРГЕЙ МАРТЫНАЎ

Беларус Сяргей Мартынаў, бронзавы прызёр Алімпіяды–2000 у кулявой стральбе, стаў пераможцам чацвёртага этапу Кубка свету ў стральбе з малакаліберный вінтоўкі з дыстанцыі 50 метраў з пазіцыі лежачы. Турнір праходзіць у Мюнхене. Сяргей Мартынаў выбіў суму 703,3 бала, на 1,9 бала апярэдзіўшы датчаніна Кенета Нільсена, які заняў другое месца (701,4). Бронзавым прызёрам стаў Даніэль Брадмейер з Германіі (701,2). У папярэдніх спаборніцтвах Сяргей не зрабіў ніводнага промаху, паўтарыўшы сусветны рэкорд.

З іншых вынікаў беларускіх спартсменаў — 9-е месца Андрэя Казака ў стральбе з малакаліберная пісталета з дыстанцыі 50 метраў (561 бал). Гэты вынік дазволіў яму завяваць ліцэнзію на Алімпійскія гульні–2012 у Лондане. Вікторыя Чайка заняла 10-е месца ў стральбе з малакаліберная пісталета з дыстанцыі 25 метраў (581 бал), Віталь Бубновіч стаў 13-м у стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі з 10 метраў (596 балаў).

Этап Кубка свету па кулявой стральбе завяршыўся 22 чэрвеня.



▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПАМІЖ НЯСТАЧАЙ І ПРЫБЫТКАМ

Сяргей НІКАЛЮК

**Калі стан эканамічнага дыскамфорту не здолее сам рассмактацца, то шматлікія беларусы перагледзяць сваё стаўленне да «моцнай дзяржавы».**



Беларусы — гэта тыя ж рускія, толькі са знакам якасці. Такая афіцыйная версія. Яна ўзнікла 22 чэрвеня 2003 года і памерла 27 мая 2011-га на нарадзе, прысвечанай актуальным пытанням эканомікі, на якой «адзіны палітык» (АП) праінфармаваў, што беларусаў у свеце *«воспринимают вообще как дикарей»*.

Што стала прычынай такога ўспрымання? *«Ажиотаж на потребительском рынке»*, дакладней, карцінкі гэтага ажыятажу, змантаваныя замежнымі тэлекампаніямі, *«которые здесь (у Беларусі) благодаря Администрации президента стали господствующими средствами массовой информации»*.

АП, паводле яго ўласнага прызнання, *«впервые стало стыдно за часть людей, которые породили этот большой спрос»*. Нагадаю, такія няўхвальныя для беларускага народа характарыстыкі былі агучаны на нарадзе, прысвечанай актуальным пытанням эканомікі. Пералік актуальных пытанняў і ўзначаліў «ажыятажны попыт». Прычына яго засталася да канца так і не зразумелая ўдзельнікамі нарады. Мяркуйце самі: ВУП з пачатку года расце рэкорднымі тэмпамі (азіяцкія «тыгры» адпачываюць), па выніках чатырох месяцаў зафіксаваны істотны прырост паступлення валютнай выручкі (12,8 мільярда долараў, што ў 1,6 разы больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года).

Адзінае тлумачэнне гэткай парадаксальнай сітуацыі было агучана ўсё тым жа АП: *«И правильно народ говорит: сами виноваты, что создали этот ажиотаж»*. Ну што тут скажаш, прырода ажыятажнага попыту схоплена дакладна. Мне застаецца толькі развесці густа замешаны афіцыйны сіроп праўды азбукавымі каментарамі.

## Як паскорыць набліжэнне цягніка?

Цэнтральным паняццем класічнай эканамічнай тэорыі з'яўляецца «чалавек эканамічны». Ён рацыянальны і выразна ўсведамляе свае прыватныя інтарэсы. «Чалавек эканамічны» не марнуе часу на распрацоўку неажыццявімых праектаў, як гогалеўскі Манілаў, а прымае рашэнні, зыходзячы з балансу будучых прыбыткаў і страт. Словам, усё выдатна, калі б не адно «але»: у жывой прыродзе сустрэць такога чалавека ўсё няк не атрымліваецца.

Для далейшага руху нам спатрэбіцца кніга нобелеўскага лаўрэата Джорджа Акерлофа «Spiritus Animalis», напісаная ў суаўтарстве з эканамістам Робертам Шылерам. У кніге ёсць падзагаловак: «Як чалавечая псіхалогія кіруе эканомікай». Спасылаючыся на аўтарытэт Кейнса, аўтары пераканаўча паказваюць, што, нават пераследуючы свае эканамічныя інтарэсы, людзі не заўсёды рацыянальныя. Гэты самы ірацыянальны пачатак і з'яўляецца галоўнай прычынай ваганняў на рынку.

Ключавая ўмова эканамічнай стабільнасці — давер. Па-англійску «давер» — «confidence». Слова паходзіць ад лацінскага «fido», што азначае «я давяраю». Крызіс даверу, у якім сёння апынуўся свет, называюць яшчэ крэдытным крызісам, а слова «крэдыт» паходзіць ад лацінскага «credo» — «я веру».

У спрыяльныя часы людзі поўныя веры, яны прымаюць рашэнні не разважаючы. Інстынкт падказвае ім, што наперадзе поспех, таму ўсялякім сумневам у сабе яны не даюць ходу. Пакуль у людзей захоўваецца такі давер, неабдуманасць іх рашэнняў застаецца непрыкметнай. Няцяжка здагадацца, што адбываецца, калі давер па якіх-небудзь прычынах знікае. Банкі пачынаюць прытрымліваць грошы, таму што губляюць веру ў магчымасць сваіх кліентаў вярнуць крэдыты. Бізнэсмэны, нягледзячы на нізкія працэнтныя стаўкі, не жадаюць укладваць сродкі ў новыя праекты. Яны не вераць у магчымасць рэалізаваць дадатковую прадукцыю. Большасць эканамічных крызісаў, уключаючы Вялікую дэпрэсію 30-х гадоў, развіваліся па падобным сцэнары.

Страта даверу спарадзіла і спажывецкі ажыятаж у Беларусі. Людзі перасталі верыць у пакупную здольнасць нацыянальнай валюты. Але хто ў гэтым вінаваты, і што тут прычына, а што следства? У кнізе экс-дырэктара дэпартамента МВФ Рагхурам Раджана «Выратаванне капіталізму ад капіталістаў» ёсць выдатны прыклад пра цягнік і птушак: «Птушкі ўлятаюць з чыгуначных пуцей, калі набліжаецца цягнік. Птушкі, што ўлятаюць, і цягнік, што набліжаецца, — падзеі, якія карэлююцца, але першая не цягне за сабой апошнюю. Калі мы не вызначым накірунак прычынна-следчай сувязі, карэляцыя, якую мы назіраем, можа даць дзіўныя ідэі. Каб паскорыць прыбыццё цягніка, які спазняецца, угневаныя пасажыры павінны спалохаць птушак, што сядзяць на рэйках!»

Прыкладна гэтым і занятыя сёння ў Беларусі тыя, ад каго залежыць давер насельніцтва да нацыянальнай валюты. Што тычыцца ірацыянальных грамадзян, то ў існуючай сітуацыі яны паводзяць сябе выключна рацыянальна, калі скупляюць у крамах тавары, тым самым спрабуючы абараніць ад інфляцыі свае крэўныя. Але давер да рубля — гэта ўсяго толькі праекцыя даверу да ўлады, да яе прадстаўнікоў, якія шматразова пераносяць дату выхаду на «раўнаважны курс».

## Ад 600 тысяч да 1 мільёна

«Утылітарызм» (ад лац. «utilitas» — «карысць», «выгада») — наступнае слоўнікавае слова, якое нам спатрэбіцца для аналізу бягучых падзей. Звузім яго значэнні да практыцызму, імкнення з усяго здабываць матэрыяльную выгаду. Спецыялісты вылучаюць умераны і развіты ўтылітарызм. Першы характарызуецца імкненнем павялічыць атрыманне выгод шляхам іх ураўняльнага пераразмеркавання (крадзяжоў, жабрацтва, сацыяльнага ўтрымanства і г. д.). Другому ўласцівае ўсведамленне сувязі паміж ростам выгод і ўласнай дзейнасцю па іх вытворчасці. Ён патрабуе развіцця асобы, без якой немагчымае функцыянаванне сучаснай рынкавай эканомікі.

Утылітарызм дазваляе нам па-новаму зірнуць на прыроду расколу беларускага грамадства. Умераныя ўтылітарысты — гэта наша «большасць». Гэта яны прастаялі ўвесь мінулы год у напружаных позах суслікаў у чаканні зарплаты ў 500 долараў. «Свае» долары яны атрымалі, але, як выявілася, ненадоўга. Сёння яны ў разгубленасці, бо не ў стане да канца ўсвядоміць тое, што адбылося.

Беларусы, якія актыўна асвойваюць каштоўнасці развітога ўтылітарызму (прадстаўнікі «меншасці»), гэтак жа, як мічурынцы, не чакаюць літасці ад прыроды. Калі яны не здолелі адшукаць нішу, у якой яны змаглі б за сваю працу атрымаць годную ўзнагароду ў роднай дзяржаве, то яны збіраюць валізкі і адпраўляюцца за «доўгім» рублём у Расію, а найбольш прасунутыя — на Захад за «доўгім» еўра ці доларам.

Гэта яны і чальцы іх сем'яў забяспечвалі камерцыйным банкам чыстую пакупку валюты, тым самым робячы свой пасільны ўнёсак у барацьбу з галоўным ворагам «беларускай эканамічнай мадэлі» — адмоўным сальда знешняга гандлю. Гэта ў іх адрас днямі рашуча выказаўся АП: *«…мы должны этим «летунам» сказать: ты поехал неорганизованно зарабатывать в другое государство и в страну денег не приносишь. Поезжай. Но, первое: коммунальные услуги стопроцентно семья оплачивает. Медицинское обеспечение твое личное, а семью, детей мы не трогаем, стопроцентно оплачиваешь»*.




Колькі такіх «летуноў» вымушаныя «неорганизованно зарабатывать» за межамі Радзімы? Ацэнкі экспертаў вагаюцца ў межах ад 600 тысяч да 1 мільёна чалавек. З трыма «летунамі» (яны працуюць вахтавым метадам на будоўлях Якуціі) я меў нядаўна магчымасць пагутарыць у аўтобусе на маршруце Мінск–Мазыр. Шкадую, што не прыхапіў з сабой магнітафон. Калі яшчэ ў мяне з'явіцца магчымасць з першых рук атрымаць інфармацыю пра асаблівасці будаўніча-мантажных работ пры -60°!

## Аб праблемах кармавой базы

Прадстаўнікі ўмеранага ўтылітарызму, кажучы словамі персанажа фільма «Чапаеў», «юшкі просяць», прычым кожны дзень і ва ўсё большых аб'ёмах. Але эканоміка, заснаваная на працы ўмераных утылітарыстаў, не ў стане забяспечыць пашыранае ўзнаўленне юшкі без прыцягнення дадатковых рэсурсаў. «Прыбыткак» — паняцце са свету развітых утылітарыстаў. Адсюль праблема, вырашыць якую ўжо не першы год беспаспяхова спрабуе АП. Прывяду фрагмент з афіцыйнага прэс-рэлізу нарады, якая прайшла 27 мая: *«Глава государства напомнил, что давно обращал внимание на рентабельность работы предприятий и прибыль. «А потом уже: сколько вы надоили, привесили и посеяли? Неужели вы этого не слышите?! Так вот, если говорить об эффективности — плакать хочется»*, — сказал президент».

А што яму застаецца рабіць? Беларусы, здольныя эфектыўна працаваць і пры -60°, бываюць у роднай рэспубліцы толькі наездамі. Клімат Якуціі ім чамусьці больш падабаецца.

Выдатны партрэт умеранага ўтылітарыста намаляваў палітолаг Сяргей Вараб'ёў. Ацаніце: «З функцыянальнага пункту гледжання вы зразумееце, што робіць чалавек. Замест таго, каб займацца вытворчасцю, барацьбой з канкурэнтамі, абслугоўваннем спажыўцоў, ён бегае вакол дзяржавы: або з яе карміцца, або крадзе, або ад яе абараняецца і г.д. Ён заняты. Якая сусветная канкурэнцыя, які кліент? Пра што вы?» Вось з такім чалавечым матэрыялам і вымушаны працаваць АП.

Эканамічныя праблемы, якія «нечакана» абрынуліся на ўмераных утылітарыстаў у 2011 годзе, пазбаўляюць іх кармавой базы, спараджаючы тым самым стан дыскамфорту. Калі такі стан у сярэднетэрміновай перспектыве не рассмокчацца, то нашы персанажы могуць перагледзець сваё стаўленне да «моцнай дзяржавы». Урэшце, людзі жывуць не ў вакууме, сур'ёзных праблем з атрыманнем альтэрнатыўнай інфармацыі ў Беларусі няма. Было б жаданне. Мяркуючы па сакавіцкім апытанні НІСЭПД, такое жаданне ў прадстаўнікоў «большасці» пачынае фармавацца, таму і зменшыўся рэйтынг даверу да дзяржаўных СМІ за тры месяцы, што прайшлі пасля прэзідэнцкіх выбараў, на 9,5 працэнтных пункты, саступіўшы ў выніку рэйтынгу недзяржаўных СМІ: 43,4% vs. 45,5%.

На фоне такой дынамікі асобныя прадстаўнікі апазіцыйных партый пачынаюць гаварыць пра магчымасць хуткага выйсця з «апазіцыйнага гета ў 25–30%». У прынцыпе гэта магчыма. Толькі не варта забываць, што ўмераныя ўтылітарысты калі і здольныя падтрымаць дэмакратаў, то не дзеля дэмакратыі, а дзеля пашырэння кармавой базы.

РЭЙТЫНГ

# ЯНЫ ЗАЙЗДРОСЦЯЦЬ БЕЛАРУСІ

Андрэй РАСІНСКІ

**Яшчэ ў сакавіку, калі эканамічны крызіс у Беларусі толькі набіраў абароты, Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця размеркавала краіны паводле крэдытнай рызыкі. Беларусь атрымала ў гэтым спісе найбольшую колькасць штрафных балаў — 7, што азначала: яе эканамічныя справы дрэнныя. Сёння гэта ўжо навідавоку.**

Але значна больш паказальна, якія краіны сталі каляжанкамі Беларусі па няшчасці. Сяброўкі Беларусі па рэйтынгу: Бурундзі, Буркіна-Фасо, Цэнтральна-Афрыканская Рэспубліка, Конга, Чад, Кот’д’Івуар, Эквадор, Эрытрэя, Куба, Афганістан, Эфіопія, Гамбія, Гвінея-Бісаў, Гаіці, Ірак, Лаос, Лівія (што не дзіўна), М’янма, Мальдзівы, Непал, Нікарагуа, Нігер, Пакістан, Руанда, Сьера-Леонэ, Ліберыя, Ліван, Самалі, Сірыя, Судан, Тога, Венесуэла, Зімбабве.

Кампанія ганаровая і шаноўная, пераважна краіны трэцяга свету. Лівія і Сірыя ўляцелі ў спіс яшчэ да асноўных грамадскіх забурэнняў, рэзка павысіўшы свае штрафныя паказчыкі. Гэта краіны, з якімі Беларусь у цёплых і прыязных стасунках. Венесуэла і Куба, якія з Беларуссю — стратэгічныя партнёры, таксама не радуюць эканамічнай стабільнасцю. З Зімбабве — чэмпіёнам па інфляцыі — Беларусь зусім нядаўна абмянялася пацалункамі. У Ірана сітуацыя лепшая: усяго 6 штрафных балаў, але фінансавая рызыка ўсё роўна вялікая.

Высокая сямібальная рызыка і ў калегаў па СНД: Кыргызстана, Таджыкістана, Украіны, Малдовы. Затое ў Расіі, якую Беларусь абвінавачвае ў ганебным капіталізме, нізкі ўзровень рызыкі — усяго тры балы. Заходнія беларускія суседзі, якія, калі верыць тэлевізійнай прапагандзе, не вылазяць з суцэльных крызісаў, пачуваюцца даволі ўпэўнена.

У Літвы чатыры пункты рызыкі, у Польшчы — два, у Эстоніі — нуль. Нават у Грэцыі і Партугаліі, якія сёння зазналі цяжкасці, рызыкі экспартных крэдытаў — нулявыя.

Беларусь, якая крэдытаў панабірала, і невядома, як будзе вяртаць іх, не мае прыязных заможных сяброў. Сярод заможных — краіны з нулявым узроўнем рызыкі: Бельгія, Аўстрыя, Фінляндыя, Канада, Чэхія, Данія, Ізраіль, Вугоршчына, Японія, Карэя, Люксембург, Мальта, Аўстралія, Новая Зеландыя, Сінгапур, Нарвегія, Германія, Вялікабрытанія, Францыя і Злучаныя Штаты. Многія з гэтых краінаў неаднойчы выкрываліся ў “двайных стандартах”, варожасці і падрыўных аперацыях супраць Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы калісьці нам абяцаў: “Я Беларусь за цывілізаваным светам не павяду”.

Цяпер мы прыйшлі.

У кампаніі з Кубай, Венесуэлай, Зімбабвэ ды Паўночнай Карэяй на даляглядзе. Астатнія «зайздросцяць моцнай і працвітаючай Беларусі».

З НАГОДЫ

# АЎТАРЫНАК ЧАКАЕ КОМА

Вольга ХВОІН

**З 1 ліпеня ў Беларусі будуць дзейнічаць адзіныя для Мытнага саюза стаўкі мытных пошлін і падаткаў на ўвоз аўтамабіляў фізічнымі асобамі. Аналітыкі прагназуюць заміранне аўтамабільнага рынку, а таксама яго пераарыентацыю на Расію.**




Краіны Мытнага саюза падпісалі ў 2010 годзе пагадненне аб парадку перамяшчэння фізічнымі асобамі тавараў для асабістага карыстання праз мяжу Мытнага саюза. Гэты дакумент, у прыватнасці, вызначае стаўкі мытных пошлін на транспартныя сродкі. За аснову такіх пошлін і ставак былі прыняты расійскія стаўкі. Яны ў разы большыя за стаўкі, якія пакуль яшчэ дзейнічаюць у Беларусі.

Эканаміст Сяргей Чалы гаворыць, што ў цэлым для дзяржавы Мытны саюз — інструмент зручны, але для грамадзянаў — не, бо ў выніку менавіта яны і аплачваюць яго выдаткі са сваіх кішэняў. «Увядзенне мытных пошлін на патрыманыя аўтамабілі для фізічных асобаў — гэта тыя выдаткі, што плаціць насельніцтва за наша знаходжанне ў Мытным саюзе. Выгады ад яго атрымлівае беларускі бюджэт, дзяржава. Найперш за спрыяльны рэжым гандлю энергетычнымі таварамі, у дадзеным выпадку нафтай, на якую няма экспартнай пошліны. Ну і, магчыма, за кошт таго, што ёсць механізм міжбюджэтнага размеркавання мытных пошлін на любыя тавары, што будуць увозіцца на тэрыторыю Мытнага саюза, і нашая доля больш высокая, чым мы заслугоўваем. Атрымліваецца, што ў цэлым для дзяржавы гэты праект выгодны, але ёсць моцнае раздзяленне на тых, хто атрымлівае выгоды — гэта бюджэт краіны, і тых, хто нясе асноўныя выдаткі — грамадзяне», — зазначае эксперт.

За першыя шэсць месяцаў гэтага года, паводле ацэнак Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі, колькасць увезеных з-за мяжы аўтамабіляў складзе прыкладна 200 тысяч на агульную суму каля 1,5 мільярда долараў. Грамадзяне краіны актыўна мяняюць машыны на больш новыя. Многія на абнаўленне ўласнага аўтапарку патрацілі істотную частку сваіх зберажэнняў, тым самым не пакінуўшы «падушкі бяспекі» на перыяд эканамічнага крызісу, які цяпер мае месца ў краіне.

Аднак пасля 1 ліпеня эксперты чакаюць замарожвання аўтамабільнага рынку: хто меў пільную патрэбу набыць машыну, той гэта, хутчэй за ўсё, ужо зрабіў, множнасць валютнага курсу і падзенне ўзроўню дабрабыту таксама не спрыяюць буйным пакупкам прадметаў раскошы, чым цяпер будзе аўтамабіль.

Маркетолаг і аналітык у галіне аўтамабільнага бізнэсу Аляксей Бабайцаў гаворыць, што цягам бліжэйшых месяцаў аўтадылеры будуць скупляць патрыманыя не надта старыя машыны ў беларускіх уладальнікаў і перапрадаваць іх у Расіі. «Яны ацэньваюць гэты від бізнэсу як магчымасць перажыць крызіс. Адначасова свежыя іншамаркі, што ўвозіліся ў 2008–2009 годзе ў Беларусь, будуць перакупляцца і вывозіцца ў Расію, дзе ёсць попыт, і гэтыя попыт расце», — зазначае эксперт.

Расія ўжо не першы год вядзе перамовы аб уступленні ў сусветную гандлёвую арганізацыю, у такім разе мытныя пошліны мусяць быць перагледжаны. Аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Дзяніс Мельянцоў мяркуе, што ўступленне Расіі ў СГА — гэта толькі размовы. «Расіі Сусветная гандлёвая арганізацыя не патрэбная ўвогуле. Яна добра пачуваецца і без яе. Асноўная прычына — пры ўступленні ў СГА трэба будзе лібералізаваць нафтавы і газавы рынак. А для Расіі гэта, так бы мовіць, смерці падобнае. Таму і стварае Расія свае мытныя саюзы, каб ахоўваць свой рынак, гэта пратэкцыяніцкія саюзы», — падкрэслівае эксперт.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ХВОСТ ПАЦУКА — ВЕЛІЧЫНЯ ПАСТАЯННАЯ



**Улады ліхаманкава шукаюць грошы. Тых 800 мільёнаў, што выдалі са стабілізацыйнага фонду ЕўраЗЭС, хопіць толькі на тое, каб не дапусціць далейшага абвастрэння сітуацыі да пачатку восені.**

Безумоўна, багатыя людзі, краіны і ўстановы на свеце ёсць. Яны любяць даводзіць бедным, як трэба жыць і працаваць, каб разбагацець. Асабліва калі даюць каму з бедных якую пазыку. Тут нават умовы ставяць — рабіць тое і тое, каб пазыку вярнуць, ды яшчэ і зарабіць на ёй добрыя грошы. Прыкладам, Расія кажа, што трэба зрабіць прыватызацыю беларускай маёмасці, адкрыць у краіну шлях для буйнога замежнага капіталу, даць магчымасць для развіцця свайго дробнага бізнэсу.

Цікава, што патрабаванні Міжнароднага валютнага фонду ў цэлым супадаюць з расійскімі парадамі, але выглядаюць больш падрабязнымі. Калі паслухацца дарадцаў з МВФ, то давядзецца абвяшчаць пра канчатковы пераход Беларусі да класічнага капіталізму, які на самай справе і ёсць натуральнай рынкавай эканомікай. У арганізацыйным плане гэта азначае фактычную ліквідацыю (у параўнанні з сённяшняй практыкай) усялякага ўмяшання дзяржавы ў эканоміку.

Па маштабах — гэта амаль што злом усёй магутнай дзяржаўнай машыны і перагляд функцый міністэрстваў і чыноўніцтва, якое застанецца. У прыватнасці, прэзідэнт будзе пазбаўлены права выязджаць у гаспадаркі быццам для праверкі якасці выкання работ. Бо на самай справе сялян трасе як у ліхаманцы некалькі тыдняў напярэдадні візіту і некалькі тыдняў пасля. Калі прэзідэнту спатрэбіцца правесці прэсавую канферэнцыю ў прамым эфіры, то яго адміністрацыя павінна будзе звяртацца да прыватных каналаў за дазволам і плаціць за гэта велізарныя грошы.

Вось такая перспектыва, якая цяперашнім уладам і ў страшным сне не сасніцца.

Грошы ёсць не толькі на Захадзе. Прыкладам, калі б кожны кітаец даў Беларусі па некалькі юаняў, то ў эквіваленце атрымалася б велізарная сума, якой, на думку Лукашэнкі, яму хапіла, каб канчаткова адбудаваць краіну. Гэта значыць мучыць беларусаў недарэчнымі праектамі яшчэ чорт ведае колькі часу.

Дык вось, кітайцы нікога вучыць не збіраюцца. Яны даюць крэдыты, але толькі пад закупку кітайскіх тавараў ды тэхналогій. Зарабляюць на працэнтах і адначасова захопліваюць новыя для сябе рынкі. Такую форму эканамічнай экспансіі абрала для сябе Кітайская Народная Рэспубліка. Шмат хто з былых савецкіх і постсавецкіх кіраўнікоў спрабаваў зрабіць тое ж самае, але нікто паспеху не меў. Бо для гэтага трэба быць кітайцамі. Як казаў Лукашэнка, працаваць па 25 гадзін на суткі ўсяго толькі за міску рысу. Ён нават прапанаваў зрабіць тое ж самае і падначаленаму народу і ўжо нават падняў кошты рысу амаль да коштаў «народнай ялавічыны». Гэта значыць мяса другога гатунку, якое каштуе столькі, колькі і рысавыя крупы, але танней, чым грэчка.

Ужо відавочна, што беларусы на такія прапановы не адгукнуліся, бо лічаць сябе ўсё ж еўрапейцамі, а не азіятамі. Што казаць, па этнічнаму складу Беларусь ці не самая «белая» краіна ў свеце. А што ў людзей заробкі, як у чарнаскурых у Афрыцы, то так склалася гістарычна. Калі краінай пачаў кіраваць былы настаўнік гісторыі і эканаміст-завочнік, у свядомасці якога ўсё пераблыталася. Вершы з прозай, Сапега з Ціцянковым, рынкавыя стасункі з размеркаваннем камбікорму.




Зусім нездарма пры Саветах, калі да дзяржаўнага руля сталі падпускаць кухарак, генетыку абвясцілі рэакцыйнай імперыялістычнай ілжэнавукай. Бо лічылася, што кухаркі не толькі здольныя да дзяржаўнага кіравання, але яны ж ёсць і найлепшымі кіраўнікамі. Лічылася, што, з аднаго боку, кіраванне грамадствам стане вельмі простай справай, а з другога — набытыя ў кіраванні навыкі стануць перадавацца ад бацькоў дзецям у спадчыну як набытыя праз эвалюцыю.

Гэта была ілжывая пасылка. Як паказаў яшчэ Артур Вейсман, такім чынам навыкі не становяцца саманабытымі і не могуць перадавацца спадчынным шляхам. Ён адсякаў хвасты ў пацукоў бесперапынна ў 19 пакаленнях, аднак даўжыня хваста заставалася нязменна пастаяннай. Вось так. Атам можа быць невычэрпным у структурным сэнсе, дзярмо — у колькасным, а даўжыня хваста ў пацука — велічыня пастаянная.

Скажаце, звяры — гэта адно, а людзі — зусім іншае. Правільна, у ходзе эвалюцыі чалавеку неяк удалося пазбавіцца хваста і набыць многа вельмі слушных для яго генетычных асаблівасцей. Але ж пры гэтым кожная асоба з маленства да смерці застаецца ў нечым велічынёй пастаяннай, не здольнай да пераменаў.

ПРАБЛЕМА

# «БОГ ДАЎ МНЕ РУКІ. КАЛІ Б ЛЮДЗІ ДАЛІ МНЕ ПРАЦУ...»

Вольга ХВОІН

**У Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў гаворыцца, што дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права інвалідаў на працу нараўне з іншымі. Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі праца, калектыў, сацыяльныя сувязі — гэта магчымасць арганізаваць неізаляваны лад жыцця. Аднак яшчэ які дзясятак гадоў таму ў Беларусі дзецям з цяжкімі псіхафізічнымі адхіленнямі ставілі дыягназ «не здольны да навучання». І гэта быў тлусты крыж на жыцці. Што ж змянілася ў краіне і ў лёсе людзей з абмежаванымі магчымасцямі за гэты час?**



Вытворчы цэх прадпрыемства «Дарога ў жыццё»



Фота аўтара

Крысціна Канцавая

Цяпер Беларусь знаходзіцца на шляху далучэння да Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў. У выпадку, калі гэта адбудзецца, дзяржава возьме на сябе абавязкі ствараць умовы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ўдзельнічаць у эканамічным, культурным і грамадскім жыцці краіны. Пакуль працаўладкаванне — адзін з найбольш балючых момантаў такіх людзей — мае кропкавыя рашэнні і мноства нявырашаных пытанняў.

У дзяржаве каля 507 тысяч інвалідаў, і штогод блізу 50 тысяч прызнаюцца інвалідамі. Кожны другі чалавек, які атрымлівае пенсію па інваліднасці, знаходзіцца ў працаздольным узросце, але толькі прыкладна 18 працэнтаў з іх маюць работу. «Праблема аказання дапамогі людзям з абмежаванымі магчымасцямі робіцца ўсё больш актуальнай, бо рост колькасці інвалідаў становіцца ўстойлівай тэндэнцыяй сацыяльнага развіцця рэспублікі», — гаворыць Яніна Ладышава, прадстаўнік Міністэрства працы і сацыяльнага развіцця Беларусі.

## Бяда штурхае да ідэй

«Бог даў мне рукі. Калі б людзі далі мне працу, я б столькі мог зрабіць!» — гэта надпіс на брашуры, у якой гаворыцца аб праблемах працаўладкавання, сацыяльнай адаптацыі ў грамадстве інвалідаў.

Трэба прызнаць, што прадпрыемствы, дзе ёсць магчымасць даць хоць нейкую працу інвалідам, ствараюць найчасцей ці энтузіясты, ці бацькі такіх дзяцей. У Століне, напрыклад, дзейнічае прадпрыемства «Дарога ў жыццё», на якім працуе некалькі асобаў з абмежаванымі магчымасцямі. Дырэктар прадпрыемства Мальвіна Выдрыцкая — яна і кіруе столінскім філіялам Грамадскай арганізацыі «Беларуская



Алена Салабута з дачкой Крысцінай Канцавой

асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» — канстатуе, што прадпрыемства не камерцыйнае, а сацыяльнае, пра яго прыбытковасць гаварыць не даводзіцца. Да слова, амаль усе падобныя маленькія прадпрыемствы дзейнічаюць з дапамогай замежных грантаў — за спонсарскія грошы набываецца абсталяванне, выплачваюцца арэнда і камунальныя паслугі. Найбольш актыўны дапамагаюць немцы.

«Я маці інваліда, якому ўжо 24 гады. Гэта было сумеснае рашэнне, калі сабраўся актыў нашай арганізацыі і вырашыў, што будзем рабіць: дзеці цяпер малыя, а потым вырастуць, і ім трэба занятак. Спачатку гэта была гуртковая праца. А праз 14 гадоў з'явілася «Дарога ў жыццё», ёсць некалькі кірункаў, і нашы дзеці могуць выбіраць — кераміку, шыццё...» — распавядае Мальвіна Выдрыцкая.

Стварыць сацыяльнае прадпрыемства — гэта толькі пачатак. Самае складанае — выйсці на ўстойлівасць працы, забяспечыць аднаўленне абаротных сродкаў, знайсці кліентаў. Да прыкладу, арганізацыі працы прадпрыемства «Дорага ў жыццё» затраты на сыравіну складаюць каля 60% расходаў, аплата заробкаў — 20–30%. Заработная плата работнікаў мінімальная. Пражыць на яе без пенсіі па інваліднасці немагчыма. Але для работнікаў такая праца — і спосаб сацыяльнай інтэграцыі, і магчымасць атрымаць працоўны стаж, які ў выніку ўплывае на памер пенсіі. Не забываемся на камунальныя плацяжы (істотна падвышаюцца зімой) і падаткі.

## Калі дыягназ — не вырак

У 2010 годзе ў межах рэалізацыі праектаў «Азбука стварэння працоўных месцаў для людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця» і «Мы можам працаваць» Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» было зарэгістравана шэсць прыватных унітарных прадпрыемстваў. Яны найперш выконваюць сацыяльную функцыю, бо на іх працуюць інваліды з разумовымі і множнымі парушэннямі развіцця. Цяпер на гэтых прадпрыемствах працаўладкаваныя 33 чалавекі з I і II групай інваліднасці.

Так, прыватнае прадпрыемства «Бараньскія Арабескі» шые сувенірныя і гаспадарчыя торбы, якія ёсць добрай альтэрнатывай поліэтыленавым пакетам. Трэба прызнаць, што прадукцыя выглядае сімпатычна і прэзентабельна. І карыстаецца попытам, асабліва ў летні час. «Летам цяпер, усё, што мы цэлы год шылі, у нашым горадзе раскупілі за тры дні», — гаворыць інспектар па працы прадпрыемства «Бараньскія арабескі» Алена Салабута. Кіраўніца прадпрыемства Людміла Франтова тлумачыць, што складаных аперацый, канешне, работнікі не выконваюць, але тым не менш свае ўменні прымяняюць на практыцы: «Дзяўчаты могуць рабіць змётку, шыць. Мы развіваем тое, што яны могуць рабіць. Дэвіз — я не сяджу дома, а імкнуся прыносіць карысць грамадству, сваёй сям'і. Каб матывацыя ўзмацнялася, бацькі таксама мусяць тлумачыць, што гэтая праца дае іх дому, іх сям'і».

Алена Салабута, дарэчы, не толькі працуе інспектарам на прадпрыемстве, але і выхоўвае дачку Крысціну, якая і ёсць работніцай «Бараньскіх арабесак». Маці і майстар вытворчасці ў адной асобе пазітыўна ацэньвае ўплыў калектыўнай працы на людзей з асаблівасцямі развіцця. «З'явіліся зносіны, раней жа гэтага не было, сядзелі ўсе па дамах. Арганізаванасць з'явілася. Раней яна магла да гадзіны валяцца ў ложку, а цяпер у восем гадзін пад'ём — і на працу, без праблем», — дзеліцца вынікамі сацыяльнай адаптацыі Алена. Крысціна заўжды побач з маці: «Куды ж яе без нагляду адпушчу?» Дзяўчына гаворыць, што і праца, і адносіны з іншымі работнікамі ёй падабаюцца: «Мы сябруем».

## Баланс закону і маралі

Людміла Франтова наракае, што цяпер у разы падаражэлі матэрыялы. І як будзе складвацца лёс прадпрыемства — невядома. «З цэнамі не ведаем што рабіць. Званілі на аптовыя базы і даведаліся, што быў кошт тры тысячы рублёў за метр тканіны, а цяпер — пятнаццаць. Яны кажуць, што самі ў шоку, бо не ведаюць каму гэта будуць прадаваць. Старыя запасы пакрыху выбіраюцца. Розніца новы кошт прадукцыі, хто гэта будзе набываць? Ды і нашы пастаўшчыкі не ведаюць, хто ў іх будзе цяпер браць тканіну. Усе стаяць, нечага чакаюць. Чаго чакаюць?» — задаецца рытарычнымі пытаннямі Людміла.

Кіраўніца прадпрыемства падзялілася планамі — пашырыць крыху вытворчасць, даць інвалідам працу швачак. Гэта выклікала абурэнне ў прадстаўнікоў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, яны падкрэслівалі, што спачатку інвалід мусіць атрымаць адпаведны дыплом, а потым займацца кваліфікаванай працай. Быццам і правільна — усё мусіць быць па закону. Але маці Крысціны з такой пазіцыяй не згодная. «У нас такога ПТВ няма. Ды і хто возьме дзіця з такім цяжкім захворваннем? Які выкладчык возьме на сябе адказнасць? Калі нават школа не бярэ да сябе, што ўжо казаць пра ПТВ?» — гаворыць Алена Салабута. Яе дачка вучылася дома, ды і швейныя навыкі засвоіла дзякуючы стараннасці, увазе маці. Нават калі дзяўчына атрымае дыплом швачкі, ці знойдзецца прамысловае прадпрыемства, куды яе захочуць працаўладкаваць?

Кіраўнікі сацыяльных прадпрыемстваў чакаюць дзяржаўнай падтрымкі. Каб была магчымасць наймаць некалькі майстроў — адзін займаецца адукацыяй, наглядам за асаблівымі работнікамі, а іншы выконвае вытворчы план. Каб быў падоўжаны час прафесійнай адаптацыі. Грошай, як гавораць кіраўнікі такіх прадпрыемстваў, яны не просяць, а просяць найперш разумення.

Прадстаўніца галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Коршыкава агучыла афіцыйную пазіцыю: «Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва прызначаны абсалютна для іншых мэтаў. Ёсць мясцовы бюджэт, звяртайцеся, думайце». Але ўнёсак ГА «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» у вырашэнне праблемы занятасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі прызнаюць: «Вы ідзяце наперадзе», — кажуць прадстаўнікі Мінпрацы энтузіястам з грамадскага аб'яднання.

## Шклянка напалову поўная

Апошнія 10 гадоў ГА «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» шукае магчымасць для сваёй мэтавай групы працаваць і зарабляць грошы. Бацькі дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі мяркуюць, што іх інтэграцыя ў сацыяльнае і эканамічнае жыццё краіны — адзін з важнейшых аспектаў.

«На аднаго і таго ж чалавека можна паглядзець па-рознаму. Напрыклад, мой сын Міця не гаворыць, не ўмее пісаць, чытаць і лічыць, у яго здараюцца прыпадкі эпілепсіі, ён ніколі не будзе зарабляць грошы, ён не створыць сям'і. Пагадзіцеся, — гэта апісанне абсалютна бездапаможнага чалавека. Але можна паглядзець на майго сына і інакш: Міця самастойна апранаецца, карыстаецца бытавымі прыборамі, «працуе» на кампутары, ходзіць у краму, гатуе, выконвае працоўныя аперацыі. Дзякуючы нашай сям'і, нашай асацыяцыі, спецыялістам, мой сын стаў чалавекам са сваім унікальным жыццёвым ладам», — тлумачыць тонкасці жыцця людзей з абмежаванымі магчымасцямі Алена Цітова, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ TV

## 27 ЧЭРВЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** Дак. серыял «Гараджане».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.05** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.10** Фільм -фэнтэзі «Незвычайныя прыгоды Адэль» (ЗША).
**13.50** Сінематэка.
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Здароўе».
**16.05** Патрабуецца.
**16.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**17.10** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**18.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 01.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама».
**21.45** «Камандзіроўка».
**21.55** Драма «Тры колеры: Сіні» (Францыя-Польшча- Швейцарыя).
**23.55** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.40** «Эпоха».
**01.15** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Фільм «Атлантыда». Расія, 2007.
**23.05** «Войны спадчыннікаў».
**00.05** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М. Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Меншчына».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Інсайт». Беларусь, 2009 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**10.10** Баявік «Тэрмінатар-2: Судны дзень».
**12.30** Пра мастацтва.
**13.00** «Навіны надвор'я».
**13.30** Прыгодніцкі фільм «Корцік» («Беларусьфільм»). 3-я. Заключная серыя.
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**16.55** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Кінааповесць «Яшчэ аб вайне».
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч кваліфікацыйнага раўнда.
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**00.05** Бітва экстрасэнсаў.

**РОССИЯ** ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Пакой смеху».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Алтайскі самародак. Панкратаў-Чорны». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Смерць Вазір-Мухтара».
**22.15** Тэлесерыял «Выкраданне багіні».
**23.10** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі.ru».
**00.00** Прэм'ера. «Ад Пампеі да Ісландыі. Хто наступны?». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.10** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.20** Прэм'ера. Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.35** «Сумленны панядзелак».
**00.20** «Школа зласлоўя». Ток-шоў.

**EUROSPORT**

**09.30** Мотаспартыўны часопіс.
**09.45, 18.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Германія - Канада (Германія).
**11.00, 15.45, 21.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**11.15** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Буркіна Фасо - Эквадор (Мексіка).
**12.45, 00.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Аўстралія - Данія (Мексіка).
**14.15, 01.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Кот-д'Івуар - Бразілія (Мексіка).
**16.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Японія - Новая Зеландыя (Германія).
**19.00, 23.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Мексіка - Англія (Германія).
**20.55** Навіны.
**21.15** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір Giants Live (Лондан, Вялікабрытанія).
**21.45** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.35** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.25** Навіны.

**БЕЛСАТ** tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**07.40** «Час гонару», серыял: 35 серыя.
**08.25, 14.35** Чаму дэмакратыя? 4 серыя: «У пошуках Гандзі».
**09.15** Прыватная калекцыя.
**09.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.05** Без рэтушы: «Беларускі лес», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**10.30** МакраФон: «Рок па вакацыях–1996».
**11.20** Басанож па свеце.
**11.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Прынцэсы», маст. фільм, 2005 г., Іспанія.
**13.50** «Час гонару», серыял: 35 серыя.
**15.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**16.00** Без рэтушы: «Беларускі лес», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**16.30** Эксперт.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 14 серыя.
**17.30** «Час гонару», серыял: 35 серыя.
**18.15** Чаму дэмакратыя? 4 серыі: «У пошуках Гандзі».
**19.10** Побач з намі.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**20.00** Еўропа сёння.
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.40** «Прынцэсы», маст. фільм, 2005 г., Іспанія.
**23.30** Аб'ектыў.

## 28 ЧЭРВЕНЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** «Камандзіроўка».
**12.10** «Сваты-3». Серыял. 1-я серыя.
**13.05** Драма «Тры колеры: Сіні» (Францыя-Польшча- Швейцарыя).
**14.45** «Ведай нашых».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Эпоха».
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Апошняя рэпрадукцыя» (Расія). 3-я серыя.
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 01.40** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** «Сваты-3». Серыял. 1-я серыя.
**23.00** Трылер «Чорная скрыня» (Францыя).
**00.25** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**01.15** «Эпоха».
**01.45** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Фільм «Атлантыда». Расія, 2007.
**23.05** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.35** «Сведкі».
**00.35** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Інсайт». Беларусь, 2009 г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Цудоўная Марта». Германія - Італія - Швейцарыя - Аўстрыя, 2001 г.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Шчыт Айчыны». Беларусь.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.25** «Забойная сіла 2». Серыял.
**00.20** «Меч». Серыял.

**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**08.55** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**10.00** Альбарутэнія.
**10.30** Жансавет.
**11.00** Конкурс «Дзеці новага пакалення».
**12.05** Фільм «Бронзавая птушка». 1-я серыя.
**13.10** «Страсці па культуры».
**13.55** Кінааповесць «Яшчэ аб вайне».
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** «Імя Баграціёна». Дак. фільм.
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.30** Бітва экстрасэнсаў.
**23.25** Рэальны свет.

**РОССИЯ** ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Цягнік-здань. Таямніца золата Калчака». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.50** Тэлесерыял «Смерць Вазір-Мухтара».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Смерць Вазір-Мухтара».
**22.15** Тэлесерыял «Выкраданне багіні».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі.ru».
**23.40** «Уцёкі ад смерці. Маргарыта Валодзіна». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.10** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.05** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.20** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Гадзіна Волкава».
**23.35** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**00.20** «Увага: вышук!».

**EUROSPORT**

**09.30** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня.
**10.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Японія - Новая Зеландыя (Германія).
**11.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**11.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Мексіка - Англія (Германія).
**12.45** Футбол. Залаты кубак. ЗША. Фінал.
**14.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**14.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Мексіка - Англія (Германія).
**15.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**16.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Калумбія - Швецыя (Германія).
**18.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Аўстралія - Данія (Мексіка).
**19.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. ЗША - КНДР (Германія).
**21.10** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**21.25** Навіны.
**21.30** Бокс. ЗША.
**22.30** Бокс. ЗША.
**00.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Калумбія - Швецыя (Германія).
**00.55** Навіны.
**01.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. ЗША - КНДР (Германія).
**02.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

**БЕЛСАТ** tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.40** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**08.05** «Прынцэсы», маст. фільм, 2005 г., Іспанія.
**09.55** Еўропа сёння.
**10.25** Побач з намі.
**10.40** «Ранча», серыял: 13 серыя.
**11.30** Эксперт.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Чаму дэмакратыя? 4 серыя: «У пошуках Гандзі».
**12.55** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**13.25** «Палкоўнік Квяткоўскі», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**15.30** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**15.45** Еўропа сёння.
**16.10** Побач з намі.
**16.30** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**16.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 14 серыя.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 43 серыя.
**18.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Паход вызвалярыкаў», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**20.10** Праект «Будучыня».
**20.40** Паляванне на дзівосы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**22.10** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 12 серыя.
**22.55** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №6 (58) (чэрвень)

www.lit-bel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


«НАВІНЫ»: літаратурна-грамадскае жыццё чэрвеня ........ с. 2
"ПАЭЗІЯ": вершы Алеся ДУБРОЎСКАГА ........ с. 3
"СВЕТ": падарожжы Уладзіміра СІЎЧЫКАВА ........ с. 4–5
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: развагі Алеся Гібкоўскага ........ с. 6
«ПАЭЗІЯ»: «Зала ігравых аўтаматаў» Марыі МАРТЫСЕВІЧ ........ с. 7
«ПРОЗА»: «Вочы засмучоныя» Барыча ПЯТРОВІЧА ........ с. 8–9
«ФОРУМ»: быліца Паўла ЛЯХНОВІЧА і эсэ Галіны ДУБЯНЕЦКАЙ ........ с. 10–11
«ПРАЙДЗІСВЕТ»: «афрыканскія» пераклады ........ с. 12–13
«КРЫТЫКА»: Міхась ЮЖЫК пра «П'яўку» Юрыя СТАНКЕВІЧА ........ с. 14
«ЮБІЛЕЙ»: Васіль ЖУКОВІЧ пра Генрыха ДАЛІДОВІЧА ........ с. 15
«КНІГАНОША»: новыя выданні на нашых паліцах ........ с. 16


▸ **АКТУАЛІІ**

# ЕЎРОПА, ЦЯЖАРНАЯ БЕЛАРУССЮ…

**Валярына**

**Некалькі прэзідэнцкіх тэрмінаў запар з вуснаў розных кандыдатаў на найгалоўную пасаду краіны я чую адну і тую ж показку (форма мянялася ад разу да разу, але змест, змест заставаўся тым самым)…**






У беларуса спыталі: «У якой краіне ты хацеў бы жыць?» — «У Беларусі», — адказаў той. — «Дык ты ж у ёй жывеш». — «Э, не, — пачухаў патыліцу беларус, — я хацеў бы жыць у той Беларусі, якую паказваюць па тэлевізары». Я ж не хачу жыць і ў той Беларусі, што паказваюць па тэлевізары. Я ўвогуле яго рэдка гляджу.

У сінім экранным люстэрку, у якое перыядычна зазіраем у чаканні добрай навіны, скажонае адлюстраванне.

Беларусь — што непрычалены човен, а астатнім часам — як Ладдзя Роспачы — не ведае (не хоча па волі стырнавога-Харона) да чаго-каго прытуліцца, прыстаць, да якога такога берага — да Усходняга ці Заходняга.

З аднаго боку мы маем гісторыю, у якой Беларусь (няхай тады так і не называлася) ужо была ў Еўропе, была Еўропай. З іншага боку — мы бачым будучыню, у якой вымалёўваецца для нашай краіны некалькі перспектываў… І як той ківач, гайдае нас ад аднаго берага да другога. І здаецца, вось-вось — але ўсё ніяк, ніяк не выпадае…

Шлях першы (ці не найбольш непрывабны): Беларусь як Северо-Заходні Край, як частка Расіі. Але і гэты шлях мы праходзілі. І з гэтага выкараскаліся, збочылі. Але яшчэ крыху, і — гэта папраўдзе жахліва! — зноў можа спраўдзіцца: у рукі імперскіх пакупнікоў трапіць прайс з найгалоўнымі землямі РБ. Бронь Божа.

Шлях другі (цяпер, бадай, бачыцца найменей відавочным): Беларусь як Kresy Wschodnie, частка Польшчы. Але й з такой раскладкі нам у свой час таксама палёсіла выбрацца.

Адныя акрэсліваюць шлях Беларусі як Еўразійскі шлях (трэці), іншыя — як шлях да абсалютнай Еўропы (чацверты) у перспектыве.

Да слова, аднаго разу так сталася, што выпала мне адчуць на сваёй скуры полюснасць тых шляхоў і трапіць на тыдзень у Ашхабад (Туркменістан), дзе брала ўдзел у Міжнароднай кніжнай выставе, і адразу адтуль праз Рыгу — трапіла ў Стакгольм, Швецыю, дзе правяла блізу месяца. То бок, з класічнай прысавечанай Азіі (з адной з нашых магчымых будучыняў гадоў праз N-цьць) у еўрапейскую Еўропу (у палярна іншую з магчымых перспектыў развіцця). Разрыў быў каласальны — да слёз у вачах і перакуленага свету ў галаве. Але ні першая ні другая перспектыва не падаліся мне абсалютна пасавальнымі для маёй краіны, не было ў іх тых прывілеяў ды вабнотаў, каб палюбоўна аддаліца ў абдымкі. Хаця абедзве паўсталі перада мной найлепшымі сваімі дагледжанасцямі. Але ж калі ад першай хацелася бегчы бежма (чалавечым страхам пры абсалютным стабілізме папросту поўнілася ўпарадкаванае паветра), то ад другой карцела ўзяць найлепшае і прышчапіць да таго, што маем, канкрэтна падкарэктаваўшы пад сябе.

У свой час філосаф Ігнат Канчэўскі (каторы Абдзіраловіч) казаў пра наш адметны беларускі шлях (пяты), пра «ільючасць» формаў, што набываем і з якіх перастваараемся. Ды як на мяне, то наканаваны Беларусі напраўду — адметны шлях, шлях паміжны. Ды шлях той — у кірунку Еўропы. І на тое спадзеў.

Але кім там быць, чым? Роўным сярод роўных? Паводле шырока агучаных геаграфічных прыкметаў мусіць быць Беларусь міфічным цэнтрам, сэрцам Еўропы. Хутчэй — сумна ўсміхнемся — пупком Еўропы. Але калі і называць яе цяпер нейкім складнікам-арганам еўрапейскім, то хіба што — што зусім не па-беларуску — попай. І ў тую попу мы трапілі ўсё ж, як пісаў Караткевіч у сваёй «Зямлі пад белымі крыламі», з лёгкай рукі самага дурнога ў свеце начальства. А з чыёй дапамогай адтуль выбірацца?.. Хіба — сваімі сіламі. Бо хто нам дапаможа, калі не мы?..

> **Еўропа, цяжарная Беларуссю. І ніхто не ведае, калі ж яна ў Еўропы народзіцца. Ці то будзе выкідак, ці то падкідак, ці то яе папросту лёс перанасіць… Бывае ж, што дзіця чакаюць дзевяць месяцаў, а яно з'яўляецца праз дзесяць**

Хтосьці скажа: то няхай, пакуль не сталіся хаця б пупком, застанемся папросту адметнымі на скрыжаваннях. Але ж ростані тыя так зацягнуліся, што высмакталі зашмат сілаў не толькі з разнастайных кандыдатаў у кандыдаты, што намагаліся змяніць геаграфію, але і з усіх беларусаў.

Колькі сябе памятаю, ніколі не хацелася назаўжды задбаць на Сінявокую, а карцела — наіўна і шматспадзеўна, па-юначы верачы — найлепшае з краін, у якія даводзілася падарожнічаць, у якіх выпадала бываць, прыўнесці, прывезці сюды, да сябе, да нас. Хаця б у сваю малую Беларусь, тую маленькую краіну, якую сню, якой мрою, у якую веру… Беларусь, якой пакуль няма. Ды якая жыве ўва мне, у маіх родных, сябрах і аднадумцах. Беларусь нашых мараў, якая яшчэ толькі народзіцца… у Еўропы. Ад таго ды дзеля таго і выспела ўва мне такая празрыстая, здавалася б, метафара: Еўропа, цяжарная Беларуссю. І ніхто не ведае, калі ж яна ў Еўропы народзіцца. Ці то будзе выкідак, ці то падкідак, ці то яе папросту лёс перанасіць… Бывае ж, што дзіця чакаюць дзевяць месяцаў, а яно з'яўляецца праз дзесяць, як, прыкладам, было са мной. І ніхто такога фінту кону патлумачыць не можа, хіба што пасля — па выніку…

### Нарадзі Беларусь!

*Людцы, людцы! Еўропа цяжарная!*
*Рукі ў бокі — ідзе ўрачыстая,*
*падпяразаная дзяржаўнасцю,*
*ва ўсе цэнтры свае вачыстая!*

*А пад сэрцам дзіцятка пхаецца,*
*у маленькім сусвеце скутае,*
*за свае, за жыццё барукаецца:*
*прыйдзе, прыйдзе палёгка хуткая.*

*Свет вялікі — і хочацца й колецца:*
*але йдзі парадзіху прымусь!..*
*За здароўе Еўропы моляцца:*
*«Нарадзі, нарадзі Беларусь!»*

**Готланд, Швецыя, 2009**

Спадзяюся, што Беларусь цяпер ужо (сярод усіх блукальных органаў еўраарганізму) займае месца хаця б апендыкса, які настолькі перапоўнены лушпайкамі гісторыі, настолькі крываточыць праз незагойныя шнары рэпрэсіяў, які так муліць, так баліць, што неўзабаве можа лопнуць… І перафармавацца ў які больш прыстойны орган.

Ёсць жа, ёсць жа тое месца, якое вызначыў для Беларусі Бог, Гісторыя, якое мы самі абярэм для нашай Краіны.

Так не хочацца стацца тым, хто будзе апошнім вымыкаць святло ў беларускім аэрапорце… калі ўсе зваляць.

Як ёсць — так ёсць. Хочацца выйсця…

«У якой краіне ты хацеў бы жыць?» — «У Беларусі».

## MEMORIA

### УЛАДЗІМІР КОНАН

У ноч на 6 чэрвеня спачыў у вечнасці Уладзімір Міхайлавіч Конан. Патрыярху беларускай філасофіі і літаратуразнаўцу, доктару навук, прафесару, сябру Саюза беларускіх пісьменнікаў ішоў 78-ы год.

Уладзімір Конан нарадзіўся 23 красавіка 1934 года ў вёсцы Вераскава Навагрудскага раёна. Скончыў гістарычны факультэт БДУ, працаваў у Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі. У 1991 годзе стаў загадчыкам аддзялення гісторыі і тэорыі культуры Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Скарыны.

Уладзімір Конан не быў філосафам-пустэльнікам. Ён застанецца ў памяці адкрытым і публічным чалавекам, грамадзянская пазіцыя якога заўсёды была ўзорнай для дзясяткаў, сотняў ягоных вучняў і прыхільнікаў. У першую чаргу яго цікавілі гарызонты і загадкі беларускага нацыянальнага духу і нацыянальнай ідэі.

«Ён не абмяжоўваўся толькі літаратурай, як гэта часам робяць літаратуразнаўцы, — сказаў пра калегу Адам Мальдзіс. — Ён разглядаў эстэтычныя каштоўнасці на шырокім грамадскім полі. І ўсё ён гэта рабіў вельмі грунтоўна, без кампрамісаў — не памятаю, каб ён дзесьці ішоў на навуковыя, творчыя кампрамісы. Але і без асаблівага захвальвання. Ён канстатаваў тое, што ёсць… Тое, што напісана Уладзімірам Конанам, тое, што засталося, будзе для нас узорам, будзе для наступных пакаленняў маяком, як трэба адносіцца да мастацкіх каштоўнасцяў».

Рыцарам беларускага духу назваў Уладзіміра Конана філосаф і літаратуразнаўца Валянцін Акудовіч: «…Ён — беларускі Дон Кіхот, прыгожы і ўзнёслы ў сваіх парываннях, неўпрыкмет трывушчы і нязломны ў сваёй веры… Уладзімір Конан выбраў сабе час духу, у якім ён усе гады спеліў любоў да мыслення, Айчыны і Бога. І ён застанецца ў гэтым часе навечна».

### ПАВЕЛ МІСЬКО

9 чэрвеня на 81-м годзе жыцця пайшоў у іншы свет беларускі пісьменнік Павел Місько.

Павел Андрэевіч нарадзіўся 14 сакавіка 1931 года ў вёсцы Старцавічы (цяпер Знамя) Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1955). Працаваў адказным сакратаром, намеснікам рэдактара давыд-гарадоцкай раённай газеты «Сцяг Леніна». У 1959-1964 гг. — уласны карэспандэнт газеты «Звязда» па Гарадзенскай вобласці, у 1964-1967 гг. — літсупрацоўнік «Сельской газеты», у 1967-1971 гг. — загадчык аддзела культуры рэдакцыі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», у 1971-1972 гг. — загадчык аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя». З 1972 г. — загадчык рэдакцыі прозы, у 1976-1980 гг. — намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура». Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1968 г. Першае апавяданне апублікаваў у 1958 г. (альманах «Брэст»).

Аўтар раманаў «Мора Герадота», «Хлопцы, чые вы будзеце», аднаактовых п'ес «Канфлікт мясцовага значэння» і «Ліха крадзецца ціха» і інш. Пераклаў на беларускую мову паэму М.В.Гогаля «Мёртвыя душы».

### СЦЯПАН КУХАРАЎ

12 чэрвеня на 92-м годзе жыцця памёр адзін з найстарэйшых беларускіх пісьменнікаў Сцяпан Кухараў.

Сцяпан Іванавіч нарадзіўся 31 ліпеня 1919 года. Закончыў Гомельскае педвучылішча. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у «Чырвонай змене», «Настаўніцкай газеце», часопісе «Маладосць». З прозай дэбютаваў у 1944 годзе. Яго творы прысвечаныя пераважна беларускай вёсцы і яе працаўнікам. Жыў у Мінску. Вядомы як аўтар шэрагу нарысаў пра Беларусь і яе людзей.

### СВЯТЛАНА САЧАНКА

15-га чэрвеня стала вядома, што пайшла з жыцця паэтэса і літаратуразнаўца Святлана Явар (Святлана Барысаўна Сачанка), дачка вядомага беларускага пісьменніка Б. І. Сачанкі.

Святлана Явар нарадзілася ў Мінску 11 ліпеня 1968 года. Скончыла філалагічны факультэт БДУ і аспірантуру Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі. Працавала ў розных беларускіх выдавецтвах, ва Універсітэце культуры, Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтры імя Ф. Скарыны.

Выдала дзве кнігі паэзіі «Белы месяц» і «Раніца ў туманах». Аўтар шматлікіх літаратуразнаўчых і крытычных даследаванняў і артыкулаў у беларускім і замежным друку.

### ЮРЫ МАЛАШ

Раптоўна ў сярэдзіне чэрвеня пайшоў з жыцця Юры Малаш, літаратар, кіраўнік Мінскай абласной арганізацыі «Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны», удзельнік многіх мастацкіх выставаў і навуковых канферэнцыяў.

Юрый Леанідавіч Малаш нарадзіўся 16 студзеня 1957 года ў Мінску. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Гісторыя». Працаваў настаўнікам у школах Мінска, у архіве. Апошнім часам — старшым навуковым супрацоўнікам Гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе».

Аўтар кніг «Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі» (2007), адзін з аўтараў кнігі «Беларускія маляваныя дываны» (2005). Займаўся рукапіснай кнігай, кнігай-мастака (artist-book). Займаўся даследаваннем народнага мастацтва беларусаў, гісторыяй горада Заслаўе, шмат увагі надаваў спадчыне мастака Язэпа Драздовіча. Некаторыя з аўтарскіх кніг захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі («Покліч Рагнеды», «Дзівосны лубок» ды інш.), у Прэзідэнцкай бібліятэцы Беларусі («Фаліянты Белай Русі», «У райскім садзе Алены Кіш»).

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыкаў.

Вечная ім памяць!

ПАДЗЕЯ

# ШВЕДСКА-БЕЛАРУСКІЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ ЧЫТАННІ

**Тых, хто завітаў на філфак БДУ 2 чэрвеня, чакала нямала цікавага: прэзентацыя дзіцячага зборніка «Дыктатар», іранічныя прамовы і спевы Віктара Шалкевіча, музычныя эксперыменты Філа Чмыра і, канечне ж, добрая порцыя якаснай літаратуры. Як шведскай, так і беларускай.**



Алесь Пашкевіч уручае Дзмітрыю Плаксу пасведчанне сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў

У вялікай і пафаснай зале філфака БДУ пасля вулічнай спёкі надзвычай прыемна, бо прахалодна. Шведскі амбасадар з заўсёднай усмешкай сустракае гасцей, якія прыйшлі на імпрэзу…

«Паэты — незвычайная катэгорыя людзей, яны ўпрыгожваюць жыццё сярэднестатыстычнага чалавека ад нараджэння да скону. Гэта людзі са словам у руцэ», — паўурачыста-паўіранічна прамовіў вядоўца Віктар Шалкевіч, прадстаўляючы ўдзельнікаў беларуска-шведскіх чытанняў. «А якая карысць ад сённяшняй імпрэзы — дазнаецеся гадоў праз 20», — таямніча дадаў ён і даў слова Стэфану Эрыксану. Дыпламат сарваў апладысменты пасля сказа: «Спадзяюся, што прыспее час, калі ўсе сувязі паміж нашымі краінамі будуць такімі ж, як літаратурныя», — і паведаміў, што на буйным кніжным кірмашы ў Гётэборгу ўвосень Беларусь прадставяць адразу чацвёра нашых пісьменнікаў – сваімі кнігамі па-шведску.



Катарына Фростэнсан



Стэфан Эрыксан, амбасадар Швецыі

Пачатак чытанняў выйшаў інтрыгоўным. На сцэну выйшлі двое лысых няголеных мужчынаў і адзін валасаты, барадаты. Імі выявіліся беларускі паэт і перакладчык Дзмітры Плакс, лідар гурта Drum Exctasy Філ Чмыр і вядомы саўндпрадусар Андрэй Жукаў. Яны прадставілі свой праект «Перашкоды і нацыскі».

Мужчыны сталі ў цэнтры сцэны, напалову адвярнуўшыся ад аўдыторыі, і падчас гучання фанаграмы з праекту засяроджана глядзелі на свае гадзіннікі. «Поўную версію нашага праекту можаце паслухаць на сайце budzma.org», — заявіў Філ і расказаў пра гісторыю яго стварэння. Выявілася, што яны сустрэліся ўпершыню тут і цяпер — усё рабілі праз інтэрнэт. Плакс начытваў вершы ў Стакгольме, Чмыр выдумляў музыку ў Мінску, Жукаў тутсама яе запісваў і зводзіў. «Я не разумею па-беларуску, а Дзмітры мне выразшаў нічога не тлумачыць, таму было вельмі цікава працаваць», — агаломшыў раптам прысутных лідар беларускай групы Drum Exctasy, зусім не саромеючыся пры гэтым зірнуць у вочы шведскага амбасадара, якога адзін з наступных выступоўцаў Алесь Пашкевіч назваў «адным з найлепшых знаўцаў беларускай мовы ў Беларусі».

Музычныя эксперыментатары саступілі месца шаноўнай госці — Катарыне Фростэнсан, бялявай сур'ёзнай жанчыне, якая яўна не выглядае на свае гады. Яна — класік сучаснай шведскай літаратуры, уладальнік усіх магчымых еўрапейскіх літаратурных прэмій. Пачала паэтка сваё чытанне з верша «Ліст», з якога Зміцер Вайцюшкевіч паспеў ужо зрабіць песню. На беларускай мове яе творы перачытвалі Алена Іваннікава і Дзмітры Плакс, які толькі што выдаў кнігу перакладаў вершаў Фростэнсан пад назвай «Чыстая краіна».

Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч прачытаў урывак са свайго новага, яшчэ нявыдадзенага твора «Сімъ победише», падзеі якога адбываюцца ў двух часавых вымярэннях — у перыяд панавання Івана Жахлівага і ў сучаснасці. Ён адмыслова абраў кавалак, дзе згадваецца шведскі пасол. «Праўда, тады прадстаўнік гэтай краіны плёў інтрыгі з Масковіяй, а цяперашні пасол пляце вянкі супрацоўніцтва», — тактоўна заўважыў Алесь і саступіў месца свайму калегу — кіраўніку Шведскага ПЭН-цэнтра Ула Лашму, паважнаму спадару ў гарнітуры, які выглядаў на банкаўскага службоўца. «Ці цяжка пільнаваць шведскіх пісьменнікаў?» — кпліва спытаў у яго вядоўца Шалкевіч. «Зусім не складана. Яны самі сябе даглядаюць», — халадна парыраваў той і прачытаў навелу пра самоту.

Весялосці імпрэзе дадала паэтка Аксана Спрынчан, якая вынесла на сцэну пляшку, тут жа яе адкаркавала і запрасіла выпіць Эрыксана і Шалкевіча разам з ёй. Тут жа з'явіўся Ульф Старк — жывы класік шведскай дзіцячай літаратуры, які прадставіў беларускай публіцы кнігу пад назвай «Дыктатар». «Я пішу кнігі пра ўсё і для ўсіх. Нават для жыватоў цяжарных жанчын», — зрабіў прызнанне ён і прачытаў твор пра тых, хто толькі прыйшоў на гэты свет і дыктуе свае ўмовы. У беларускім перакладзе сэнс твора да прысутных данёс Шалкевіч, расказаўшы пад смех левай часткі залы пра дыктатара, які заказвае зоркі на небе, хоча слухаць казкі толькі пра сябе самога, а ўначы сніць бамбавікі і шпіёнаў.

Смяшлівы настрой падтрымаў Усевалад Сцебурака, прачытаўшы верш пра хрэнь. Але скончыў сур'ёзным: «Калі памруць мае дзяды…» і ўласным патрыятычным зваротам да беларусаў.

Вялікую і тлустую кропку на просьбу арганізатараў вечарыны паставіў Віктар Шалкевіч, зайграўшы пару свежых хітоў, цяпер ужо пад агульны смех як левай, так і правай часткі залы: песню з доўгай назвай «Чарговы раз з чарговаю жанчынай чарговы пачынаецца раман», «Электрычнае танга Кастусь» і «Голуба на секвоі», напісанага якраз пад уражаннем ад паездкі ў Швецыю, дзе спявак сустрэў шмат суайчыннікаў, якія, праўда, не надта хацелі прызнавацца ў сваёй нацыянальнай прыналежнасці.

Падобныя літаратурныя імпрэзы прайшлі ў Пінску і Берасці.

**Сяргей Будкін, Аляксандар Ждановіч, budzma.org**

ВЕРШЫ

# БОГ САМОТНЫ ЗАЎСЁДЫ

Алесь ДУБРОЎСКІ-САРОЧАНКАЎ

* * *

*Ты варушыш паглядам вершаванае смецце,*
*пазяхаючы рыфмам услед:*
*«Што сказаць можа ў гэтым*
*пракураным свеце*
*старамодны і смешны паэт?»*

*На вышынях якіх тое Слова ён знойдзе,*
*з гор якіх сюды прынясе,*
*дзе спацелае, згвалчанае стагоддзе*
*лахманамі слоўцаў трасе?*

*Слова ёсць і кагосьці аглушыць дазвання…*
*І, як рытар, узнімаю руку:*
*«Асуджальна-прарочае слова маўчання*
*хай гучыць у маім радку!»*

* * *

*Дайце мне паверыць безаглядна*
*ў велічнасць асенняга дажджу.*
*Надта ўжо рашуча-лістападна*
*год праводзіць мокрую мяжу.*
*Надта ўжо спяшаецца стагоддзе*
*кінуцца на рэйкі нябыцця…*
*Хто адкажа ў дзікім карагодзе,*
*што раблю ў сусвеце гэтым я?*

* * *

*Не адчуўшы дажджу на далоні,*
*з ганка ў жнівень сыйду.*
*Чыйсьці воклік мяне дагоніць:*
*— Прыпыні хаду!*

*І здагадка марудзіць не стане*
*(не сямнаццаты хлопцу год) —*
*гэта жніўня майго дыханне,*
*гэта голас яго.*

*Хутка лягуць люстэркі лужын*
*вераснёўскіх наўсцяж.*
*Можна так прайсці, не адчуўшы*
*пад нагамі жыцця.*

## Пытальнік на палях

*Ты калісьці любіў гучанне*
*таямнічых, прывабных слоў,*
*пекных рыфмаў цьмяныя здані*
*чуў у шэпце начных галасоў.*
*І мелодыі дактыляў, ямбаў*
*як гіпноз для цябе былі,*
*і ты йшоў, быццам той самнамбул,*
*куды гукі цябе вялі…*

*Ці тады, дружа, быў ты вар'ятам,*
*ці ты зараз — няшчасны жабрак?..*
*Што плявузгалі нам, кацянятам, —*
*аказалася ўсё не так.*
*Насамрэч мы жывём з табою*
*ў час з кароткай назваю «post-».*
*Тут не класікаў, не герояў —*
*апакаліпсісу фарпост.*

*І эпоха наша свой нораў*
*праяўляе ў кашмары сноў,*
*дзе сусвет — гэта поўны збор твораў,*
*дзе жыццё — пыл з абрэзаў тамоў.*
*Так скрыжалі стагоддзяў лоўка*
*парасцісвала войска пісак,*
*што ўжо нават пытальнік алоўкам*
*на палях не паставіш ніяк.*

* * *

*Тут горад ліецца ракою бязглуздзіцы,*
*там неба ліецца знічак дажджом.*
*Ты ўжо захлынуўся на вусцішных вуліцах.*
*Не тут і не там твой дом.*

*Ты надта лагодны для свету драпежнікаў,*
*ты надта пачварны для свету святых.*
*Кастрычнік на голле самоту развешвае.*
*Самотніцкі неба ўздых.*



Алесь Дуброўскі-Сарочанкаў нарадзіўся 18 лістапада 1976 г. Скончыў філалагічны факультэт БДУ, магістратуру і аспірантуру па кафедры тэорыі літаратуры, а таксама Тэалагічны інстытут Саюза хрысціян веры евангельскай у Рэспубліцы Беларусь.

Кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Друкуецца з 1992 г. (часопіс «Першацвет»). Першая кніга паэзіі – «Паміж небам і багнаю» – выйшла ў 1997 г. у «Бібліятэцы часопіса «Маладосць». Член Саюза беларускіх пісьменнікаў.

*Ты можаш пачаць спектакль ці істэрыку,*
*ці проста аддацца сну,*
*ці проста адкрыць яшчэ раз Амерыку.*
*Ці зорку — яшчэ адну.*

* * *

*Зноў сакавік да лютага лашчыцца —*
*досыць скандальны сюжэт.*
*Хто там таўчэцца з разяўленай пашчаю?*
*— Прагны да бруду свет.*

*Хтосьці ў кішэні каменне рассоўвае,*
*хтосьці ад злосці зароў.*
*Ноч кракадзілавы слёзы насоўкаю*
*сцёрла з шыбаў дамоў.*

*Што ты шукаеш вачмі звар'яцелымі*
*ў гэтым натоўпе яшчэ?*
*Кінь! Гэта статка галоднага цела,*
*россып пустых вачэй.*

* * *

*Я толькі прадчуваю гэта:*
*самотны бліск вачэй тваіх,*
*калі ў бязмежнасці сусвету*
*я напаткаю бездань іх.*

*Я гэта толькі прадчуваю:*
*твой голас ціхі, трапяткі,*
*калі ў бязмежнасці адчаю*
*крануся цёплае рукі.*

*Мне невядома, дзе ты, хто ты,*
*мне незнаёмы позірк твой,*
*але ў прадонні адзіноты*
*я прадчуваю нас з табой.*

* * *

*І ты будзеш зноў са мной.*
*І свет перальецца ў вечнасць.*
*А восень падасца нечай*
*усмешкай… знаёмай такой…*
*А вечар падасца катом —*
*галодным катом прамоклым —*
*і будзе скрэбціся ў вокны*
*ліхтарным цьмяным святлом.*
*А ты будзеш зноў са мной.*

*А потым цябе не будзе.*
*І будуць чужыя людзі,*
*і студзень, жахлівы студзень,*
*з хлуслівай сваёй цішынёй…*

## Вяртанне да паэзіі

*Вяртацца смешна да таго,*
*што кінуў «раз і назаўсёды»,*
*ды графаманства без нагоды*
*выплюхваецца з берагоў.*

*Я зноў шукаю адкрыцця*
*ў шаманскім заклінанні рыфмаў,*
*і плынь культуратворчых прымхаў*
*зноў мае атрымаць працяг.*

*Я зноў у пошуках таго*
*адзінага са слоў сусвету —*
*як быццам ёсць яшчэ ў паэта*
*надзея адшукаць яго…*

* * *

*Памяці Анатоля Мяснікова*

*пражываючы дні*
*паміраючы ўночы*
*па шляхах сваіх крочым*
*мы заўсёды адны*

*за дзвярыма сцяна*
*за акном снежань белы*
*і планета знямела*
*бо планета адна*

*бо глыбокае дно*
*ў гэтым вусцішным моры*
*сярод чорнай прасторы*
*нават сонца адно*

*і мільярды гадзін*
*бы маўклівыя воды*
*БОГ самотны заўсёды*
*БОГ заўсёды адзін*

* * *

*Вазьмі мой голас, працягні руку мне,*
*святло ў акне мне запалі ярчэй.*
*Ты бачыш: сёння я чамусьці сумны;*
*хоць Ты са мной — я не з Табой яшчэ.*

*Я не з Табой, я ад Цябе далёка.*
*Ты — ля дзвярэй, я ж не знайду ключэй.*
*Ды бачыш Ты праз мураванне змроку*
*агонь лампады — крык маіх вачэй.*

## З Эклезіяста

*1*

*Кніга Эклезіяста,*
*раздзел 1,*
*вершы 1–8*

*І мовіў Саламон: усё пустая марнасць.*
*Як плёну паспытаць ад працы сваіх рук?*
*Сыходзіць род людскі, зямля ж*
*заўжды ўладарыць,*
*малюе сонца свой бясконцы круг.*

*Ад поўначы да поўдня кружыць вецер.*
*Нясуць даніну мору рэкі ўсе,*
*ды як напоўніць мора?.. Дзён суквецце*
*знікае ў смецці пакрысе.*

*І як напоўніць вока зрокам,*
*як вуха слуханнем заліць,*
*як не пакінуць шанц сурокам,*
*што тчэ стагоддзяў ніць?*

*2*

*Кніга Эклезіяста,*
*раздзел 1,*
*вершы 9–11*

*Што рабілася, тое й будзе рабіцца,*
*што было калісь, тое вернецца зноў.*
*Нам не суджана ў гэтым свеце здзівіцца,*
*бо старое ўсё ад пачатку часоў.*

*Кола коціцца па старой каляіне,*
*і што дзеецца — дык не ў першы ўсё раз.*
*Няма памяці пра былыя часіны,*
*і ў нашчадкаў не будзе — пра нас.*

*3*

*Кніга Эклезіяста,*
*раздзел 1,*
*вершы 12–18*

*І быў я пастырам. Ізраіль быў мой статак.*
*Я свет хацеў змясціць у розума палон.*
*(Даў людзям Бог цяжкі гэты занятак —*
*практыкавацца ў ім да скону сваіх дзён.)*

*Я бачыў справы ўсе, што робяцца*
*пад сонцам.*
*І вось усё — плён марнасці благі.*
*Не выпрастаў крывых, не падлічыў*
*бясконцасць,*
*астатняе зрабіў, ды толькі сэнс які?*

*І кінуў мудрасць я — сумніўную навуку,*
*і вырашыў спазнаць вар'яцтва хараство.*
*Але і гэта — горкае пітво:*
*хто веды множыць — памнажае скруху…*
*Усюды марнасць і знямога духу.*

*4*

*Кніга Эклезіяста,*
*раздзел 3,*
*вершы 1–8*

*Для кожнай рэчы ёсць свой час пад небам:*
*выходзіць з глебы і вяртацца ў глебу;*
*час насаджаць і выдзіраць з зямлі;*
*забіў учора — сёння ацалі;*
*час разбураць і будаваць палацы;*
*для плачу час і час, каб пасмяяцца;*
*час скардзіцца на лёс і час скакаць,*
*раскідваць камяні і іх збіраць;*
*час абдымаць і бегчы ад абдымкаў,*
*збіраць у скрынку, выкідаць са скрынкі;*
*час, каб знайсці ўсё, час — усё згубіць;*
*час раздзіраць, сшываць; час, каб любіць,*
*і час, каб ненавідзець усім сэрцам,*
*балакаць аб жыцці, маўчаць аб смерці;*
*ёсць змрочны час вайны, ёсць міру час…*

*5*

*Кніга Эклезіяста,*
*раздзел 3,*
*вершы 16–22*

*Я бачыў пад сонцам: на месцы суда —*
*беззаконне,*
*дзе праўда павінна ўладарыць —*
*хлусоў панаванне.*
*І ў сэрцы сваім я прамовіў: о цемры*
*прадонне!*
*Распусныя суддзі, адбудзецца суд*
*і над вамі.*

*І ў сэрцы сваім я сказаў пра сыноў*
*чалавечых,*
*што гэта жывёліны, розніцы тут аніякай;*
*як тыя сыходзяць у смертухны*
*злую пустэчу,*
*таксама і гэтыя: што чалавек,*
*што вужака…*

*Бо ўсё гэта марнасць, ідзе ўсё*
*ў адзінае месца.*
*Дзе дух наш набудзе спакой — толькі Богу*
*вядома,*
*а цела — а цела ва ўсіх з аднаго,*
*пэўна, цеста:*
*мы з глебы прыйшлі і нам трэба*
*вяртацца дадому.*

*І ўбачыў я: самае лепшае ў гэтым сусвеце —*
*піць келіх жыццёвы, і піць той напой*
*з асалодай.*
*Бо ўрэшце адыдзем, і хто прывядзе*
*паглядзець нас,*
*што будзе пасля адыходу?*

ПАДАРОЖЖЫ

# СУМОЎІ Ў СУОМІ

Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

**Званок прагучаў перад Вялікаднем, у чысты чацвер, раніцою.**

**З кіраўніцтва Саюза беларускіх пісьменнікаў спыталіся, ці даўно я быў у Фінляндыі і ці не пагадзіўся б прадстаўляць там Беларусь на сімпозіуме пісьменніцкіх асацыяцый. Не раздумваў і хвіліны, з радасцю пагадзіўся, бо ў той скандынаўскай краіне аніколі не даводзілася бываць, а рэпрэзентаваць найстарэйшую пісьменніцкую арганізацыю краіны палічыў за гонар. Шэнгенская віза ў мяне дзейсная, тэрміны паездкі абазначыліся заранеі, амаль што за месяц, дый ехаць трэба было не аднаму, а з прэсавым сакратаром СБП, перакладчыцай Юліяй Цімафеевай, з якой збольшага быў знаёмы. Таму ахвотна надыктаваў ёй свае пашпартныя дадзеныя, каб магла набыць электронныя квіткі на самалёты па маршруце Вільня—Хельсінкі—Турку.**

* * *

Амаль год таму мой шведскі калега, пісьменнік, перакладчык і выдавец Нільс Хокансан, які ачольвае фірму «Ruin», запытаўся пра мае пашпартныя дадзеныя, каб арганізаваць запыт на Шэнгенскую візу.

Праз некалькі дзён дасылае ён чарговы ліст, а ў ім і асцярожнае пытанне: ці праўда, што пашпарт мой дзейсны да 2058 года?

Давялося тлумачыць, што паводле беларускага заканадаўства пашпарт выдаецца грамадзяніну ў шаснаццаць гадоў. Мяняецца ён з новай уклеенай фатаграфіяй у дваццаць пяць гадоў, бо за дзевяць гадоў падлетак ці дзяўчына ператвараюцца ў дарослую асобу, могуць змяніцца фізіянамічна вельмі істотна, часам да непазнавальнасці. І нарэшце, калі асноўны дакумент не страчаны або не сапсаваны, чалавек атрымлівае апошні, «пажыццёвы» пашпарт у сорак пяць гадоў, а тэрмін дзеяння прастаўляецца ў ім у сто гадоў ад даты нараджэння!

Нільс потым дзякаваў мне і як перакладчык за гэтую «краязнаўчую» даведку, але падобнае пытанне чуў я не раз. Польскія памежнікі, бывала, пыталіся: «Пан Уладзімір, вы папраўдзе намерваецеся жыць сто гадоў?!» Даводзілася аджартоўвацца, маўляў, у нас на Беларусі гэта не рэдкасць, асабліва сярод вясковых кабет.

* * *

Да Вільні даехалі досыць камфартабельным аўтобусам, за вокнамі якога надвор'е бесперапынна мянялася з сонечнага на дажджлівае.

Запланаваныя прыпынкі былі толькі ў Ашмянах і на мытна-памежных пунктах. А вось незапланаваных паводле графіка было з паўдзясятка. Ад'ехаўшыся ад Менска, вадзіцель спыняўся, перамаўляўся па мабільным тэлефоне з тым, хто мусіў дагнаць яго па трасе, а пад Бузунамі падабраў ажно шэсць маладзёнаў каўказскай знешнасці. Затое пасля мяжы спыняўся ўжо, каб перагрузіць важкія скрынкі ў мікрааўтобус і ў легкавікі, якія прычэквалі яго на ўездзе ў цяперашнюю літоўскую сталіцу і нават перад самым вакзалам!

Праз гэта чацвёра немцаў запісалі ягоныя нумарныя знакі, вінавацілі, што праз яго спазніліся перасесці на свой далейшы рэйс. «Кантрабандыст» цвердзіў, што прыбыў своечасова, і прасіў не пісаць аніякіх скаргаў.

* * *

Ветлівая і пунктуальная жанчына-вадзіцель аўтобуса №1 дазвела нас на канцавы прыпынак. Хіба што па маршруце ў салон наведалася суворая брыгада кантралёраў у атрутна-зялёных камізэльках, і чымсьці развесяліла купку студэнтаў-ЕГУшнікаў.

Віленскі аэрапорт аказаўся невялікім і досыць кампактным. Аказалася, што нашыя суседзі прадалі нацыянальную авіякампанію, і цяпер сюды і адсюль лётаюць толькі барты замежных кампаній. Нам, натуральна, выпала ляцець рэйсам «Finnair».

* * *

Самалёт з Хельсінкі ў Вільню спазніўся на сорак мінут, і мінуты тыя былі гнятлівымі і трывожнымі: попел, выкінуты ісландскім вулканам Грымсвотан, дапяў паветранай прасторы па-над Скандынавіяй.

На табло высвечвалася, што закрытыя аэрапорты Гамбурга і Дзюсельдорфа, але нас уратавала, мабыць, тое, што шлейф пайшоў на паўднёвы захад.

* * *

Калі думаў пра Фінляндыю, дык мімаволі згадваў месяцы, праведзеныя ў Карэліі.



Фота Уладзіміра Сіўчыкава і з архіва Уладзіміра Сіўчыкава

Уладзімір Сіўчыкаў каля старога корпуса гарадской бібліятэкі Турку, 26 траўня 2011 года

Тую колішнюю фінскую ляні (губерню) Савецкі Саюз прысабечыў пасля другой сусветнай вайны.

Цяпер Фінляндская Рэспубліка мае плошчу 338 тысяч квадратных кіламетраў — на трациню большую за тэрыторыю Беларусі. Насельніцтва амаль удвая меншае, чым у нас — болей за пяць мільёнаў чалавек.

Прыйшлі фіны на Скандынаўскую паўвыспу напачатку нашай эры ажно з Паволжа і выцеснілі тубыльцаў-саамаў. Затое і самі спазналі ўварванні вікінгаў, а з XVII стагоддзя і шасцісотгадовае панаванне шведаў. Апошніх у складзе насельніцтва сёння не больш за сем адсоткаў, але шведская мова ёсць другою дзяржаўнаю!

Напачатку XIX стагоддзя Фінляндыя апынулася ў турме народаў, у Расійскай імперыі, але пад сімпатычнай нам назваю — Вялікае княства Фінляндскае. Праз сто гадоў, у 1917-м, фіны, пераважна лютэране, зрабілі самі сабе надзвычайны калядны падарунак: здабылі незалежнасць! А ў войнах 1939—1944 гадоў ваявалі ўмела — згадаць хаця б знакамітую лінію Манергейма (яна была сапраўднай і эфектыўнай, у адрозненне ад міфічнай лініі Сталіна), а таксама дзёрзкія лыжныя рэйды!

Багатыя фіны на лясы і асабліва на азёры, якіх налічваецца каля шасцідзесяці тысячаў! Ну а беларусу цікава будзе дазнацца, што сама назва «Суомі» азначае «краіна балот»!

Але сёння фіны — зусім не балотныя людзі. Па ўзроўні жыцця і па якасці адукацыі нацыя гэтая сярод лідэраў ва ўсім свеце.

І як не згадаць, што зусім яшчэ нядаўна давала яна прытулак Васілю Быкаву і Уладзіміру Някляеву ў цяжкія ім часіны, што менавіта сюды адрасаваліся вершаваныя «Лісты ў Хельсінкі» Рыгора Барадуліна.

* * *

На вялікі жаль, у аэрапорце Вантаа горада Хельсінкі (пашведску Helsingfors) не перастрэліся з Якубам Лапаткам, «нашым чалавекам у Гаване», бо мусілі прайсці ў транзітную залу. Якуб жыве і рупліва працуе ў фінскай сталіцы гадоў дваццаць і настолькі засвоіў фінскую мову, што напісаў падручнік па яе граматыцы па-беларуску. Шкада, але рукапіс той покуль што не дапяў да друкарскага варштата. Гэтаксама як і подзвіг (мы найчасцей баімся высокіх ацэнак сучаснікам-суайчыннікам!) ягонага жыцця — пераклад ці не ўсіх рунаў эпаса «Калевала», складзенага ў 1835 годзе Эліясам Лёнратам.

Цешу сябе думкаю, што калінебудзь патраплю і ў сам горад, заснаваны ў 1550 годзе шведскім каралём Густавам І Ваза, як процівагу паспяховаму Талліну. Спадзяюся разам з Якубам агледзець музей-крэпасць Суаменліна (Свеаборг), наведаць мастацкі музей Атэнэўм, скансен Сеўрасары, пабываць на Алімпійскім стадыёне, завітаць у адзін з буйных балтыйскіх партоў.

І, можа, абмінуць сабор і помнік расійскаму цару Аляксандру І на аднайменнай плошчы. Гэткае ўшанаванне заваёўніка Фінляндыі нагадвае музей і помнікі на Кобрыншчыне, якую цёзка таго цара Сувораў атрымаў ад царыцы за тое, што тапіў у крыві вызвольныя паўстанні нашых продкаў.

* * *

Зручна было вылятаць з таго самага, 2-га тэрмінала, дый сам палёт доўжыўся з паўгадзіны — набралі вышыню і ледзь не адразу пайшлі на зніжэнне і пасадку.

У невялічкім аэрапорце колішняй сталіцы Фінляндыі агледзелі білборды: Турку (Abo) — сёлетняя культурніцкая сталіца Еўропы. Парадавала тое, што культура тут успрымаецца не па рэштковым прынцыпе. Прынамсі, не пасля спорту — не было аніякага ажыятажу з таго, што фіны толькі што, другі раз у гісторыі выйгралі чэмпіянат свету па хакеі. Нашы суайчыннікі выступілі ў Славакіі ганебна, ледзь-ледзь утрымаліся ў найвышэйшым дывізіёне, затое ў нас на кожным кроку рэклама чэмпіянату, які праз тры гады адбудзецца (і невядома яшчэ, ці напраўду адбудзецца!) у Беларусі.

* * *

За 24,1 еўра (трэба звыкацца са скандынаўскімі коштамі!) таксоўка давезла да гатэля з даўжэзнай, ажно ў пяць словаў назваю — «Radisson Blu Marina Palace Hotel»! Затое нумар адпавядае гэтай прэтэнцыёзнасці сваім камфортам. Зручны пісьмовы стол, шафа на адзенне, канапа з падушкамі, шыкоўны двухмесны ложак пад люстэркам ледзь не на ўсю сцяну, лядоўня з міні-барам. Пасля доўгае дарогі з асаблівай удзячнасцю ацэньваеш ванны пакой з мноствам ручнікоў, махровымі халатамі, фенам, шампунямі ды іншай касметыкай...



Краявід з гарадскім тэатрам

***

Гэтым часам тут фактычна белыя ночы: кладзешся адпачываць амаль апоўначы — яшчэ светла, падымаешся ўначы — гэтаксама!

Сняданак (breakfast) у «Рэдысане» (як зазвычай у еўрапейскіх гатэлях так званы шведскі стол) пачынаецца ў 6.30. Гэта значыць, што ў 7.00 сыты пастаялец можа выпраўіцца па сваіх справах, сесці за працоўны стол або за кампутар.

Прыемна было пабачыць на сняданні, а потым і ў канферэнцзале знаёмых са Шведскага саюза пісьменнікаў: пісьменніцу і перакладчыцу Яніну Арлоў, крытыка і юрыдычнага кансультанта Торб'ёрна Острама, сакратара па міжнародных кантактах Бруту Олафса. Трэба было б пазайздросціць скандынавам белай зайздрасцю — летась у Швецыі падатак на падвышаную вартасць знізілі кнігавыдаўцам з дванаццаці да шасці адсоткаў! Да таго ж патаннела (нават не верыцца, бо калі ў нас штосьці таннела?!) кампутарнае абсталяванне і нават папера. У выніку знізіўся сабекошт кніжнай прадукцыі, а продажы выраслі ўдвая!!!

***

Зарэгістраваліся на шостым «Forum MARE NOSTRUM» Еўрапейскай пісьменніцкай рады («The European Writers' Counsil»), паўнапраўным членам якой ужо тры гады як з'яўляецца наш Саюз беларускіх пісьменнікаў), атрымалі тэчкі з працоўнымі дакументамі форуму.

Шмат што не магло не ўражваць. Да прыкладу, сябрамі Пісьменніцкай рады ёсць больш за 90 асацыяцый, саюзаў і аб'яднанняў Еўропы. На форуме былі прадстаўлены 23 краіны, прычым некаторыя з іх некалькімі арганізацыямі, а Нарвегія ажно пяццю!

Але хацелася б пабачыць на форуме як ганаровага госця каганебудзь з мега-зорак еўрапейскай мастацкай літаратуры. Скажам, італьянца Умберта Эка.

Следам за намі (Union of Belarusian Writers) — UBW (Belarus) сталі ў спісе балгары (Union of Bulgarian Writers) — UBW (BU), і творчыя суполкі нашыя часткова супадалі ў абрэвіятурах.

Шкада, што не прыслалі свае дэлегацыі латышы, палякі, харваты. Затое туркі, якія маюць у Еўропе ўсяго толькі тры адсоткі сваёй тэрыторыі, ужо былі прадстаўленыя суполкай Turkiye Yazarlar Sendiikasi.

І якіх толькі, аказваецца, ні бывае творчых саюзаў! Ёсць Фінская асацыяцыя пісьменнікаў немастацкай (non-fiction) літаратуры, ёсць Таварыства шведскіх аўтараў у Фінляндыі, ёсць Аўстрыйская асацыяцыя мастацкай літаратуры, ёсць нават пры адным з творчых саюзаў аддзяленне перакладчыкаў субтытраў! Некаторыя суполкі аб'ядноўваюць дзясяткі чальцоў, а асацыяцыя, што бароніць у Вялікай Брытаніі аўтарскія правы творцаў, налічвае больш за пяцьдзясят тысячаў (!) сяброў (праўда, сярод іх не толькі літаратары, але і музыкі, кампазітары, мастакі, дызайнеры...).

Паводле праграмы былі і прывітальны адрас Прэзідэнта Рады Пір'ё Хіідзенмаа (Pirjo Hiidenmaa), і некалькі дакладаў («Мастацтва чытаць», «Ці любіце вы чытаць кнігі?», «Пераклады і субтытры», «Літаратура ў еўрапейскіх школах: хто чытае, што і як?»), і відэапрывітанні дэпутатаў Еўрапарламента, і франкамоўная, з перакладам на ангельскую, дыскусія, прысвечаная праблемам цэнзуры і праваабарончым пытанням, падрыхтаваная разам з міжнародным ПЭН-клубам, і кулуарныя абмены думкамі і ўражаннямі.



Уладзімір Сіўчыкаў і Яніна Арлоў. Турку, 26 траўня 2011 года

***

Пад канец дня ўдзельнікаў Форума запрасілі агледзець гарадскую бібліятэку.

...Калісь Таццяна Рошчына, цяперашняя супрацоўніца навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства нашай Нацыянальнай бібліятэкі, расказвала, што ў Турку патрапіла шмат беларускіх кніг. Былі яны вывезены ў сталіцу Расійскай імперыі пасля войнаў і задушэнняў нашых вызвольных паўстанняў, а ў тым ліку і ў 1812 годзе генералам Тормасавым з Нясвіжскага збору Даміініка Радзівіла. У 1827 годзе ў публічнай бібліятэцы ў Турку надарыўся грандыёзны пажар, які знішчыў шмат сховішчаў. Каб аднавіць тамтэйшыя фонды, сотні тамоў скіравалі туды і з Піцера. Найперш гэта былі кнігі, надрукаваныя лацінкаю. Мабыць, расійскія бібліёграфы лічылі іх малакаштоўнымі або непатрэбнымі. Найхутчэй, у тагачасным Піцеры не знайшлося ахвотнікаў разбірацца, на якой мове яны створаныя, — на беларускай, на польскай або на латыні.

Спытаўся я ў спецыяліста па інфармацыі Гунара Хогнаса (Gunnar Hognas), які праводзіў экскурсію, ці чуў ён што-небудзь пра тыя фаліянты. Хлопец хіба што ветліва паабяцаў дазнацца і папрасіў пакінуць яму візітку. Колькі іх, візітак, было раздадзена ў спадзяванні, што хаця б некаторыя з іх «спрацуюць», дапамогуць завязаць карысныя грамадскія і асабістыя кантакты...

Разам з кардонным прамакутнічкам перадаў у бібліятэку некалькі тамоў, што прывёз з сабою з Менску. Не бачыў паліц з беларускімі кнігамі, хаця агледзеў у адной з залаў стэлажы з кнігамі ўкраінскімі, сербскімі, харвацкімі...

Яшчэ некалькі тамоў уручыў Яніне Арлоў. Разам са Змітром Плаксам, які пачаў даваць ёй урокі беларускай мовы, яна лепш за каго іншага размяркуе іх у фонды Шведскага інстытута, у публічныя ці ўніверсітэцкія бібліятэкі.

***

Пасля сціплай вячэры ад імя гарадскіх уладаў у кавярні «Sirius», што месціцца ў двары бібліятэкі, некаторыя дэлегаты выправіліся на вечаровую шпацыроўку.

У Фінляндыі, можна сказаць, паўсухі закон: спіртное каштуе неверагодна дорага. Але тыя, каго камандзіравалі (разам з крэдытнымі карткамі) фірмы, маглі дазволіць сабе наведацца ў пабы. Тым болей, што некаторыя з іх досыць арыгінальныя. «Банк», «Школа», «Аптэка» аздобленыя ў адпаведных стылістыках, з арыгінальным антуражам. У «Аптэцы» падаюць порцыю віскі, а да яе — лыжачку, якой наведвальнік мусіць уліць тры кроплі дыстыляванай вады, каб развесці напой. Незразумела толькі, чаму лыжачку? Няўжо забыліся на піпеткі?!

***

На другі дзень, пахмурны, а не сонечны як учарашні, праходзіла Генеральнае пасяджанне Еўрапейскай пісьменніцкай рады. Да першага перапынку (Coffee Break) было адкрыццё і прывітанне Прэзідэнта, кансультацыі па фінансавай сітуацыі, абмеркаванне бюджэту на перспектыву, прапановы па літаратурнай прэміі, ратыфікацыя Асацыяцыі турэцкіх аўтараў (Turkish Autors Association), якая налічвае 1200 сяброў у пяцідзесяці гарадах. На жаль, прайшло рашэнне ўдвая павялічыць сяброўскія ўнёскі чальцоў Рады, бо праз гэта некаторыя асацыяцыі, засведчыў літовец Ліўтаўрас Дагецис (Liutauras Degecis), могуць прыпыніць свае сяброўства.

Пераабранне прэзідэнта прайшло, на жаль, на безальтэрнатыўнай аснове.

Затое выбары віцэ-прэзідэнтаў адбыліся цікавей. Імі сталіся немка Анна Дзюнебер (Anna Dunnebier) і француз Сільвестар Кланcі (Sylvestr Clancier).

Сталымі сябрамі праўлення былі абраныя фін Хану Ніклэндэр (Hannu Niklander), англічанін Нік Яп (Nick Yapp), швед Торб'ёрн Острам (Thorbjorn Ostrom) і венгр Іштван Турчы (Istvan Turczi).

А вось па абедзе (Lanch) нашай беларускай дэлегацыі давялося працаваць вельмі напружана. Юлія Цімафеева энергічна, у добрым тэмпе зачытала паведамленне «Дзейнасць пісьменніцкай арганізацыі пры абмежаванні свабоды».

Пры спрыянні Генеральнага сакратара пісьменніцкай рады Мірыям Дзіёкарэц (Myriam Diocaretz) удалося падрыхтаваць, агучыць і паставіць на галасаванне зварот да беларускіх уладаў з нагоды пераследу пісьменнікаў у Рэспубліцы Беларусь. Прыемна ўзрушыла тое, што дэлегаты падтрымалі гэты зварот аднадушным галасаваннем, а потым віталі апладысментамі. Больш за тое, пераслалі яго факсам уплывоваму дэпутату Хэйдзі Хаўтала (Heidi Hautala), якая ачольвае камітэт па правах чалавека, каб разгалошвала і лабіравала нашыя турботы ў Еўрапарламенце. Часам здаецца, што падобныя адозвы анічога не даюць, але вопыт сведчыць, што многія еўрапейцы зусім мала ведаюць пра сітуацыю ў Беларусі.

Часам сімпозіума ўдалося абгаварыць некалькі перспектыўных праектаў, хаця, вядома, зусім не абавязкова, што яны здзейсняцца...

***

Сярод словаў, якія асацыююцца з Фінляндыяй, мабыць, у шэрагу першых стаяць «саўна» і «рыбалка». На жаль, гэтым разам не ўдалося зведаць аўтэнтыкі.

Шкада таксама, што на культурніцкім кангрэсе не знайшлося ні сродкаў, ні часу наладзіць хаця б сціплую экскурсію па Турку і наваколлях сёлетняй культурніцкай сталіцы Еўропы, якая згадваецца ў гістарычных дакументах з 1229 года.

А ў горадзе на чвэрць мільёна жыхароў ёсць замак і сабор XIII стагоддзя, грэка-каталіцкая (!) царква, фінскі і шведскі ўніверсітэты, а таксама музеі: гістарычны і мастацкі, народных промыслаў і рамёстваў, самага вядомага фінскага кампазітара Яна Сібеліўса. Кафедральны сабор лічыцца нацыянальным свяцілішчам і з'яўляецца цэнтрам лютэранскай царквы Фінляндыі, а біскуп Турку яе ачольвае. Цікава было б наведаць і родавае памесце Манергеймаў Лоўхісаары. Замак уяўляе сабою досыць рэдкую ў Фінляндыі палацавую архітэктуру і вядомы найперш як родны дом ці не самага знакамітага фіна, царскага генерала і адзінага маршала Фінляндыі Карла Густава Эміля Манергейма. Урэшце, працавала на той час у горадзе і выстава амерыканскага авангардыста Эндзі Уорхала!

Даводзілася самастойна спрабаваць ухапіць хоць што-небудзь. Дойлідства тут падалося пераважна мінімалістычным, ашчадным. А вось стыль рэстаўрацыі можна параўнаць з сённяшнім беларускім. Рэстаўраваць ашчадна, з навуковым падыходам вельмі дорага. Таму старое тут нярэдка разбураюць і будуюць нанова. Але і гэта часам не ўратоўвае. У 1970 годзе збудавалі былі нанова мост, а ён праз трыццаць гадоў... патануў.

Але ж дазнавацца пра гарадскія гісторыі і анекдоты часу не ставала — выпраўляцца ў зваротны шлях мусілі ў чатыры гадзіны ночы.

***

У аэрапорце Хельсінкаў у крамах сістэмы «Duty Free» на тавары выстаўлена па дзве цаны. І абедзве ў еўра. Спачатку быў падумаў, што цэны розныя для грамадзянаў Еўразвязу і для ўсіх астатніх. А потым прыгледзеўся: зніжка адсоткаў у 20-25 даецца кожнаму, але пры ўмове, што пасажыр вывезе тавар па-за межы Еўразвязу. Каб пацвердзіць гэта, трэба было паказаць пры аплаце квіткі на самалёт. Нашы, на жаль, былі толькі да Вільні.

Краіны Еўропы падтрымліваюць такім чынам, стымулююць свайго вытворцу. Кітай заваліў таннімі таварамі паўсвету.

Затое ў нас — скрозь забароны дый абмежаванні!

***

У Віленскім аэрапорце нам не выдалі багаж, і такое надарылася са мною ўпершыню ў жыцці. Але трэба быць аптымістам — самі даляцелі ўдала.

Прыйшоў багаж праз суткі, прычым прыйшоў праз Варшаву! Мусіў з гэтае нагоды два дні запар наведваць аэрапорт «Мінск-2» (нібыта нельга было даць яму выразнае, а не безаблічнае найменне!). Гутаркі з мытнікамі цяжка было б вызначыць як прыемныя: глядзелі з падазрэннем, бо найчасцей практыкуюць службоўцы прынцып «прэзумпцыі вінаватасці».

Але гэта ўжо іншая, зусім не фінская гісторыя, і таму пра яе іншым разам...

***

На маім стале ляжыць падстаўка пад кубак з гарачым пітвом з надпісам «Finland—Lapland» — саам імчыць па тундры на алені, запрэжаным у лёгкія нарты.

З раніцы запараваю ў медное турцы набытую ў Турку каву, з прыемнасцю згадваю краіну Суомі і тамтэйшыя пісьменніцкія сумоўі.

**Апошнія дні траўня — пачатак чэрвеня 2011 года.**

**Фота Уладзіміра Сіўчыкава і з архіва аўтара**

▸ МЕРКАВАННЕ

# ЖОРСТКАЯ СПІРАЛЬ,
## АБО РОЗДУМ ПРА БЕЛАРУСКУЮ ТУСОЎКУ

Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ

**Слова «тусоўка» я не вельмі люблю. Па мне лепш «грамада», «гурт», «кампанія». Ды і сам я — чалавек не тусовачны, і мяне заўсёды здзіўлялі тыя, хто за адзін вечар могуць аббегаць некалькі мерапрыемстваў і перагаварыць з дзясяткамі людзей. Прычым часта без пэўнай мэты. І усё ж хачу пагаварыць менавіта пра тусоўку, дакладней, пра нашу творчую пісьменніцкую тусоўку, якая сёння, на мой погляд хоць і перажывае не самыя лепшыя часы, але мае новы гістарычны шанц.**


Фота www.t-styl.info

Сёння мы гаворым самі пра сябе рэдка, а калі і гаворым, то, у асноўным, толькі тады, калі хапаем адзін другога за чубы. І тады трымайцеся, заклятыя сябры, бо ў такія моманты мы пачынаем «выкрываць» адно другога без усялякіх тармазоў. У «адкрытых» і «закрытых» лістах, не выбіраючы выразаў і СМІ, не зважаючы на магчымыя наступствы «выкрыванняў», мы не стамляемся тузаць, кляймíць калегаў па творчым цэху з розных нагодаў. Апантана б'юцца паміж сабой розныя пісьменніцкія саюзы, валтузяцца між сабой прадстаўнікі розных поглядаў унутры іх і т.д. і т.п. Словам, гобсаўская вайна ўсіх супраць усіх. Упэўнены, што знакаміты выраз «Бі сваіх, каб чужыя баяліся!» — нашага, бульбашскага, паходжання. Эх, каб гэтую нашу бескампраміснасць можна было накіраваць ў стваральны бок!

Можа, варта было б ужо і спыніцца?.. Бо ці так ужо нас шмат у гэтым свеце — беларускіх творцаў слова? Насамрэч творцаў, а не сябраў саюзаў? Ці так шмат нас, аднадумцаў у галоўным — у шчырай любові да сваёй Радзімы, у адданасці роднай мове, якую «здаваць» нельга ні пры якіх абставінах, бо яна якраз і ёсць самым важкім складнікам нашай нацыянальнай адметнасці, нашай культуры. Зразумела, што і нашай нацыянальнай дзяржавы.

А ці шмат сёння ўвогуле людзей, з якімі магчыма хаця б проста пагаварыць па-беларуску? Мяркую, што многія з нас не раз адчувалі ў жыцці гэткі «асадны», «рэзервацыйны» комплекс, калі за дзень ні аднаго роднага слоўца не пачуеш! А часам з-за сваёй беларускасці нават і на непрыемнасці нарываешся. У такіх выпадках не раз пераконваўся, што сваё трэба абавязкова адстойваць. Мы ж абараняем у выпадку якой-небудзь небяспекі сваіх родных і блізкіх...

У свой час, працуючы ў часопісе «Беларусь», зайшоў па справе да аднаго ваеннага начальніка. У адказ на маю беларускую мову ён строга спыніў мяне: «Говорите на нормальном языке!». «А, — цвёрдым голасам кажу яму, — вы служыце гэтай краіне і лічыце адну з яе дзяржаўных моваў ненармальнай?! Вельмі цікавая сітуацыя! Трэба пра гэта далажыць вашаму міністру!» Зніякавеў адразу начальнік, пачаў даваць задні ход: «Да что вы, что вы!... Я же совсем не против!» і г.д

Але галоўнае ў гэтай сітуацыі — не забываць вядомае біблейскае «Мы тут не для таго, каб праклінаць цемру, а запаліць ліхтары». Нашыя звыклыя песні-жальбы пра ўціск нашай мовы — малаэфектыўная рэч, бо сітуацыя наша шмат у чым «джунглевая» — працуюць найперш не прававі́я нормы, а законы джунгляў, дзе прызнаюць толькі сілу і слабейшага проста спажываюць на абед. Ну а раз так, то няўжо ў нас яе ўжо зусім няма? Зразумела, што я тут маю на ўвазе не пудовыя кулакі, а найперш сілу духоўную.

Але вернемся да нашай тусоўкі. Паўтаруся, я чалавек зусім не тусовачны, але ў апошнія гады зрузумеў, што калі творца па нейкіх прычынах пачынае дыстанцавацца ад блізкіх па духу людзей, то тым моцна сябе абкрадвае. І споўдаюцца па вуліцах самотныя, непрыкаяныя, часта нікому не патрэбныя, творцы, ігнаруючы з прычыны розных крыўдаў і амбіцый сваіх братоў па пяры. Не буду казаць за ўсю Адэсу, але я сам даўно ўжо адчуў, што нідзе мне не бывае так добра, як са сваімі. Прычым з такімі, якія яны ёсць, з усімі іх прыбамбасамі і фокусамі.

На пісьменніцкіх вечарынах, якія сёння, на жаль, не такая частая з'ява, слухаючы выступы калегаў-творцаў, я заўсёды атрымліваю сапраўднае задавальненне. Такія выступы — гэта заўсёды маленькі творчы шэдэўр, выкананы па ўсіх законах жанру: завязка, кульмінацыя з абавязковай канстатацыяй звышзадачы, развязка. Куды там якому-небудзь тэатру!.. Кожны з гэтых людзей сам ёсць тэатрам... Хаця, часам — і эстрадай, і цыркам...

Быў, да прыкладу, нядаўна на прэзентацыі адной кнігі, складзенай з артыкулаў беларускіх пісьменнікаў пра свае мясціны, надрукаваных у свой час у адной вядомай газеце. Рэалізавала ідэю вядомая беларуская пісьменніца і супрацоўніца тае газеты Людміла Рублеўская. Сведчу, кніга атрымалася добрая, шкада толькі, што выйшла не ў роднай мове. Кожны з яе аўтараў (сярод іх знайшлося месца і мне), згадваючы пра самае дарагое са свайго мінулага, не пашкадаваў для гэтага сэрца. Пад вокладкай згаданай кнігі неяк зусім бесканфліктна ўжыліся розныя вядомыя прадстаўнікі непрымірымых у жыцці творчых саюзаў, людзі розных поглядаў. І ў сваіх выступах на прэзентацыі яны гаварылі не пра заганную лінію апанентаў, а пра адлюстраваную ў кнізе ў абліччы сваёй малой радзімы сваю Беларусь...

Так, у кожнага яна была свая, эксклюзіўная, родная, вельмі жывая і цёплая. Але над усімі гэтымі малымі «Беларусямі» выразна праглядвалася і нашая агульная, вялікая Радзіма.

І яшчэ раз падзівіўся магутнаму патэнцыялу калегаў. Імі б, як пісаў Маякоўскі, — ды цвікі забіваць! Вядома ж цвікі, што мацуюць будыніну пад назвай Беларусь. А пакуль што той-сёй і тыя апошнія цвікі, што яе трымаюць, наравіць павыдзіраць... Прычым, калі няма цвікадзёра, дык хоць зубамі!..

Напісаў апошнюю фразу і збянтэжыўся, ці не занадта я строга. Бо і пісьменнікі — людзі, з усімі чалавечымі слабасцямі і вітальнымі патрэбамі. Ды і сказана — «Не судзі...» Але цяжка маўчаць, калі сёння на тых вачах згаданая будыніна Беларусь пачала пагрозліва хістацца. А мы замест таго, каб духоўна ўмацоўваць яе, працягваем секчы сук, на якім сядзім. А потым дзівімся, што ў нас фінансава-эканамічны крызіс...

Наш брат-пісьменнік наўрад ці лічыць сябе віноўнікам гэтага крызіса. Гэты рамантычны народ, зразумела, пераводзіць «стрэлкі» на людзей рэальных, прыземленых: палітыкаў і эканамістаў. Маўляў, гэта яны наламалі дроў, мы тут не пры чым.

Спрачацца быццам бы цяжка, бо палітыкі з эканамістамі і насамрэч добра пашчыравалі, каб дзяржаву заліхаманіла, як асінавы ліст. Сёння яны шукаюць прычыны імклівага абвалу і знаходзяць іх у няправільнай стратэгіі, неашчаднасці, нядбайнасці і г.д. Усё гэта, мусіць, мае месца. Ну не пашчасціла беларусам на эканамічных геніяў, якія б павялі нас жалезнай рукой да рынкавага раю! Але прычыны такога кшталту крызісаў, як сведчыць гісторыя, шмат глыбей, чым няслушная эканамічная стратэгія або тыя ці іншыя памылкі палітычных лідэраў.

Што цікава, сёння шмат хто з «дасведчаных» даводзіць, што ён, і толькі ён заўсёды прадказваў немінучы абвал усяго, што можа абваліцца. Вядома ж прадказваў, як, зрэшты, і тыя два сыны аднаго бацькі, якія заўсёды правільна прадказвалі надвор'е: адзін «лабіраваў» дождж, другі — ясны дзень! Проста тыя, хто быў за «ясны дзень», сёння маўчаць у анучку. А большасць нашых землякоў, нават ужо адчуўшы, што пачало трэсці на бездарожжы, дэманстравалі невычарпальны аптымізм. Маўляў, як-небудзь «вырулім».

«Вырулім», зразумела, бо ў сваёй доўгай цывілізацыйнай эвалюцыі не раз даказвалі, што мы трывушчыя. І калі крызіс у асобнага чалавека ў горшым выпадку заканчваецца смерцю, то для цэлага грамадства гэта малаверагодна. (Прынамсі для нашага — яшчэ не тут і не цяпер!)...

Як вядома, заснавальнікі марксізму ў свой час адкрылі для нас так званыя «базіс» і «надбудову». Добрую, быццам бы, справу зрабілі, але наўзнак перабліталі іх месцазнаходжанне — што ёсць насамрэч базіс, а што — надбудова. Вынік не прымусіў сябе чакаць. Эксперымент на 1/6 зямной сушы, дзе ўсё рабілі амаль паводле Марксавай мадэлі, стаўся, мякка кажучы, непераканальным. І пытанне пра тое, што ёсць першасным — духоўнае ці матэрыяльнае, здавалася, было знятае раз і назаўсёды.

Але, як аказалася, не назаўсёды. Менавіта мы — насельнікі Беларусі — сталі сведкамі, як базіс вярнуўся на ранейшае месца, ігнаруючы вартасць духоўнага складніка. А ў змрачнаватых лабірынтах эвалюцыі ён і ёсць праваднікóм, без яго грамадству цяжка знаходзіць шлях праз «міннае поле» фінансавых і эканамічных фугасаў. Духоўная «падслепаватасць» вядзе проста на іх — адсюль і эканамічныя крызісы, выбухі, абвалы. Не маючы духоўных арыенціраў, праблематычна стаць раўнапраўным суб'ектам сусвету, самадастатковым народам, які не толькі на падачкі моцных спадзяецца. І гэты закон жорстка спрацоўвае ва ўсім свеце, незалежна ад эканамічнага стану тых ці іншых краін. Адсюль і там крызісы. Яшчэ Мікола Гусоўскі пісаў, што «Багацце духоўнае — злата дзяржавы». А што як не «злата» дастаюць з куфэркаў, калі надыходзяць цяжкія часы? Ці варта тлумачыць, што наша «злата» — гэта наша эксклюзіўная нацыянальная спадчына, — галоўнае духоўнае багацце беларусаў.

Дык ці не час і нам дастаць сваё «злата» і заткнуць пашчу крызісу? Якім чынам? Дзесьці прачытаў пра расійскую інтэлігенцыю, што яна нават і «недабітая», але тым не менш здольная ўплываць на грамадскую свядомасць. Тое ж, робячы пэўную карэкцыю на нашыя ўмовы, мае рэальную магчымасць рабіць і нашая інтэлігенцыя. А найперш яе «баявы атрад» — майстры слова. Але каб слова гэтай «тусоўкі» загучала, патрэбна ўсе нашы разбэрсаныя сілы сабраць у адзін кулак, што проста немагчыма без трывалай карпаратыўнай кансалідацыі. І тады слова творцаў у гэтай краіне перастане нарэшце быць звыклым «бляяннем ягняці» перад моцнымі гэтага свету, а цвёрдым, прынцыповым словам прадстаўнікоў сапраўднай духоўнай эліты нацыі, таксама адказнымі за яе лёс.

Нехта слушна спытае: а ці існуе ўвогуле такі алгарытм, каб сабраць некіруемую сёння творчую «тусоўку» ў адзін кулак? Гэта ж зусім нерэальна!

Рэальна, бо крэўнае ў нас ва ўсіх адно!.. Рэальна, калі для нашых творчых (як і ва ўсіх беларусаў — патэрналісцкіх!) душ знойдзецца сапраўдны «пастыр», здольны павесці за сабой і мабілізаваць на канкрэтную справу! Бо вядома, што карабель, які тоне, без капітана шанцу выплысць не мае! Рэальна, калі мы ўсе сваю пыху (гэта ж я, я — самы лепшы, самы геніяльны!) схаваем і да лепшых часоў «замарозім» свае ўнутраныя канфлікты. Рэальна, калі ў нас знойдзецца самае банальнае цярпенне і, як ні дзіўна, усё тая ж вера, без якой не з'яўляецца ў гэтым свеце нічога добрага, прыгожага і стваральнага. І, урэшце, рэальна, калі мы ўсвядомім, што больш шанцаў можа і не быць, і наступныя пакаленні проста не будуць ведаць такога слова: «беларусы».

Ёсць і іншы алгарытм. Мы працягваем цягнуць яе воз кожны ў свой бок. І тады, як сведчыць гісторыя, рана ці позна на целе Айчыны ўтвараюцца расколіны, якія паступова ператвараюцца ў бездані. То бок пачынаецца яе дзялёж. А гэта грамадзянская вайна, з якой нацыя выходзіць заўсёды знямоглая і пакалечаная. Як потым шмат часу патрэбна ёй на выздараўленне! І суседзі нас зноў пакінуць далёка ззаду. Гэта ў лепшым выпадку.

У горшым — патрапім-такі нарэшце ў даўно прагназуемыя гарачыя брацкія абдымкі, з адзінай тэрыторыяй, адзінай валютай. Цяпер ужо назаўсёды, бо гісторыя трох спробаў не дае нікому! Вось тады ўсім нашым тусоўкам — і творчым, і палітычным стане жыць «лучше» і «веселее». Бо навошта яны будуць патрэбнымі ў Адзінай і Недзялімай, дзе зусім іншыя духоўныя імператывы?

ВЕРШЫ

# ЗАЛА ІГРАВЫХ АЎТАМАТАЎ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

## Смерць у Вене...

*Я хачу быць пенсіянеркай і жыць у Вене,
ўсё жыццё выкладаючы там Буалё й
Малерба,
каб Дунай кожны Божы дзень ля мяне
струменіў,
і каб кахлю ў ваннай мне клалі дужыя сербы.*

*Мець сябровак у Грацы; ліць мужу
ў каву каньяк ці
арманьяк; не раздумваючы, Еўропа
ці не Еўропа, —
жыць у Вене шчаслівa й доўга й памерці
на трэцім акце
«Парсіфаля» на левым ці правым балконе
Штатсопа.*

## Пастанова

*З 1 ліпеня ў кожным му-ні-цы-па-лі-тэ-це
павінны ляжаць пералік правоў Паэзіі
ў свеце:
- зрабіць кар'еру ад вясковага дурня
да гарадскога вар'ята;
- колькі разоў мацюкнуцца і трапіць
праз гэта за краты;
- (на выбар) не быць зразумелай /
быць «глуповатой»;
- гандляваць натхненнем;
- натхняцца любою Музай;
- схіляцца аднолькава перад крыжом,
паўмесяцам і мезузай;
- нават у планетарый хадзіць
са сваімі зорамі;
- пры кожнай зручнай нагодзе прысягаць
над разорамі;
- не сядзець на месцы й, мяняючы гарады,
хапаць кіроўцу за рукі, калі той вязе
не туды, —
хай гэта й створыць аварыйную
абстаноўку на трасе,
хай і будуць пляткарыць потым,
што Паэзія напілася.*

## Міратворчасць

*Дрэнна, калі міратворца страляе ў паветра.
Добра, калі міратворца стварае міра.
Проста з паветра, поўную блакітную каску,
на патрэбы як простых вернікаў,
так і кліру.*

*Бо калі міратворца спраўна стварае міра —
то тады цудатворца спраўна стварае цуды,
і паводле пляну ўсё: плача Божая Маці,
і цалуе Юда, і пасміхаецца Буда.*

## Expobel mon amour

*1.
А на выездзе з гораду цемра была,
быў на выездзе з гораду корак,
і ранкі рубінавага святла
душыліся на выездзе з гораду.
Як заўсёды ў пятніцу, дзеці сяла
выязджалі з гораду ў морак.
У заторы было немагчыма прайсці
між «фольксвагенаў», «шкодаў» і «бэхаў»;
у той вечар — і ўвогуле па жыцці —
ў гэты горад ніхто не ўехаў.*

*2.
На каўчэг бы іх не пусцілі, гэтую пару.
Яна пілавала яго, заглушаючы зліву й
трафік:
— Гэты хрэн зачыняе вокны, а ўсім — пофіг!
Скажы яму, ты ж мужчына,не стой,
як пуфік!
Грэбаны МАЗ, мы тут задыхнемся нафіг!*

*І праўда: адзін з пасажыраў (а дождж ужо
ліў сцяною)
задрайваў аўтобусу люкі, нібы зашываў раны.
Некаторым з нас ён нагадаў Ноя
тым, што быў п'яны.*



*3.
Купіла сабе шлёпкі сінія,
актуальныя ў гэтым годзе.
О «Экспабел»! Сэрца Сірыі!
О слонікі твае на заходзе!*

*Дзякуй, што пасылаеш мне
бусы гэтыя і штаны,
але памятацьму да сконy
калыску сваю — Жданы,
соннае прадмесце Сайгону.*

*4.
Тэма патрыятызму раскрытая на сто
адсоткаў
у дыялогу: «Ацтойны раён» — «Я жыву там».
Гэта няблізкі свет, бо сюды не даходзіць
сотка,
затое паветра апоўначы пахне
кунжутам,*

*бо хлебзавод №2, што ў тваім двары,
усяночна дурманіць горад духмяным
кадзілам.
Што б ні напаткала цябе — канец свету
ці выбары,
мама адчыніць і запытаецца,
дзе ты хадзіла.*

## Зала ігравых аўтаматаў. Ранак

*Зала ігравых аўтаматаў, шчасная
сінекура
для прадпрымальных халопаў,
якія не дабеглі да Сечы.
Маладая бармэнка пялёсткамі
французскага манікюра
Гладзіць шэфу, што спіць, вусы і нацягвае
яму плед на плечы.*

*Бо яны тут з ночы на гэтым
кандыцыянеравым сквышы,
І з імі вось гэтыя двое, ў вачах у якіх пуста.
І, магчыма, зазвычай вочы —
люстра душы,
Але сёння для гэтых двох экран аўтамату
— люстра.*

*І магчыма, вось гэты ў касусе заб'е
бармэнку і возьме касу,
а вось гэты ў джынсусе тут, як і я, выпадкова,
але пакуль асвятляюць ім выхад
на запарожскую трасу
дзве цьмяныя лямпы і жабка, сямёрка,
падкова.*

## Зала ігравых аўтаматаў. Вечар

*Зала ігравых аўтаматаў. За сценамі зліва.
Стральцы, што выбраліся на ўік-энд
у Вялікае Княства.
Ганец у чаканні дэпешы ад Курбскага
Яну Жахліваму
Азіраецца па баках і ныркамі чуе пастку.*

*І праўда: «Бандыт!» — лезе нейкі п'яны
стралец на стойку.
Аднарукі Іцка камандуе нешта на ідыш
дачкам тром.
Ганец адступае ў кут і прымае стойку.
Зала ігравых аўтаматаў. Вечар. Пагром.*

## Зала ігравых аўтаматаў. Ноч

*Зала ігравых аўтаматаў «Агні прэрый».
Індзеец, які трымае гэты прытон
з ласкі штату.
П'яны каўбой апойвае віскі мулатку Мэры
І прымушае супольна пазбыцца шатаў.*

*Ані акцэнт іх размовы няясны мне,
Ані тое, ў імя чаго тут ліецца брага,
Але, ў прынцыпе, я разумею,
Чаму «Парламент» Манэ
Будзе аднойчы вісець у музеі Чыкага.*

## Цьмяныя месцы ТАНАХу

*Сяброўства паміж футбольнымі клубамі
варагуючых ешыботаў —
у парадку рэчаў, калі не закляніла клемы,
розныя, як розніца між тым,
хто выраўшыў быць готам,
і тым, хто — эма;*

*бо прафесійны спорт аб'ядноўвае
болей за Тору
і за Талмуд прафесійны спорт аб'ядноўвае
болей,
як аб'ядноўвае прага першых затораў
у аўташколе;*

*але для фанатаў згаданых клубаў мілей,
чым арабу Мека, —
наваляць футбольным фанатам
варожага ешыботу,
бо сценка на сценку для чалавекаў —
яно, як для чалавека —
субота.*

## Сэрца святога Сільвестра

*Ён прыцягне з гарышча пластыкавых
Мароза,
Снягурку
і рознае шкляное стар'ё.
Я захныкаю: «Навошта, Сільва?».
Ён адкажа: «Дзевушка, ё-маё!
Ялінка — эта красіва!*

*Новы год як-ніяк,
а ў цябе наперадзе яшчэ і Раство...».
Апранецца,
спусціцца,
купіць у нейкага дзеда
ялінку ля ўніверсама —
і ўжо дома павесіць туды сваё сэрца
і сэрца І... ну, таварыша свайго аднаго.
І, няхай нябачна, мае там вісіць таксама.*

## Цёця Валя

*Сёння славіцца Дзень святога...
Ты ніяк не згадаеш, якога.*

*Можа, Марціна?
Значыць, трэба смажыць гуся.*

*Можа, Губэрта?
Значыць, нельга застрэліць лася
(ну, ці іншага звера — не ў рыфму,
але з рагамі).*

*Ераніма мо? —
Біблію перакладзі, каб гасцям было
лепей відно.*

*Мо Сільвестра? —
столік журнальны шпурні праз акно,
каб не блытаўся пад тваімі даўгімі нагамі.*

***

*Ах, за жыццё маладое ці мала
ты насвяткавала?*

*Помніш, быў Мікалай,
ліў віно цераз край,
зводзіў бровы й казаў: «Варыцца!» —
і чорт леваруч
падаваў цынамон,
і анёл праваруч —
карыцу?*

*А помніш, у амбасаду Швецыі
запрашала Люцыя,
частавала печывам?*

*А помніш, як Сэбаст'ян
забягаў у цір
і ставаў пад цэль
у чаканні нечага?*

*Ці як усе святыя
закупіліся — і купацца
на фазэнду Яна,
і быў чэрвень,
была рака
і была паляна,*

*Эльм расклаў агонь,
Кацярына прынесла кола,
якім яе каталі...*

*Але ўсё. На павесцы люты,
віншуй цёцю Валю.*

***

*Што значыць «народзіны ўлетку»?
Чаго ж яе так называлі?
Купляй паштоўку і кветку —
ВІНШУЙ ЦЁЦЮ ВАЛЮ!*

*Шэфа на працы падмазалі,
з хлопцам дома пабалявалі,
цяпер — прамы абавязак:
віншуй цёцю Валю!*

*Падары ёй сэрца — махровае
чырвонае сэрца,
раскажы пра вакацыі ў Рыме,
пра смерць у Венецыі...
Ах як пекна там зараз — у Марка на
карнавале!..
Але ты ў Беларусі,
ТАМУ —
віншуй цёцю Валю!*

*Павіншуй цёцю Валю, кепская ты
пляменніца!
Павіншуй цёцю Валю, а піша яшчэ!!! —
пісьменніца!*

*Заўтра Стрэчанне.
У Сімяона пад лыжачкай ные —
пігулкі стары бярэ.
Павіншуй цёцю Валю, няўдзячная,
1чэрствая дрэнь.*

ФРЭСКІ

# ВОЧЫ ЗАСМУЧОНЫЯ

Барыс ПЯТРОВІЧ

**У Кракаве, на пляцы, слухаючы голас гістарычнае трубы, Генадзь не ўяўляў сябе ў сярэднявеччы, боназіраў за абсалютна сучаснай дзяўчынай, якая стаяла непадалёк і зусім не думала, што ён употайкі сочыць за ёю; дзяўчына была ў цёмных джынсах, якія цесна аблягалі ейныя вабныя формы, і ў кароткай ружовай сукенцы, што акрэслівала стан і давала падсветку міленькаму тварыку «пекнай паненкі», з якой прыемна было б правесці вечар у цёплай гутарцы пра лёгкі палёт душы над той мітуснёй, што завецца жыццём…**



Фота Юліі Дарашкевіч

дзяўчына слухала знакамітага кракаўскага трубача прымружыўшы вочы, нібыта і няма ў свеце лепшай музыкі за гэтую, нібыта ўпітваючы той, па вялікім рахунку не дужа меладычны, сігнал усім целам… «Полька, якая прыехала здалёк на радзіму і цешыць сябе судакрананнем з жывой легендай», — падумаў Генадзь пра яе

але — ён памыляўся, што дзяўчына нічога не заўважае вакол

яна даўно ацаніла ягоны зацікаўлены позірк і тое, што ён, як заварожаны, стаіць побач і не зводзіць вачэй не з трубача ўверсе, а з яе

таму, відаць, думаючы, што ён так і не адважыцца падысці да яе, дзяўчына раптам сама звярнулася да яго:

«пан замежнік?» — спыталася, і ён здзівіўся: па чым яна змагла гэта вызначыць: у Еўропе цяпер так перамяшалася ўсё, што знешне распазнаць чужынца практычна немагчыма…

«так», — адказаў ён, не дадаўшы больш нічога і пралічваючы варыянты: ці гэта добра, што яна ўбачыла ў ім замежніка, ці кепска?

«а адкуль вы: здалёку ці зблізу?»

«зблізку, хутчэй зблізку…»

«так я і падумала… ці не з Беларусі?»

«о! а як вы здагадаліся?» — Генадзь шчыра не стрымаў сваё пачуцці ў надзеі на прыязную гутарку ні пра што, якая можа незаўважна перарасці ў больш блізкае знаёмства

«па вачах засмучоных…»

тут ён заціх, замоўк, праглынуў язык, не знайшоўшы што сказаць, бо рыхтаваўся да лёгкага флірту, да «бла-бла-бла», а яму пра — «вочы засмучоныя…»: які можа быць фліpт з «вачыма засмучонымі»?

размова вялася, зразумела, папольску, і іх можна было прыняць за даўніх сяброў, што прызначылі на гэтым пляцы спатканне, альбо (тут ужо Генадзь цешыў сваё самалюбства) за каханкаў… ці, нарэшце, — за калегаў па працы, што сімпатызуюць адно аднаму, але, сустрэўшыся ледзь не выпадкова, радыя падоранай магчымасці пабалакаць ні пра што, «прынюхацца» з надзеяй, што гэта зможа (таксама так!) потым незаўважна перарасці ў больш блізкае знаёмства…

«але чаму пані падышла да мяне?» — урэшце не стрываў і спытаў Генадзь

«цяжка сказаць… здаецца, не маю нейкага інтарэсу надзвычайнага, проста… проста адчула родную душу…»

адказ гэты быў прыемным Генадзю, прынамсі, інтрыгоўным…

«дзіўна, але і мне так падалося, калі я пабачыў вас тут… таму і вылучыў сярод іншых… дарэчы, а вы, відаць, таксама не з Польшчы?» — апошняе ён прамовіў амаль упэўнена

«не, вы памыліліся, я адсюль, з Кракава… тут нарадзілася й жыву… а дзе вы спыніліся?»

«у гатэлі, недалёка, побач»

«калі не супраць, я вас праводжу, каб не заблукалі, незнаёмцу ў нашым горадзе лёгка заблукаць…»

зразумела, Генадзь быў не супраць, вечар гэты ў яго быў вольны, і яны пайшлі

яна, бы даўняя знаёмая, адразу ж узяла Генадзя пад руку, і яму стала трохі не па сабе ад ейнае смеласці і непасрэднасці, якую ён пакуль не хацеў назваць нахабствам…

яму яшчэ хацелася, каб яна пайшла да яго ў нумар, дзе мелася пляшачка някепскай «Крамбамбулі», і яны маглі б працягнуць іхняе знаёмства за келіхам нясумнага напою, але ён паціху пачаў ужо сумнявацца ў сваім жаданні

Генадзь любіў сам выбіраць і не любіў, калі яго выбіралі, прытым гэтак настойліва: сама падышла, спытала, набілася правесці… «але ж тут ёсць узаемнасць, — супакойваў ён сябе, — ты ж і сам вылучыў яе ў натоўпе на пляцы… дык аддайся волі лёсу і парадуйся, што шчасце само ідзе ў твае адзінокія рукі»… а ў тым, што гэта шчасце — не верыць не выпадала ні хвіліны: ён быў трошкі псіхолагам і ўмеў бачыць людзей навылёт, таму ў шчырасці гэтай дзяўчыны не сумняваўся ніколькі, а да таго ж, была яна надзіва статнаю — такой якраз, якія яму падабаліся…

адзінае, што перапыняла Генадзя — гэта яе нечаканая незвычайная шчырасць і адкрытасць: вось так падысці да абсалютна незнаёмага чалавека і пайсці з ім пад руку… ці няма ўсё ж за гэтым нейкае пэўнае мэты? альбо, прасцей, ці не прастытутка яна — звычайная самадайка, якая так лёгка «зняла» кліента? і ці не йдзе за імі ўслед ейны суцянёр?

Генадзю вельмі карцела азірнуцца, але ён не рабіў гэтага, каб не расчаравацца, бо надта ж лёгкай і нязмушанай была іхняя размова, а гаварылі яны ўжо… пра што яшчэ можна размаўляць у старым культурным мясцэ, як не пра мастацтва, і дзяўчына выявіла сябе дужа дасведчанай і цікавай суразмоўцай, асабліва што тычылася рэнесансу ў жывапісе… што ж, калі і ідзе нехта ўслед — дык хай ідзе…

«вось і гатэль», — сказала раптам дзяўчына, Генадзь ажно спыніўся рэзка: так нечакана хутка яны прыйшлі: — «вы дома… дзякуй за кампанію… да пабачэння…»

Генадзь разгубіўся… намаляваў сабе дарогай гэтакі працяг, а тут адразу — да пабачэння…

«як, вы не зойдзеце да мяне на… каву?»

«не, я не магу ісці да незнаёмага мужчыны»

«мне падалося, мы ўжо сто гадоў знаёмыя… не ведаю што, але нешта нас з вамі яднае — ці не так?»

«і я адчула… еднасць… нейкую пакуль невытлумачальную еднасць… таму і падышла да вас не думаючы, а аддаўшыся незразумеламу паневу… і, каб разабрацца ў тым, пайшла вас праводзіць…»

«ну дык якраз самы час разабрацца да канца — чаму і адкуль…» — Генадзь не настойваў, не, але яму чамусьці расхацелася вось так проста развітацца з дзяўчынай… тым болей, зноў жа ва ўсіх ейных словах, рухах і паводзінах ён адчуваў надзвычайную шчырасць… сустрэць, як кажа яна, «родную душу» і праз пяць хвілін — развітацца мо і назаўсёды… не, яму гэтага не хацелася

«вось мая візітоўка, — працягнула дзяўчына картку, — будзе час — патэлефануйце мне заўтра… і мы ўвечары спаткаемся дзе-небудзь у кавярні»

Генадзь быў рады і гэтаму

у Кракаў ён прыехаў папрацаваць у бібліятэцы мясцовага ўніверсітэта, сабраць матэрыял для доктарскай па гісторыі польска-беларускіх стасункаў менавіта ў сярэднявеччы, і быў тут упершыню; у гатэльным нумары ён расчыніў тую пляшачку, сядзеў, смакуючы піва, згадваў нечаканае знаёмства, што адбылося ў першы ж ягоны вечар у чужым горадзе, і думаў, што яно не можа быць выпадковым — нешта ж спадзвігла дзяўчыну ці не ў два разы маладзейшую за яго проста так падысці і пазнаёміцца… і чаму яшчэ да гэтага ейнага кроку ён ведаў, што так і будзе? і чаму ён цяпер не ведае, што будзе далей: ці ўбачацца яны з ёю яшчэ, бо нешта ж яе спужнула… ці не назаўжды?.. Генадзь спрабаваў зазірнуць у будучыню — і нічога там не бачыў… згадваў ейныя дзіўныя словы пра «вочы засмучоныя» і «родную душу» і не мог супакоіцца… тым болей, не мог даравацъ сабе, што не распытаў яе, а паддаўся на лёгкую размову пра мастацтва, з якой мала што запомнілася, хіба ейныя развагі пра Леанарда і нечаканы пераход да Мацiса, якога й сам ён вельмі любіў, але… але ж колькі было той размовы: пяць, ну сем хвілінаў… Генадзь думаў, што наперадзе ў іх цэлая ноч і пра ўсё яшчэ ён распытае… а цяпер вось не ведаў нават, ці пабачацца яны яшчэ…

а ўсё аказалася проста: тэлефонны званок, на які, зрэшты, Генадзь адважыўся не адразу: пяць разоў набіраў нумар і, не націскаючы выклік, скідваў яго: ці не рана яшчэ… нарэшце гудкі і — імгненны адказ: «слухам…» — і тут Генадзю дайшло, што ён не ведае — не спытаў учора — як завуць дзяўчыну, а набіраючы першы раз нумар, не прачытаў нават на картцы яе імя… дзе падзелася тая візітоўка? на бібліятэчным стале сярод кніг яе відаць не было, пэўна, засунуў недзе між старонак… Генадзь роспачна азіраў стольніцу…

маўчанне зацягвалася, і ён раптам пачуў: «гэта вы?» — што ён мог сказаць: «я…», але хто «я» — бо таксама ж не назваўся і візітоўкі нат не пакінуў ёй, расчараваны хуткім расставаннем

«гэта вы?» — зноў сказала дзяўчына, і Генадзь сказаў: «так, мы пазнаёміліся ўчора… на пляцы…»

«дзякуй, што патэлефанавалі… я чакала… і ўжо не спадзявалася… пабачымся?.. вы горад не ведаеце, таму я прыйду да вашага гатэлю… а шостай вечару не будзе позна?»

«не, ні ў якім разе… якраз цудоўна…»

«дык файна, да сустрэчы…»

і яны пайшлі ў кавярню, пра якую дзяўчына сказала, што бывае там на каве часта: ледзь не штовечар…

у кавярні было дзясятак утульных маленькіх залак, што стваралі ілюзію вашай адзіноты ў суцэльным тлуме, бо яна, зразумела, не пуставала гэтым часам, але ніхто нікому не замінаў і галасы наведнікаў зліваліся ў адзіны пчаліны гуд, які не надакучаў і нават не заўважаўся, а даваў магчымасць сканцэнтравацца на сваім

яны селі насупраць адно аднаго — вочы ў вочы — і замовілі каву, проста каву; Генадзю карцела загаварыць, але ён пакідаў гэтае права за дзяўчынай, а яна чамусьці маўчала, сядзела, паклаўшы рукі з тонкімі пальцамі піяністкі на драўляную, не засланую нічым стольніцу… і тым не менш, Генадзю было вельмі добра і спакойна тут, так, як бывае толькі дома, сярод сваіх, даўно знаёмых і вывучаных уздож і ўпоперак людзей, хоць пра гэтую дзяўчыну ён пакуль не ведаў анічога

учора ён падумаў, што яна мастачка альбо крытык-мастацтвазнаўца, настолькі тонкімі і дакладнымі былі некаторыя яе словы пра жывапіс і глыбокімі веды, а сёння падумаў, што яна музыкант альбо кампазітар, гледзячы не толькі на яе пальцы, але і на тое, што яна ўслухоўвалася цяпер у недалёкую музыку, што далятала да іхняга століка ад барнае стойкі праз шум кавярні; музыка была класічная, штосьці, а ўжо гэта Генадзь, чалавек далёкі ад музыкі, мог разабраць, нешта з Шапэна, бо гучаў раяль

яна заслухалася так, што Генадзю падумалася: забыла пра мяне; музыка скончылася, і яна, нібы ачнуўшыся, сказала: «люблю гэтую мелодыю… у ёй такая самотная восень…»

Генадзь кіўнуў, злёгку прымружыўшы вочы: файна

яму і сапраўды было файна сядзець у гэтым тлуме, глядзець на прыгожую дзяўчыну… маўчаць і думаць: хто яна? адкуль прыйшла ў маё жыццё? дзе працуе, кім працуе? відавочна, што не швачкай на швейнай фабрыцы і не сакратаркай на нейкай фірме, мо хіба бібліятэркай? ці ўсё ж яна займаецца музыкай? а мо выкладае ва ўніверсітэце.. ці школе?

прынеслі каву, маўчанне зацянулася, і Генадзь нарэшце адважыўся прамовіць:

«можна вас спытаць, — сказаў ён ледзь чутна, яна адпіла глыток і хітнула галавой: так, можна, — чым вы займаецеся ў вольны ад наведвання гэтай кавярні час?» — яму хацелася тонкасці, але яму навейвала ўся сітуацыя, а атрымалася як звычайна грубавата, бо ў лоб; ён зразумеў гэта адразу, аднак было ўжо позна: словы ляцелі з вуснаў, і Генадзь заўважыў, што расчараваў імі дзяўчыну — лепш бы ўжо маўчаў… але пытанне прагучала, і дзяўчына адказала, адказала так, каб зняць усе іншыя пытанні, што круціліся ў яго, і навесці на новыя:

«я мастачка, скончыла акадэмію, маю тут майстэрню і зарабляю тым, што выконваю нейкія дызайнерскія замовы, а ў вольны час малюю для сябе… ідучы ўчора дадому, я зразумела, чаму на пляцы падышла да вас… я працую цяпер над адной вялікай карцінай, і ваш тыпаж мне вельмі падыходзіць… я хачу вас намаляваць… калі вы не супраць і зможаце знайсці час, то я хацела б вас запрасіць да сябе ў майстэрню… — памаўчала і дадала з мілай усмешкай, нібыта апраўдваючыся: — бачыце, атрымліваецца, я чалавек дужа практычны і не раблю нічога выпадкова…»

«так, — падумаў Генадзь, — куды ўжо практычней…», — згадаўшы ейныя словы пра «родную душу», «засмучоныя вочы» і дзівячыся самому сабе, як лёгка ён патрапіў у пастку самаўпэўненых мараў — марных мараў, марамаразматычных мараў, мараў маразма-

тыка… яму ўвесь час, гледзячы на дзяўчыну, хацелася ўставіць у свае думкі слова «старога»: старога маразматыка, але ён усяляк адганяў яго, гэтае слова, каб адразу не ўстаць і не сыйсці з кавярні…

«што за карціна? я яе пабачу? не сакрэт?» — Генадзь высіліў з сябе пытанні

«эскіз хіба пакуль… карціны яшчэ няма… толькі накіды… да шасцісотгоддзя Грунвальда хачу зрабіць… сакрэту няма, але даруйце, пакуль няма й чаго паказваць… там будзе Вітаўт у цэнтры, і мне падалося, ваш твар, там, каля вежы на пляцы, калі вы слухалі трубу, вашыя вочы, асабліва вочы — я іх і цяпер бачу, мне трэба… словам, вы мне трэба на карціне… не адмоўце, не адмаўляйцеся… прашу вас…»

«вось яна, заходняя моладзь, заходнія практычныя жанчыны: ты разявіў рот на… а цябе тым часам «паімелі», скарысталі напоўніцу… — Генадзь не адказваў, маўчаў, назіраючы, як дзяўчына выціскае з сябе нібыта няўпэўненасць ці няпэўнасць, і разумеючы, што ўсё яна даўно ўжо пралічыла і ведае, — зрэшты, быць Вітаўтам на карціне, хай і не дужа вядомай мастачкі, але, магчыма, перспектыўнай, не самы горшы варыянт… Вітаўт беларус — так было, так і будзе, калі я папазірую ёй…» — Генадзь думаў, адцягваючы сваю згоду, хоць, варта прызнацца, адразу адчуў, што адмовіцца не зможа, не здалее, бо адмовіцца цяпер — азначала б развітацца з дзяўчынай назаўсёды, а яму чамусьці гэтага не хацелася

назаўтра ўвечары Генадзь быў у майстэрні Малгосі — Малгажаты — так, яны нарэшце пазнаёміліся ў кавярні, і ён даведаўся ейнае імя, якое яму падалося дужа польскім, хоць у аснове яго звычайнае еўрапейскае імя, папулярнае і на ўсходзе, і апетае не толькі Булгакавым — Маргарыта

майстэрня была адным вялікім пакоем, бязладна зачапляным, застаўленым, можна нават сказаць захламленым карцінамі, рамамі, розным іншым мастакоўскім рыштункам, заплямленым рознаколернымі фарбамі: у паўцемры падалося — нібы падсохлай крывёю… і ўвогуле першае ўражанне было, што Генадзь патрапіў у сутарэнні вампіра… але ў адным з кутоў было зладжанае ўтульнае месцейка для гасцей і гаспадыні: стаяў стол, канапа, некалькі фатэляў — тут пілася кава і гутарыліся размовы

Малгажата хацела адразу пачаць працу, ёй нецярпелася — Генадзь бачыў гэта па напружаным твары і трымценні рук — і папрасіла яго распрануцца па пояс, чаго ён не чакаў абсалютна, пагаджаючыся пазіраваць, але адмаўляцца было ўжо позна, і Генадзь мусіў падпарадкавацца, сам сабе думаючы: добра, што не зусім нагала… Малгажата патлумачыла, што ягонае сучаснае адзенне будзе ёй толькі перашкаджаць потым, бо «апрануць» ёй «Вітаўта» ўсё роўна давядзецца ў рыцарскія латы…

што ж, можа быць… Генадзь распрануўся, сеў на зэдлік, быццам на каня, і яны «паехалі»

напачатку Малгажата папрасіла Генадзя трохі памаўчаць, і ён, задумаўшыся, ледзь не заснуў на сваім кані: стома ўсіх ранейшых дзён, праседжаных у цягніках, а потым у бібліятэцы, раптам апанавала ім, думкі закалыхвалі розум, і ён на нейкі час страціў нават уяўленне, дзе знаходзіцца — сцэны паплылі… ён «спаў» з расплюшчанымі вачыма, тымі самымі «засмучонымі вачыма», якія ў першы ж дзень разгледзела ў ім мастачка



Фота www.instpol.by

трэ сказаць, яна не памылілася і была не першай, хто сказаў Генадзю пра вечны сум, што пасяліўся ў ягоных вачах: але навошта ёй Генадзеў сум для князя-пераможцы? што хоча яна тым падкрэсліць ці проста паказаць? і Генадзь міжволі ўявіў сябе Вітаўтам на кані і бітву, што шырылася перад ім

ягоныя войскі зламалі супраціўленне крыжакоў і пагналі іх перад сабою… і Генадзь падумаў, што якраз у гэты момант вочы Вітаўта сталі засмучонымі, яны не былі такімі, калі дрогнулі і прагнуліся ягоныя вої, калі стрэлы крыжакоў падалі каля ног ягонага каня, калі здавалася: яшчэ хвіліна — і ліцвіны пабягуць пад націскам нямецкіх рыцараў… такімі яны сталі толькі цяпер, калі зыход бітвы быў зразумелы, прадвырашаны — да поўнай перамогі заставаліся хвіліны…

то сум у Вітаўта, а што за вечны і непатольны смутак пасяліўся ў ім, Генадзю? з якой такой паразы ці перамогі застаўся ён? Генадзь быў удзячны Малгажаце за гэтыя хвіліны роздуму, што падарыла яна яму, бо не было ў ягоным папярэднім жыцці моманту, каб ён проста спыніўся, сеў і задумаўся — увесь час забірала нейкая патрэбная і непатрэбная мітусня, як гэта бывае ў большасці людзей — нават хвіліны нібыта волі дзенебудзь у цягніку і то займаліся кампутарам, кнігай, газетай, нейкай справай, што не паспеў дарабіць… а каб проста сесці і задумацца: як я жыву? менавіта, проста: як я жыву? без нейкіх падрабязнасцяў, дык на гэта часу не заставалася абсалютна

Малгажата малявала — рэзка, хутка, нібыта спяшаючыся, раз-пораз кідаючы на Генадзя імклівыя фатаграфічныя позіркі сваіх прыгожых, напружаных вачэй, ён хоць і заўважаў гэта нейкім бакавым зрокам, аднак не надаваў таму ўвагі: ён быў не тут, ён быў недзе там, дзе бываюць людзі ў сне, хоць ён не спаў і вочы ягоныя былі расплюшчаныя, але позірк ягоны блукаў унутры, па ўсім целе, знаходзячы там пачуцці і жаданні яшчэ да канца не асэнсаваныя, не ўсвядомленыя, але ўжо афармленыя ў існыя катэгорыі, якія яму заставалася толькі дакладна назваць, не саромеючыся самога сябе

так, ён хацеў гэтую дзяўчыну, і чым болей назіраў, між іншым нібыта, за ейнаю працай, тым далей канкрэтызавалася ягонае жаданне, ажно да таго, што, калі б ён не сядзеў цяпер, а стаяў, то можна было б тую жарсць заўважыць

яна была прыгожая ў сваёй працы — Малгажата, як прыгожымі бываюць людзі адухоўленыя, яна была пажаднаю… але ці варта апісваць Малгажату за працай, каб даць уяўленне, з чаго бралася тое Генадзева жаданне, відаць, гэта не важна, бо бывае яно не таму, што пэўная жанчына падабаецца — яно бывае звычайна з нічога… і калі праз нейкі час «чужымі» вачыма паглядзець на аб'ект твайго захаплення, то можна толькі расчаравацца ў сабе самім, але ці ж гэта галоўнае ў дадзены момант? і дзе ўзяць тыя чужыя вочы якраз тады, калі яны табе патрэбныя…

але — ці патрэбныя? навошта разбураць толькі што народжанае шчасце спаткання з цудам, пакуль цуд здаецца цудам, хоць ты і ведаеш, што цудаў у свеце няма

Генадзю захацелася пачуць голас Малгажаты, голас, які трохі псавала польская мова, прызначая для ложку — шапаткая і ласкавая, пяшчотна-эратычная менавіта ў ложку, але занадта шчымліва-шыпячая для звычайнай размовы, якая не павінна ні ў што перарасці

чаму не павінна? ды таму, што ты, Генадзь, пэўна, зацікавіў Малгажату толькі як мадэль, як звычайная натура, якой перабыло тут нямерана — дык што, з усімі спаць? гэта мужчыны-мастакі могуць дазволіць сабе такое, а ў жанчынаў… а як бывае ў жанчынаў-мастачак — ты ведаеш? зрэшты, а што: жанчыны — не самкі… што, ім таксама не хочацца ласкі… тым больш сучасныя заходнія жанчыны, якім аддацца, што шклянку вады выпіць — так, прынамсі, лічаць постсавецкія мужчыны, якія ніколі не былі на «распусным» захадзе

«у цябе ёсць мужчына… муж… сябар…» — без аніякага пераходу-падыходу спытаў Генадзь у Малгажаты

«ёсць, — адказала яна, не адрываючыся ад працы, — сябар… мы жывем з ім ужо чатыры гады — у грамадзянскім шлюбе»

«значыць, перспектываў у вас няма, — падумаў Генадзь, — і ўсё ўжо прыелася, і ніякіх абавязкаў адно перад адным… добрая схема прыдуманая невядома кім невядома і для каго, ад якой усе пакутуюць, але ніхто адмаўляцца не хоча, бо — свабода, блін… а ці ёсць у гэтым свеце нешта больш важкае за яе, свабоду?..» «ёсць!» — сказаў Генадзю ўнутраны голас, але ён прыдушыў яго ў зародку, каб не каўкаў і не псаваў настрой…

«ён цяпер у Германіі, — працягвала Малгажата, — жыве там у «Тахелесе», ведаеш? (Генадзь кіўнуў — хто ва ўсходняй Еўропе не ведае той мастакоўскі свінушнік…) нядаўна я была ў яго, але не вытрымала там і сутак — не маё гэта… вярнулася сюды — тут нават хмары не такія шэрыя і дождж не такі нудотны»

«і адзінота не такая самотная…», — Генадзь гнуў сваё

Малгажата падняла вочы на яго і, можа, упершыню ўгледзелася простым чалавечым, жаночым позіркам — Генадзя ажно скаланула і працяла навылёт: ён зразумеў раптам, якім адзінотным можа быць чалавек сярод людзей… зірнула і апусціла вочы. нічога не сказаўшы, сказаўшы тым усё…

Генадзю стала страшна — натуральна страшна: навошта ён перавёў размову на самае балючае? дзе тая лёгкасць, якой хацелася, і як перайсці цяпер ад вачэй, засмучоных адзінотай, да вачэй, засмучоных каханнем?

ён з'ехаў з Беларусі не толькі дзеля працы над доктарскай — праца гэтая магла б і пачакаць, як чакала яна ўжо некалькі гадоў — Генадзь з'ехаў яшчэ і таму, што цяжка давалася яму развітанне з ягонай першай і адзінай сям'ёй, з ягонымі дзецьмі, і, хоць гэта было і прасцей, — з каханай жанчынай, маці ягоных дзяцей, якая здрадзіла яму і сама прапанавала развод, бо не магла больш падманваць яго і жыць на двух мужчынаў… банальная гісторыя, якая тады банальная, калі яна чужая, а не твая, бо «ўсе шчаслівыя сем'і шчаслівыя па-свойму, а няшчасныя…» і гэтак далей

і таму, каб забыцца на нядаўняе мінулае, каб пазбыцца пачуццяў, што распіралі яго, бо крыўда ўсё ж жыла ў ім: не ён кінуў, а яго кінулі, здрадзілі ягонай веры і насмяяліся з яго шчырага, наіўнага даверу, растапталі ягонае каханне… — і хацеў акунуцца ў гэтую прыгоду з галавой, але, відаць, схапіўшыся за першае ж, што трапілася пад руку, за гэтую дзяўчыну, ён памыліўся ў сваіх чаканнях, бо калі сустракаюцца дзве адзіноты, вельмі рэдка бывае з таго нейкі плён

«так, не такая самотная… — прамовіла Малгажата, — я разумею, што ён ужо адтуль не вернецца да мяне, болей за тое — я ведаю гэта, хоць і не хачу пакуль сабе прызнавацца ў тым, ведаю, бо бачыла там ягонага сябра, з якім ён жыве… як жыў са мною… Божа, злітуйся, што я вярзу…» — Малгажата адклала пэндзлі і закрыла твар рукамі

у кавярні, куды яны пайшлі, бо не было сілаў больш заставацца ў змрочнай і шэрай, хоць і асветленай усімі электрычнамі лямпачкамі, майстэрні Малгажаты, маўчанне працягвалася

Генадзь не разумеў, што перашкаджала ім узяць вось цяпер і раскрыцца напоўніцу, наталіцца суперажываннем, раскрыцца адно перад адным, і тое, што яны былі з розных светаў, якраз і збліжала іх, а не аддаляла, павінна было стаць асновай шчырасці, якая была нарадзілася напачатку, але не стала…

не стала, бо нешта перашкаджала… нешта, што не выказаць словамі і не вытлумачыць нават самому сабе… Генадзь глядзеў на Малгажату насупраць, бачыў на шчацэ плямку недавыцертай фарбы, якую пакінула яна, схапіўшыся за твар рукамі, і не мог нават сказаць ёй пра гэта, хоць, магчыма, яна, гэтая плямка, магла б быць якраз той кропкай, якая вывела б нас з раптоўнага ступару, ажывіла б, рассмяшыла і стала адпраўным пунктам новых зносінаў…

«мілае дзяўчо, мілае, мілае дзяўчо — якія мы блізкія з табой і якія далёкія… як мы разумеем адно аднога, але… але нам не скінуць тых путаў, што звязваюць нас па руках і нагах і не даюць кінуцца разам у вір з галавой, бо… бо ёсць у нас яшчэ душа, якая свеціцца праз вочы засмучоныя і выдае нас…» — так думаў Генадзь, а пра што думала ў гэты час Малгажата — ён не ведае

у той вечар яны моўчкі развіталіся, і нішто, нішто не казала пра тое, што яны больш не ўбачацца

так, пры ўсім пры тым, што наперадзе ў іх было цэлае жыццё, што Генадзеў месяц у Кракаве толькі пачаўся, больш з Малгажатай яны не бачыліся, хоць ён некалькі разоў парываўся набраць ейны нумар… але адкладваў тэлефон, так і не націснуўшы на выклік… аднойчы, за колькі дзён да ад'езду, калі Генадзь стаяў ля вакна, яму падалося, што насупраць уваходу ў гатэль стаіць Малгажата… «Божа мой, — падумаў ён, — гэта яна… і, мажліва, прыйшла не першы раз… але нават калі б яна хацела ўбачыцца, дык не змагла б — бо не ведае, дзе я жыву…» — і кінуўся да выхаду, хоць адразу ж зразумеў, што знайсці яго пры патрэбе было абсалютна проста, як і яму пайсці ў майстэрню да Малгажаты…

на вуліцы, зразумела, нікога не было, і клерк з «рэцэпшэн» правёў неўразумелым позіркам мужчыну, што выбег расхрыстаны на дождж і моўчкі вяртаецца назад

Генадзь так і не ведае, ці дамалявала Малгажата сваю карціну і ці з'явіўся на ёй ён у вобразе князя Вітаўта — ды гэта і неістотна

ён ведае толькі тое, што адзінота не хвароба, але завірусаваныя ёй сэрцы — прыцягваюцца, каб хоць хвіліну пабыць разам, а потым ізноў застацца сам-насам са сваёю самотай.

БЫЛІЦА

# ПЕЦЯ

Павел ЛЯХНОВІЧ

## 1

...— Ну-у, што? — Сказаў кэп экіпажу. — Краіне патрэбны героі, а служыць прысылаюць гаўнюкоў? Што «не»? Зараз пабачым! Значыцца так! Хто не здолее хоць бы дзесяць разоў — хай аб адпачынку з выездам на радзіму не марыць!

Здарылася чарговая кампанія. Гэтым разам па фізпадрыхтоўцы. Камандзір ваенна-марскіх начовак, дзе служыў Пеця, сабраў экіпаж на верхнім юце, там у іх турнік, і прымусіў рабіць пад'ёмы пераваротам.

І ўсё. Хто два разы, хто тры, а часцей маракі віселі у безнадзейных спробах, дрыгалі нагамі і саскоквалі. Толькі Пеця — ён кожную вольную хвіліну ля гэтага турніка праводзіў, — крутануўся дзесяць разоў. Мог бы болей, але навошта? Сказана ж — дзесяць! Камандзір спачатку абзываў матросаў «ахвярамі перарывання цяжарнасці», «рэанімiраванымі выкідышамі», пасля Пеці крыху супакоіўся.

Пеця Васілевіч... Хлопец з нейкага Лагішына пад Пінскам. Пінскія балоты, Пінск... Гэта недзе ў Беларусі. Старшы матрос. Грунтоўны да немагчымасці...

— Экіпажу трэніравацца! Штодзённа! — Падвёў вынік. — Любы джы-ай (малазразумела, але гучыць!) адной левай пераб'е дзесятак такіх як вы, выбачаюся, ваяроў, умомант. За выключэннем старшага матроса Васілевіча... Радзіма спадзяецца на вас, яна забяспечвае вас усім неабходным, каб вы маглі яе абараніць, яна...(тут кэп пажаваў ніжнюю губу— і што «яна...» працягваць не стаў). Карацей: камандзіры баявых часцей! Рапарты аб заахвочванні адпачынкам — толькі праз турнік!

У гэты момант яго тузанула за язык нейкая халера:

— А хто здолее зрабіць (паўза, думаў, якую лічбу назваць, каб паставіць заведама немагчымую ўмову)... трыста пад'ёмаў пераваротам — адразу даю дзесяць сутак адпачынку... Без уліку часу на дарогу!

«Даю» было сказана занадта саманадзейна — улады заахвочваць адпачынкам кэп не меў, мог толькі хадайнічаць перад камандзірам дывізіёна.

Тым жа днём ён апынуўся ў заведванні Пеці. Мог жа трапіць, напрыклад, у штурманскую, ці там радыёрубку, або зазірнуць у машыннае аддзяленне, дык не — да Пеці ў хімпост! Камандзір карабля абавязаны «сістэматычна аглядаць жылыя і службовыя памяшканні...», а яшчэ «ўсебакова вывучаць увесь асабовы склад...» — ёсць такія сказы ў Карабельным Статуце.

— Што, галуба? — голас кэпа гранічна ласкавы і прыязны. — Паглядзім, што ў цябе тут... Ну, так сабе... Чыста... А адчыні-тка мне прыбор! А якія тут павінны быць засцерагальнікі? Га?... Мгм... Адпавядае... Ты ўяўляеш, галуба шызая, учора размеркавальны электрашчыт адчыняю, а там замест плаўкіх засцерагальнікаў — кавалкі арматуры ўстаўлены! Вось жа пі-й-яна-форта-гравіссіма! Ну я некаму развальцую, хай толькі з камандзіроўкі вернецца... А ты малойца! Хоць адзін на экіпажы не ўломак існуе... І пост у цябе ў прыстойным стане...

— Таварыш камандзір! Вы праўду сказалі сёння, што калі трыста пераваротаў, то ў адпачынак адпусціце? — Флегматычна цікавіцца Пеця.

— Ты што, сынку, гарпія твая мама! Я! Калі-небудзь ілгаў?! Эх, галуба! Разумееш, ёсць такая рэч — афіцэрскі гонар... Афіцэр сказаў — усё! Пампэ, але зробіць!

— Ага! Мне ў ваенкамаце падпалкоўнік казаў — два гады буду служыць. А насамрэч сюды запёр, за Палярнае кола, на тры. А яшчэ сваяк... — Нахабна выказвае Пеця сумненне ў існаванні афіцэрскага гонару.

— Ну, ты параўнаў — з ваенкаматаўскімі! Яшчэ б з гэтымі, катарым нават зброю не даюць... З будаўнікамі! Альбо, барані Бог, з міліцыянтамі. — Твар афіцэра сабіраецца ў грымасу крыўды.

Разважаннямі пра гонар Пецю з магістральнай думкі не сапхнуць:

— Таварыш камандзір! Я раблю-раблю тыя перавароты, але скура на далонях ад мяса адстае, балюча.

Тут камандзіра зноў тузанула за язык, і ён распавёў, як юнаком зялёным быў закаханы ў гімнастку, якія ў яе былі цвярдыя далоні, і як прыходзіў на трэніроўкі і бачыў на тых далонях скураныя накладкі. А Пеця нетаропка выцягнуў аркуш паперы, аловак і папрасіў кэпа прынцыповую схему накладак намаляваць.

Застаўшыся ў хімпасце адзін, Пеця пакапаўся ў сваёй гаспадарцы, выцягнуў халяву ад ялавага бота, дратву, шыла, іголку. Змалку быў гаспадарлівы...

А дні праз тры падлавіў камандзіра на верхняй палубе. Якраз на юце, ля турніка. І ўжо накладкі самаробныя на далонях. І — ух! Трыста разоў адным духам... І чырванеў, і мямліў зніякавелы кэп, што вось проста зараз Пецю нельга на чыгунку ды ў Сіняволкую, што трэба да камандзіра дывізіёна звяртацца, але ня зараз, а перад святамі («Ты ж, галуба, хочаш на Дзень ВМФ дадому трапіць?»). Бліжэй да Дня ВМФ ён у плешку разаб'ецца...





## 2

...Перад адпраўкай кэп на ўласныя вочы агледзеў Пецю, папалохаў трыбуналам на выпадак спазнення, зрабіў інструктаж па правілах паводзінаў, адпускны білет уручыў. На ўсялякі выпадак дзень вяртання на календары чырвоным абвёў. Мо дарэмна чырвоным — колерам небяспекі і трывогі? Мо калі б якім зялёным, то ўсё спакайней было б?

Бо надышоў «чырвоны» дзень, а замест Пеці прыйшла з Беларусі тэлеграма.

А на вячэрнім дакладзе камандзір дывізіёна Пецькам пацікавіўся, таксама кантралюе, грыб стары!

— Адпачынак прадоўжаны ў сувязі з хваробай, таварыш капітан першага ранга! На трое сутак. Ваенным камісарам. Тэлеграма сёння прыйшла. Завераная. — Бадзёра далажыў камандзір ваеннай пасудзіны.

Твар камандзіра дывізіёна з класічна-алкагалічнага, адразу злосна-ўрачысты — куткі рота ўніз, ля носа складкі, вочы выračаныя, цэдзіць праз зубы:

— Ка-пі-тан — тэ-ле-нант! З гэта-га трэ-ба па-чы-наць! Я — што? Паві-нен з вас гэ-тую інфар-ма-цыю вы-цяг-ваць?

— Я думаў, таварыш капітан першага ранга, што раз ваенны камісар...

— Ён думаў! Ты б тады думаў, як адпачынак для гэтага бабуіна выбіваў! Успомніш маё слова — хутка мы ўсім дывізіёнам будзем за вашым экіпажам дзярмо раз-гра-баць!

Разышоўся, корч. Лепш не пярэчыць.

— Так точна!

— Што — «так точна», гідрант-тваю...?!

— Вінаваты, таварыш камдзіў!

Любіць дывізіённы, калі «камдзівам» клічуць, як камандзіра дывізіі суседзяў, контр-адмірала. Адмякае. Твар аплывае, складкі, вочы, рот — зноў алкаш-класік.

— Вінаватых б'юць. Кожны дзень пра гэтага... як яго...

— Васілевіч, таварыш камдзіў!

— ...Бульбаша гэтага, дакладваць!

Праз колькі дзён... Думаеце — Пеця вярнуўся? Тэлеграма! «Адпачынак... на тры дні... сувязі хваробай». Заверана ваенным камісарам.

Яшчэ праз тры — зноў тэлеграма...

— Што я казаў! «Лепшы на экіпажы! Каб усе былі такія!» — Дражніць камандзір дывізіёна. — Н-ну, падла! Едзь, разграбай! Караблём хай памочнік пакамандуе. Па-ціхаму. Нам яшчэ тут пракурорскіх толькі не хапала! І — бліскавіцай!...

...У Лагішынскай бальніцы, дзе паводле тэлеграмаў павінен быў паміраць Пеця, пра ягоную хваробу не чулі. Але ж і хутка тут інфармацыя распаўсюджваецца! Не паспеў скончыць гутарку з доктаркай, як уварвалася распараная кабета:

— Я маці Пятра Васілевіча!

— Ну, і дзе ён? Чым гэта ён так хварэе, што ў войска нельга, а ў бальніцы не ведаюць?

— Ён дома. Запаленне лёгкіх! — Выпаліла кабета і зрабіла страшныя вочы ў бок доктаркі.

— А вы дазволіце мне з ім сустрэцца? —І на ўсялякі выпадак дадаў: — Ці мне ўчастковага шукаць, каб да вас трапіць? Вы ж павінны разумець — справа можа дайсці да ваеннага трыбуналу... (Цьфу, толькі б не накаркаць!)

— Не-не! Тут не далёка. Запрашаю! — І па дарозе нешта тарахцела, зазіраючы ў вочы, ды афіцэр не слухаў, перабываў у астрале, абдумваў — што рабіць далей, як выкруціцца, не наклікаўшы на сябе, на карабель, на дывізіён непрыемнасцяў. І вырашыў узяць аб Пеціным запаленні медыцынскую даведку, і з ёю назад. А як Пеця вычухаецца з хваробы, дык прыедзе сам. Нейкія сумненні крыху непакоілі з-за відавочнага хвалявання Пеціной матулі, але ж толькі што было сказана — ён дома, хворы.

Хрэна лысага ён дома! Гэта ж трэба так нахабна лгаць! У хаце кабета замітусілася, пачала накрываць на стол, а да пасланніка Поўначы выйшаў мужчына з рукамі, суцэльна пакрытымі сінімі «масцямі». Айчым. І зусім спакойна (што значыць не сваё дзіцё!) пацікавіўся, на які тэрмін дзяржава садзіць сваіх сыноў, што нейкім чынам ухіляюцца ад ганаровага абавязку. Камандзір сказаў, што ён не звер, што спрыяць здачы старшага матроса ў лапы ваеннай пракуратуры і трыбуналу не імкнецца, але трэба тэрмінова вярнуць Пецю ў абдымкі ВМФ. Аб тым, што пры кепскім зыходзе і яму не паздаровіцца, разважліва прамаўчаў.

...З-за прыбярэжнага ракітніка выкацаў легкавік і спыніўся ля гурта дзяўчат у купальніках, што акружыўшы героя-марака, сакаталі звонкім разнагалоссем. Побач бруілася Ясельда. Пеця, загарэлы, мускулісты, у чорных плаўках і бесказырцы, меў твар задаволены, лянівы, з напаўзаплюшчанымі вачыма. Гібрыд султана ў гарэме і ката, што гуляе з мышшу... Камандзірскае вока адразу адзначыла, што падначалены парадкам зарос. «Вось жа пудзель, ангідрыт-т-яго-маму!» — падумаў камандзір і выбраўся з легкавіка.

Пеця якраз распавядаў гісторыю, як дзякуючы ягонай, Пеціной, парадзе была прадухілена страшэнная катастрофа.

«...Вочы ў кэпа — квадратныя! Ну, разгубіўся мужык! І — за каштан, гэта сувязь такая: «Хімік, што рабіць?». А я яму: «Кэп, не сцы! Трэба так, так і так...!» Тут Пеця ўбачыў героя свайго аповяду і папярхнуўся слінай. А вочы яго зрабіліся — не квадратнымі, не! — як у чырвонага пеўня. Вы бачылі калі-небудзь вочы чырвонага пеўня?

## 3

...Вярнуў кэп Пецю на флот, адмазаўся даведкай — маўляў насамрэч хварэў баец запаленнем лёгкіх. У іх там, у Лагішыне, усе адзін аднаму ці кум, ці сват, ці яшчэ які крыху сваяк, даведка не праблема. Дывізіённы палаяўся, ды і прыціхла ўсё пакрысе...

... — Таварыш капітан-лейтэнант, прашу дазволу далажыць, — карабельны фельчар перамінаецца з нагі на нагу і чухае пахвіну. — Трэба адправіць старшага матроса Васіленку на абследванне...

— Цябе самаго трэба адправіць... Што там з гэтым абэлтусам? Калі запаленне лёгкіх — Бог ёсць!

— Не, таварыш капітан-лейтэнант, трэба зняць падазрэнні ў венерычным захворванні...

— Гоп-п-пачкі!.. Што — ёсць такія падазрэнні, альта-кумулюслентыкулярус ?!

Дакладна так... Вельмі падобна на першасны сіфіліс, таварыш камандзір...

— Сі...! — Твар камандзіра наліўся чырванню, бровы заехалі амаль да макаўкі. — Я ж з ім тры дні! Бок ля боку! Мама яго паляшуцкая!... Доктар! Бурам — хіміка ў санчасць, хай гэтага Пётру там пятрушаць! Госпадзе, толькі б не пацвердзілася!

Фельчар выйшаў з каюты, а камандзір сарваў з сябе вопратку, кінуўся да люстэрка — і кожны дробны пухірык на скуры здаўся яму шанкрам. Потым залез у душ і з гадзіну шкробся дзярпучай поліпрапіленавай вяхоткай, сплеценай з швартоўнага троса.

... — Таварыш камандзір, дазволіце...? — Фельчараў твар зусім нерухомы. Як маска.

— Ну! Што там?! Ды не цягні ты ката за... нос! Зрабілі аналіз? Рэакцыю Васэрмана?

— Не, таварыш камандзір... Старшага матроса Васіленку агледзеў дзяжурны ўрач...

— Ну, і?..

— Прасіў перадаць, таварыш камандзір, каб абмылі Васіленкаў пеніс у растворы перманганата калія і не тлумілі яму мазгі...

— Так і сказаў? Ф-ф-у-у! Пракантралюй асабіста, каб ён свой... палавы дзетародны... Ясна? Марганцоўкі не шкадуй!...

...Праз тры дні прыйшоў ліст. З ліловым прамакутным штэмпелем «Пінскі скурвендыспансер». Паштар падняўся на ГКП, камандзір якраз камандаваў праваротам тэхнічных сродкаў. «...Прашу накіраваць Вашага ваеннаслужачага Васіленку Пятра на абследванне... Меў сувязь з нашай пацыенткай...»

«С-с-у-ка! — Зараўлі па караблі дынамікі «Каштана». — Хімік! Фельчар! Прыбыць на ГКП!»...

— На, чытай, янот вушаты! Што?! Зразумеў? Я цябе інструктаваў перад адпачынкам? Інструктаваў, ці не? Я што казаў наконт выпадковых сувязяў?

— Адкуль жа я ведаў? — Заканькаў Пеця, уражаны больш за камандзіра. — Яна ж была як лебядзь! Ноч, месяц, бярозы! Аднакласніца!

— Бярозы! — Зноў ускіпеў камандзір. — Лепей бы ты свой няфрытавы стрыжань дзе ў бярозу ўшчаміў ды зламаў! Я ж з табою за руку здароваўся! Ды ты, відаць, з усім экіпажам ручкаўся?

— Ён учора веставому каюткампаніі дапамагаў! — Высунуўся са штурманскай рубкі памочнік.

— Ой-ё-ё! — Зусім упаў духам камандзір. — Ведаеш што, Васілевіч? Не будзем мы цябе лячыць. Пасадзім пад замок у хімпасце, і будзеш там гніць!

— Не маеце права! — Даў «пеўня» ашаломлены Пеця. — Я на дзяржаўнай службе!...

... — Ты ведаеш, што ў твайго Васіленкі станоўчы вынік аналізу на сіфіліс? — Патэлефанаваў флагманскі доктар. — Толькі што званілі з Палярнага.

— О, пайшла інфармацыя... — незадаволена прабурчэў у слухаўку камандзір, — слухай, доктар, мяне зараз гэта ўжо не вельмі хвалюе. Хай лечыцца... Дарэчы, колькі яго ад гэтай трасцы будуць лячыць?

— Не доўга, у яго першасны. Месяцы два.

— Нічога сабе — не доўга! У мяне і так людзей некамплект на трыццаць адсоткаў... Ну, нічога не зробіш. Дык ты паслухай, зараз іншы клопат па тваёй частцы... Гэты архар апошнія дні ў буфеце каюткампаніі працаваў. Як думаеш — можа мне ўсіх афіцэраў і мічманаў на эрвэ накіраваць? І самому?...

— Ды не хвалюйся ты! Калі твой бульбашык канец у баршчы не паласкаў, а я думаю, што не паласкаў, то ён яшчэ не заразны...

### 4

— А-а-а! — Грыміць па знешнім трапе матрос Мелканян. — А-а-а! — Залятае ў рубку дзяжурнага. — Пэця! Вада скочыў! Шлюпка спускай!

— Чаго ты гарлаеш, Ашотджан, сэрца маё? — Кажа дзяжурны па караблі. У паветры ўжо лётаюць «белыя мухі», вось-вось ляжа снег, вада ў затоцы нават летам градусаў шэсць, не Крым. — Хто скочыў? Чаго скочыў? Куды?

— Пэця-хымык! Пірса ваду скочыў! — Лемантуе Мелканян і як вятрак махае рукамі. — Жанчыну ратаваць скочыў! Шлюпку давай!.

— Якую да задніцы жанчыну? Табе, Мелканян, паўсюль жанчыны мрояцца...

— Жанчына скала ўпала! Хымык ратаваць скочыў! — Мелканян хапае мічмана за руку і цягне з рубкі на шкафут. Пасудзіна ашвартавана бортам да плаўпірса пад высокай гранітнай скалой, амаль вертыкальна навіслай над вадой. На скале лікі, «святая тройца»: Маркс, Энгельс і Ленін. Пад імі, ля ўрэзу з вады вытыркаецца камень. На камені валтузіцца Пецька, нешта да сябе спрабуе выцягнуць.

— Хымык! — Раве Мелканян. — Жанчыну ратуе! Шлюпку трэба!

Сапраўды, у такой вадзе пару хвілін — і кроў гусцее, сэрца не ў змозе праганяць яго па сасудах.

Званы звіняць «Аўрал». «Шлюпку да спуску!» З кубрыкаў вытыркаюцца незадаволеныя твары. «Адміральскі час» — адпачынак пасля абеду, святыя хвіліны. «Жопы ў жменю! —Паддае бадзёрасці дзяжурны. — Чалавек за бортам! Пецька Васілевіч!»

Шлюпку скінулі так хутка, як ніколі не маглі ў час трэніровак. «І-раз, і-раз!» — падскочылі пад скалу да каменя. Там Пецяў адной робе, гэта тое ж, што і голым, і кабета ў футры. Назад, да пірса, там ужо «хуткая» стаіць, з санчасці выклікалі. Санчасць якраз наверсе гэтай скалы, толькі да пірса дарога ў аб'езд ідзе, з кіламетр. Камандзір на пірсе, распараджаецца. Таксама ў «адміральскі час» падушку ў каюце душыў. Кабета жывая, затарможаная, і перагарам ад яе прэ. А ў Пеці твар чырвоны, хоць прыпальвай.

— Мелканян! Дапаможаш урачу, Васілевіча ў гарачы душ, потым да мяне ў каюту!

Сагрэлі Пецю пад душам, апранулі ў сухое, і як загадана — прывалаклі ў каюту да камандзіра. Той каюту на ключ, у сэйф залез, «шыльніцу» дастаў, каністру з нержавейкі, і наліў шклянку спірту, «шыла» па-мясцоваму. «Пі, — кажа, — гэта зараз не п'янка, а прафілактыка. Дзеля захавання баявой гатоўнасці». Выцадзіў Пецця неразведзены спірт, нават не зморшчыўся, ажно кэп здзівіўся — «Ну ты і малойца, не па гадах!» — і салёны агурок яму ў дзюбу. Пачакаў, пакуль той храбусцеў:

— Ну, як пачуваешся?

— Нармальна...

— Можа і цябе ў санчасць?

— Не трэба, таварыш камандзір...

— Скажы «тпр-р-р-р-у».

— Тпр-р-р-р-у...

— Здаецца, і сапраўды нармальна. Ну, кажы, галуб шызы, як ты на той камень трапіў?

Чым матросы на Поўначы шэрае флоцкае жыццё расфарбоўваюць? Па-першае — алкаголем. Розныя шляхі ёсць, каб яго здабыць, але аб гэтым не будзем. Потым — для рукастых — «народны промысел». Скручваюць, напрыклад, па ўсім караблі бронзавыя дэталі, і з гэтай бронзы розныя бліскучыя рэчы выштукоўваюць. Або раздзіраюць матрасы, дастаюць адтуль штучную скуру і хвацкія «дыпламаты» з тае скуры майструюць.

А Пеця прылаўчыўся рыбу лавіць. Прывязваецца да тоўстай жылкі трохсотграмовая гайка, вышэй на павадках тры рыбалоўныя гакі. На гак кавалак мідзіі, імі ўвесь пірс абросшы, і снасць з борта або з прычала — у ваду. Метраў на трыццаць-сорак. І трымаецца ў руцэ, на пальцы. Як на тым канцы тузанула — падсечка, другі раз тузанула — зноў падсечка, трэці... І выцягвае тры здаравеныя траскі. За гадзіну-другую кілаграмаў сорак рыбы можна нацягаць. І на камбуз коку. Жыццё весялей, і ад хлопцаў павага.

Стаялі тым разам у канцы пірса з Мелканянам, лавілі. І раптам віск, быццам свіння ў плот ушчамілася. Паднялі галовы — коціцца ўніз са скалы нехта. Затрымаецца за няроўнасць, павішчыць, і далей. Зноў затрымаецца... Па віску вызначылі — жанчына. Як нарэшце ў ваду бухнулася, не патанула, футра не дало адразу патануць. Плавае і зноў вішчыць. Скінуў Пеця шынэль, боты, у адной робе застаўся: «Давай, Ашот, да дзяжурнага. Хай шлюпку спускае. А то зараз намокне футра ў дзеўкі — на дно пойдзе. Я яе вунь на той камень выцягнуць паспрабую».

— Ты шьто? Загінешь!... — Вызверыўся Мелканян, але затрымаць не паспеў. Пеця з пірса — салдацікам! І — сажнямі!

...Пеця Васілевіч, з Лагішына... Грунтоўны да немагчымасці...

ЭСЭ

# КАЛЯДЫ НА ВЫСПЕ ГОТЛАНД

Галіна ДУБЯНЕЦКАЯ

**Каляды на выспе Готланд — пад аховай гарадскіх муроў XIII стагоддзя, з каменнымі барашкамі ды авечкамі пры кожнай вежавай браме, з адважным рухам ровараў па зледзянелых снягах — запомняцца не толькі, дый не столькі, шведскаю экзотыкай.**



Сама вандроўка была разрывам звыкласці й пералётам у іншую яву, дзе як жа ж дзіўна было прывітаць сваю вернутую да прытомнасці душу!

Гэта было свята самоты. Бяссонная Балтыка да небакраю і царква Святой Марыі за вокнамі майго пакою ў Візбі — краявід, як забыты скарб, што быццам выплыў з нейкага тайніка свядомасці: глядзі, маўляў, што ты маеш, не забывайся болей. Начамі вокны царквы свецяцца, удзень і ўночы званы вызвоньваюць кожную гадзіну й паўгадзіну, а да ўваходу вядуць найкруцейшыя ў свеце абледзянелыя сходы.

Варта было бачыць, як, учапераўшыся ў поручы, бокам, а хто й проста едучы на азадку, мы спушчаліся да Каляднае Імшы. Няўжо цэлы Візбі дастаўся да маёй заваконнай Св. Марыі гэткім шляхам — бо, здаецца, увесь горад быў там. І ва ўсіх свяцільнях, усіх шматпавярховых жырандолях, на вышыні дасяжнай і недасяжнай гарэлі жывыя свечкі, тысячы й тысячы трапяткіх вагеньчыкаў. От каб зірнуць, як іх запальваюць! Гэта й было галоўнаю раскошаю святочнага ўбрання хораму.

Набажэнства на шведскай мове, прыгожае і ўтульнае, усе вернікі атрымалі тэкст і ноты песняспеваў, усе спявалі. Службу правілі святары й святаркі. На прычасце круглыя, бы манеткі, аблатачкі мачалі ў кубкі з вінОм. Пры канцы спявалі «Ціхую ноч», і тут не магло не згадацца, што гэты верш у перакладзе Наталі Арсенневай пайшоў на святочных паштоўках у турмы да беларускіх вязняў.

Страшныя весткі з Беларусі, пачынаючы ад вечара 19 снежня, трымалі пад напругай днямі й начамі. Думаю, што ў Швецыі, дзякуючы вольнаму Інтэрнэту, я ведала ўсё хутчэй і больш дакладна, чым ведала б дома. Дасылала словы падтрымкі сябрам. Дарэчы, навігацыя ў Інтэрнэце, якая дагэтуль была мне таямніцай за пячаткамі, цалкам сталася маёй тамтэйшаю заваёвай.

Ірадава расправа ў Менску папсавала зімовыя святы беларусам па ўсім свеце. Некалькі дзён было зусім не да чытання ангельскіх і польскіх паэтаў, чыіх кніжак набрала ў бібліятэцы гасціннага Балтыйскага Цэнтра, і не да перакладаў. А ўмовы для заняткаў там сапраўды шыкоўныя. Мілы, сапраўдны прытулак для творчых душаў зладзіла гаспадыня гэтага дома цудоўная Лена Пастарнак, якая ставіцца да гасцей-пісакаў як да сваёй сям'і. Два паверхі ўтульных чытальных залаў з фатэлямі, канапамі й пледамі, камінам, фартэпіяна ды іншаю музыкай, тэле, відэа, кампутарамі, прынтарамі, жывымі кветкамі й літаратурай усім неабходным як дзеля творчых сумоўяў, так і дзеля засяроджанай «затворніцкай» працы. Ужо не кажучы пра побыт з талкова абсталяванымі кухнямі, пральняй, электрасаўнай...

Вельмі прыемна было ўбачыць кала маёй кніжкі вершаў, пакінутай на вялікім стале завочных і вочных літзнаёмстваў, стосік беларуска-расійскіх слоўнікаў: хтось чытае! — і пачуць прызнанне латвійскага паэта Улдыса Бэрзіньша (помнага з «Крыніцы»), што ён над ёй «трудзіўся». Многія пісьменнікі выбіраюць Балтыйскі Цэнтр спаміж усіх падобных Цэнтраў іншых краінаў і штораз вяртаюцца сюды. Маімі суседзямі былі літаратары з Літвы, Польшчы, Фінляндыі, Швецыі, Францыі, Расіі, Ісландыі, шведскі пісьменнік з Амерыкі... Усе гавораць, апроч сваёй мовы, як мінімум, па-ангельску.

А мора гаворыць на ўсіх мовах, і гаворка не спыняецца нават пры зачыненых вокнах. Да ўзбярэжжа блізка, але прабіцца туды праз шквалы й завеі ўдавалася не так часта. Аднога надвячорку, ціхага й сонечнага, напаткала мяне з'явішча: вялікае мноства белых лебедзяў, па адным або купкамі па двое-трое, нібы вясновыя крыгі пагойдваліся на хвалях трошкі воддаль берага, іх было больш за сорак, я ў жыцці такога не бачыла. ...Праз колькі гадзінаў на літоўскім баку Балтыкі адляцела ў вырай светлая душа Тацяны Сапач. Пакінуўшы на зямлі свае сорак з нечым прыгожых, акрыленых паэзій гадоў.

Свядомасць адмаўляецца зжывацца з гэтаю стратай. Тацянка, я ў тваёй сукенцы гэты год жалобны праводзіла, у сябрыне балтыйскіх паэтаў, твой верш мой улюбёны пра Зялёны Штраль узгадала ім па-беларуску — шкадавала, што не памятаю хоць якога твайго верша ў ангельскім перакладзе, але людзі перапытвалі асобныя радкі, значыць, тое-сёе разумелі. Глядзела запіс твайго выступу ў Вільні, ва ўніверсітэце, дзе ты чытаеш вершы з кнігі «Сонца тваё не закоціцца...», і мой вершык у тым ліку, усміхалася праз слёзы. А цяпер вось і Віталь Тарас да цябе далучыўся... І зусім асірацеў твой Сяргей.

Такі вось Новы Год з Калядамі — Тыгравы дажынкі.

Ад удзелу ў сумных і трагічных падзеях засланіла мяне выспа Готланд.

**АФРЫКАНСКАЯ МЯЖА**

# Крысціян Фрэдэрык Луі Лейпалт (1880–1947) (Паўднёвая Афрыка)

## У канцлагеры

*O, pazienza, pazienza*
*che tanto sostieni!*
*Дантэ*

*Знясілены скрухаю, дух твой марнее,*
*Ад слёз па мінулым твой позірк пусты.*
*Ты радасць і мір прамантачыў, развеяў,*
*Цяпер засталося прасіць слепаты,*
*І ў словах малення — ніякай надзеі:*
*«Цярпенне, цярпенне,*
*дзе скончышся ты?»*

*Усё як учора, усё як звычайна:*
*Намёт — твой прытулак адзіны*
*— амаль*
*Цябе не хавае ад ночы бяскрайняй,*
*І падае неба на плынны Вааль.*
*Ты слухаеш кашаль дзіцяці адчайны,*
*І стукам дажджу адгукаецца даль.*

*Дрыжыць і міргае агеньчык на кноце,*
*Дзве цалі — і згасне, і скончыцца ён.*
*Як добра ў зямлі ці ў апалай лістоце,*
*Які бестрывожны ў памерлага сон...*
*А тых, хто жывы, сон вядзе ў адзіноце*
*У кола, дзе вусціш і скрухі праклён.*

*Тут дзеці прыходзяць на свет*
*для пакуты,*
*Тут гіне не здольны змагацца стары,*
*Тут крыкам і плачам твой*
*слых ахінуты,*
*Тут цягнуць на дно цябе скрухі віры,*
*Бо ўсе перажытыя ў жаху мінуты*
*Навечна выпальваюць раны ўнутры.*

*Ніжэй і ніжэй навісае галодна*
*Вялізная хмара — і знік задыяк.*
*У цемры ні зоркі, маўчыць голас*
*родны,*
*Адно толькі кашаль пачуеш няўзнак.*
*А вецер нашэптвае мякка, лагодна:*
*«Цярпенне, цярпенне, ты ж*
*скончышся, так?»*

*Прабачыць? Забыцца на боль*
*несціханы,*
*На скруху і страх, што спалілі масты?*
*Стагоддзе ганебным кляймом*
*пакарана,*
*Бо мёртвыя дзеці, бацькі і браты.*
*На жыццях занадта глыбокія раны.*
*Цярпенне, цярпенне, ці скончышся ты?*

**Пераклад з афрыкаанс Кацярыны Мацiеўскай**

## Старая кніга

*На гарышчы, дзе ў сваволі*
*Раскашуюць пацукі,*
*Там, дзе кажаны і молі*
*Збудавалі гарадкі,*
*Я знайшоў цябе, мой сябра,*
*адкапаў твае радкі.*

*Прачытаў цябе мой продак,*
*Прагартала шмат людзей,*
*Ад тугі найлепшы сродак:*
*І манах, і ліхадзей*
*Рагаталі над табою: шмат агню й*
*вясёлых дзей.*

*Шмат гадоў ты праляжала*
*Тут, дзе кавардак і хлам,*
*Спачывала між завалаў*
*З году ў год — і сёння там,*
*Бо прыйшлася не да смаку ты*
*мясцовым пацукам.*

**Пераклад з афрыкаанс Ганны Янкута**

# Рэд'ярд Кіплінг (1865–1936) (Вялікабрытанія)

## Паўднёвая Афрыка

*Ну й жанчына, вам скажу —*
*Божа міласэрны!*
*Маніць, мучыць — будзь здароў,*
*Толькі вось трывожыць кроў,*
*Вабіць мужных ваяроў*
*Гожасцю нязмернай.*

*Вабіць мужных ваяроў*
*Нават з Акрынгтону,*
*Афрыкай яна была,*
*Палкай Афрыкай была,*
*Нашай Афрыкай была!*
*Афрыкай — да скону!*

*Смагай змучана яна,*
*І гарацць руіны,*
*Мор яе штогод бярэ,*
*Суш і голад на дварэ,*
*Саранча траву жарэ,*
*Падае скаціна.*

*Толькі любім мы яе,*
*Хоць і шлем праклёны.*
*Афрыкай яна была,*
*Палкай Афрыкай была,*
*Нашай Афрыкай была!*
*Афрыкай — да скону!*

*Давядзецца праз яе*
*Шмат мужчынам знесці:*
*Ледзь здабытая жратва*
*І мача замест пітва,*
*Не сцяжына, а дрыгва,*
*Гной — агонь развесці.*

*Забівала ў глотку пыл,*
*Біла ліхаманкай,*
*Цела рвала на шмаццё,*
*Мела на бяду чуццё —*
*І яны клялі жыццё*
*З гэткаю каханкай.*

*І пасля як надалей*
*Ад яе сплывалі,*
*Ды, ступіўшы на парог,*
*Вар'яцелі зноў, дальбог,*
*І з усіх імчалі ног*
*Да гарачай кралі.*

*Мары пра яе красу —*
*Наша ўзнагарода.*
*Пакідалі мы тады*
*Дом на доўгія гады,*
*Каб назваць свае клады*
*Алтаром народа.*

*Ёй, здабытай у крыві,*
*У крыві паўсталай,*
*Ўзятай дарагой цаной,*
*Змучанай ушчэнт вайной, —*
*Верныя мы ёй адной,*
*Самай дасканалай.*




*Дык устань — і мы зірнем*
*Проста ў вочы кону.*
*Афрыкаю ты была,*
*Палкай Афрыкай была,*
*Нашай Афрыкай была!*
*Афрыкай — да скону!*

## Ахова моста ў Кару

***...і будуць забяспечваць атрады для***
***аховы моста праз Крываваю раку.***
***Загад па акрузе: лініі камунікацый,***
***Паўднёваафрыканская вайна.***

*Пустэльня робіцца чорнай,*
*Ахутвае свет каламуць,*
*І стромы каля Аўтсхорна*
*Стальцамі Цароў устаюць.*

*Палае цвярдыня адчаю*
*І дзеліць у бляску руін*
*Берылавы пас небакраю*
*І вінную цемру раўнін.*

*Велічным фарбам на змену*
*Выхапяць промні з-за скал*
*Умбру, карыцу, сіену,*
*Попел ружы, апал.*

*Тонуць у прыцемках травы,*
*Цемра вяршыні чарніць.*
*Вось і сігнал для заставы —*
*Варту ля моста змяніць.*

*І там, дзе блісне ля моста*
*Рэек сталёвы пакат,*
*Мы — не героі, а проста*
*Ўсімі забыты атрад.*

*Мы праслізнем па сігнале*
*Праз плот ля хаціны крывы —*
*І ўніз, па бязводным канале,*
*І ўверх — на злом галавы.*
*Спатыкаемся часам аб смецце —*
*Бляшанкі, старыя харчы,*
*Займаем пасты — да дасвецця*
*У цемрадзі мост сцерагчы.*

*Вось пастухі-гатэнтоты*
*Статак пагналі ў крааль,*
*І пасля дзённай спякоты*
*Стыне, парыпвае сталь.*

*Вые шакал штохвіліны,*
*І ў цішы выразна чутно,*
*Як зямлі камячок у цясніну*
*Спаўзае, імкнецца на дно.*

*Вось нябеснае войска паўстала,*
*І шыхтуюцца шэрагі зор*
*У абламоўцы з металу,*
*Арак, рэек, падпор.*

*Гул мы пачулі — і ў зязнні*
*Фараў у цемрадзі ўзнік*
*Нам дарагі, як каханне,*
*З межаў паўночных цягнік.*

*А там, дзе ля самага моста*
*Вокнаў зіхоткіх парад,*
*Мы — не героі, а проста*
*Ўсімі забыты атрад.*

*Сёння свята на межах!*
*Гэй, не ўпусціце дароў —*
*Пачак газетаў нясвежых*
*І некалькі слоў ад сяброў.*

*І зноў — небасхіл не суровы,*
*І зноў нам падорыць зямля*
*Абрыўкі жаночай размовы,*
*Сустрэчы, вітанні здаля.*

*Як хутка ён мост праміная,*
*Хоць гул застаецца ўвушшу...*
*І постаці ноч ахінае*
*І ахінае душу.*

*А там, дзе ля змрочнага моста*
*Вокнаў знікае парад,*
*Мы — не героі, а проста*
*Ўсімі забыты атрад.*

## Пяхота

*Раз — два — раз — два — цягнемся па Афрыцы,*
*Раз — два — раз — два — ледзь паўзем па Афрыцы.*
*(Крок — крок — зноў — крок — па гарах уверх і ўніз.)*
*Без стральбы ідзе вайна.*

*Пяць — трынаццаць — восем — тры — сёння дваццаць дзявяць міль,*
*Васямнаццаць — дзевяць — сем — заўтра будзе трыццаць пяць.*
*(Крок — крок — зноў — крок — па гарах уверх і ўніз.)*
*Без стральбы ідзе вайна.*

*Досць — досць — досць — досць — вочы долу апускаць*
*(Крок — крок — зноў — крок — па гарах уверх і ўніз.)*
*Мы — мы — мы — мы — трацім розум ад хадзьбы,*
*І без стральбы ідзе вайна.*

*Трэ — трэ — трэ — трэ — думаць нам пра штось яшчэ,*
*Бог — нас — ра — туй — ад вар'яцтва і тугі.*
*(Крок — крок — зноў — крок — па гарах уверх і ўніз.)*
*Без стральбы ідзе вайна.*

*Лік — лік — лік — куль — мусіш ведаць ты заўжды.*
*Ледзь — сон — збіў — з ног — пройдзе па табе атрад.*
*(Крок — крок — зноў — крок — па гарах уверх і ўніз.)*
*Без стральбы ідзе вайна.*

*Што — нам — бруд — кроў — голад, боль, гарачыня,*
*Шмат — горш — горш — горш — гэты несупынны рытм —*
*Крок — крок — зноў — крок — па гарах уверх і ўніз,*
*І без стральбы ідзе вайна.*

*Днём — нас — тут — шмат — і не цяжка пацярпець,*
*Ды — ледзь — зноў — ноч — чутны толькі гэты марш —*
*Крок — крок — зноў — крок — па гарах уверх і ўніз,*
*Без стральбы ідзе вайна.*

*Сто — дзён — быў — я — ў пекле і магу сказаць:*
*Ні — Бог — ні — чорт мне не стрэўся на шляху,*
*Там — крок — зноў — крок — па гарах уверх і ўніз,*
*І без стральбы ідзе вайна.*

**Пераклад з англійскай Андрэя Стэфановіча**

# Герман Чарлз Босман (1905–1951) (Паўднёвая Афрыка)

## Персікавы брэндзі Вілема Прынсла

Не, сказаў дзядзька Схалк Лоўрэнс, у Грот-Марыка кветак не вырасціш. Гэта някепскае месца для кукурузы, і аднойчы я нават сабраў неблагі ўраджай цыбулі ў садку, што разбіў за дамбай. Але тое, што называюць кветкамі, тут бывае рэдка. Мабыць, праз спёку. Ці праз засуху.

Тым не менш, калі б я ні заводзіў гутарку пра кветкі, я штораз успамінаю ферму Вілема Прынсла на гары Аб'ятэрскап, дзе ладзілі танцы, думаю пра зблазнелага Фрыца Прэторыюса, які ванітаваў, седзячы на дарозе, думаю пра белую ружу, якую некалі зухавата насіў на сваім капелюшы. Але больш за ўсё я думаю пра Грыту.

Калі ісці паўз маю ферму да вяршыні і звярнуць позірк на паўночны захад, можна пабачыць Аб'ятэрскап за хрыбтом Дварсберге. Людзі скажуць вам, што там, на Аб'ятэрскапе, жывуць прывіды і што некалі яна была домам ведзьмаў. І гэтаму я ахвотна веру. На Аб'ятэрскапе я быў усяго аднойчы. Здарылася тое шмат гадоў таму. І пасля я больш ніколі туды не хадзіў. Але зусім не ад прывідаў ды ведзьмаў я трымаўся падалей.

Грыта Прынсла мусіла вярнуцца дахаты з пансіёна шляхетных дзяўчат у Зэйрусце, куды яна паехала вучыцца ангельскім манерам, пісанню дыктовак і іншым высакародным прадметам. А таму, каб адзначыць яе прыезд, Вілем Прынсла, бацька Грыты, наладзіў грандыёзныя танцы на сваёй аб'ятэрскапскай ферме.

Мяне на свята запрасілі. І Фрыца Прэторыюса таксама. І ўсіх белых з нашай мясцовасці ад Дэрдэпорта да Рамоўтсы. Больш за тое, практычна ўсе яны прыйшлі. Натуральна, кожны з нас хваляваўся перад сустрэчай з Грытай. У пансіёне шляхетных дзяўчат яна засвоіла столькі ўзвышаных навукаў, што цяпер мы не наважыліся б балбатаць з ёй па-простаму, нібы яна звычайная бурская дзяўчына. Але найболей у Аб'ятэрскап нас прыцягвала слава Вілема Прынсла, які рабіў найлепшы персікавы брэндзі ў нашых мясцінах.

Фрыц Прэторыюс загаварыў са мной пра бяду, якой нарабіла Грыціна навука.

— Эх, дружа, — сказаў ён, — каб ты ведаў, як я баюся загаварыць з ёй! Але я ўзяўся крыху падцягнуць свае веды. Учора вось дастаў старую грыфельную дошку, на якой пісаў яшчэ ў школе, апошні раз сямнаццаць гадоў таму, і рашыў некалькі прыкладаў. Складаў ды адымаў. Паспрабаваў быў крыху памножыць, але ж я зусім забыўся, як гэта робіцца.

Я сказаў Фрыцу, што хацеў бы яму дапамагчы, але так далёка, як да множання, я ў навуцы ніколі не прасоўваўся.

Надышоў дзень танцаў. Паштовая павозка, везучы Грыту да дома яе бацькі, мінула раніцою Драгедал. Па абедзе я апрануўся. Надзеў чорны пінжак, жаўтавата-карычневыя штаны і ружовую кашулю. А таксама абуў карычневыя боты, што набыў каля году таму і ў якіх яшчэ не меў нагоды выйсці ў людзі. Бо я б выглядаў поўным дурнем, расхаджваючы па ферме ў крамных ботах, калі наўкола ўсе носяць самаробныя вельдскуны [1].

Сеўшы на каня і выправіўшыся ўніз па Урадавай дарозе, фарсіста ссунуўшы капялюш набок, я быў упэўнены, што на танцах лёгка стану першым франтам.

Сонца ўжо пачынала садзіцца, калі я наблізіўся да падножжа Аб'ятэрскапа, якое мусіў аб'ехаць, каб дабрацца да фермы Вілема Прынсла, што мясцілася ў лагчыне між двух узгоркаў. Едучы, я думаў, што за глупства пасяліцца ў месцы, дзе, кажуць, водзяцца прывіды. Дрэвы тут былі вышэйшыя і гусцейшыя, як і паўсюль, дзе зямля падымаецца ўгору. А таксама нашмат цямнейшыя.

Наўкола тут ляжалі цяжкія дзікаватыя цені. Мне яны былі зусім не даспадобы. Я ўспамінаў гісторыі пра ведзьмаў Аб'ятэрскапа і тое, што яны рабілі з падарожнікамі, заблукалымі ў цемры. Заблукаць жа сярод гэтых высачэзных дрэваў было як нагу ў бот уставіць. Таму я пусціў свайго каня галопам, каб як найхутчэй выбрацца з гэтага змрочнага месца. Коні ўсё ж добра чуюць прывідаў ды ведзьмаў, і маім абавязкам было прасачыць, каб конь не спужаўся дарэмна. Асабліва калі па сцяжыне раптам пранёсся халодны вецер і раз ці два мне пачулася, як злавесны голас выгуквае маё імя. Я пагнаў яшчэ хутчэй. Але неўзабаве азірнуўся і зразумеў, у чым справа. Гэта Фрыц Прэторыюс імчаў галопам за мною.

— Чаго ты так ляцеў? — запытаўся Фрыц, калі я сціšыў каня, каб ён змог мяне нагнаць.

— Хацеў мінуць гэтыя дрэвы, пакуль не сцямнела, — адказаў я. — Каб каня не пужаць.

— А я думаў, чаго гэта ты нясешся, схапіўшы яго за шыю, — адзначыў ён. — Усё каб супакоіць.

Я змаўчаў. Але заўважыў, што Фрыц таксама апрануўся фарсіста. Насамрэч я абыходзіў яго кашуляй і ботамі, але на ім быў шэры гарнітур, а штаны ён заправіў у шкарпэткі. Да таго ж ён меў насоўку, якую, выхваляючыся, выцягваў з кішэні ўжо колькі разоў.

Канечне, зайздросціць такім, як Фрыц Прэторыюс, не ў маіх правілах. Але мяне злавала сама думка, што ён выстаўляе сябе поўным пасмешышчам, беручы на вечарынку такую заморскую прыдумку, як насоўка.

Мы прыехалі да дома Вілема Прынсла. У вельдзе [2] стаяла столькі павозак для валоў, што гэта нагадвала сапраўдны абаронены павозкамі лагер. Прынсла сустрэў нас ля дзвярэй.

— Праходзьце сюды, kêrels [3], — сказаў ён. — Танцы ў пярэднім пакоі. А персікавы брэндзі — на кухні.

Хаця пярэдні пакой быў вялікі, сюды набілася столькі народу, што танчыць было амаль немагчыма. Але ўсё ж не так шмат, як на кухні. Ды і музыка ў пярэднім пакоі — некалькі чалавек гралі на гітарах і канцэрцінах [4] — была не такой гучнай, як музыка на кухні, дзе ніхто не граў, затое кожны нешта сам сабе напяваў.

І па ўсім гэтым мы здагадаліся: вечарынка была што трэба.

Прабавіўшы з паўгадзіны на кухні, я вырашыў, што варта схадзіць у пярэдні пакой. Дарога туды з кухні падалася мне цяпер ніблізкай, а таму некалькі разоў даводзілася абапірацца аб сцяну, каб крыху падумаць. Я мінуў яшчэ некалькі чалавек, што таксама абаперліся аб сцяну ў развагах. Адзін нават вырашыў, што лепш за ўсё думаецца седзячы на падлозе і абхапіўшы галаву рукамі.

Як можна пераканацца, Вілем Прынсла рабіў проста выдатны персікавы брэндзі.

А потым я пабачыў Фрыца Прэторыюса і вокамгненна прыйшоў у сябе. Ён бесклапотна памахваў сваёй белай насоўкай у такт музыцы і размаўляў з дзяўчынай, якая ўсміхалася яму сваімі яснымі вачыма, чырвонымі вуснамі і белымі зубамі.

Я адразу зразумеў: гэта Грыта.

Яна была высокай, зграбнай і вельмі пекнай, а яе чорныя валасы ўпрыгожваў вянок з белых ружаў, сабраных, як можна было здагадацца, гэтым ранкам у Зэйрусце. Да таго ж яна зусім не выглядала на тую, у чыёй прысутнасці трэба выдаваць сябе за чалавека разумнага і адукаванага. Насамрэч я адразу ж адчуў, што мне зусім не спатрэбіцца табліца множання, якую я вырваў з канца школьнага сшытка і засунуў у кішэню пінжака перад самым выхадам з дома.

Уявіце, як цяжка мне было загаварыць з Грытай, пакуль тут круціцца Фрыц. Але нарэшце гэта ўдалося, і, ведучы з ёй размову, я з задавальненнем прасачыў краем вока, куды накіраваўся Фрыц. Ён пайшоў на кухню, памахваючы за сабой насоўкай. На кухню, поўную смеху, спеваў, і персікавага брэндзі Вілема Прынсла.

Я сказаў Грыце, што я Схалк Лоўрэнс.

— Ага, я чула пра цябе, — адказала яна, — ад Фрыца Прэторыюса.

Я ведаў, што гэта значыла. А таму расказаў ёй, што Фрыц славіцца сваёй хлуснёй на ўвесь Марыка. Ды парасказваў і іншага пра яго. Праз дзесяць хвілін, калі я ўсё яшчэ расказваў пра Фрыца, Грыта ўсміхнулася і сказала, што скончыць аповед пра яго я магу неяк іншым разам.

— Але ж адну рэч я мушу расказаць табе цяпер, — настойваў я. — Калі Фрыц даведаўся, што ты будзеш на танцах, ён пачаў рабіць хатняе заданне.

Я расказаў ёй пра грыфельную дошку і прыклады, і Грыта ціха засмяялася. Мяне зноўку ўразіла, якая ж яна прыгожая. Яе вочы блішчэлі ў святле свечак. Ружы здаваліся яшчэ бялейшымі ў яе цёмных валасах. І ўвесь гэты час вакол нас кружлялі танцоры, музыкі гралі весёлыя матывы, а з кухні даляталі дзікаватыя трыумфальныя воклічы.

Астатняе адбылося вельмі хутка.

Я нават не памятаю, як. Але я ведаю дакладна, што калі мы сталі на вуліцы пад высачэзнымі дрэвамі і зоркі свяцілі з вышыні, я з лёгкасцю мог паверыць, што Грыта была зусім не дзяўчынай, а адной з тых аб'ятэрскапскіх ведзьмаў, што плялі свае дзівосныя чары.

Але калі б нехта пачуў мяне, то ніколі б не здагадаўся пра тыя дзікія, страшныя пачуцці, што бурлілі ў маім сэрцы.

Я расказваў Грыце і пра леташнюю засуху, і пра тое, як цяжка засцерагчы дзверы і рамы ад тэрмітаў, і пра тое, як мае новыя карычневыя боты здзерлі скуру з пальцаў на нагах, калі я хутка крочыў.

Пасля я падышоў да яе вельмі блізка.

— Грыта, — прамовіў я, беручы яе за руку, — Грыта, я хачу табе нешта сказаць.

Яна вызваліла сваю руку. Але зрабіла гэта вельмі мякка. Амаль шкадуючы.

— Я ведаю, што ты хочаш сказаць, — адказала яна.

Я здзівіўся.

— Адкуль ты ведаеш, Грыта? — запытаўся я.

— О, я шмат чаго ведаю, — зноў засмяялася яна, — не дарма ж я вучылася ў пансіёне шляхетных дзяўчат.

— Ды не пра тое, — я адразу ж запярэчыў, — я не хачу гаварыць пра правапіс ці арыфметыку. Я хацеў сказаць табе, што…

— Калі ласка, не трэба гэтага казаць, Схалк, — перабіла мяне Грыта. — Я… я не ведаю, ці вартая я таго, каб пачуць такое. Я нават не ведаю…

— Але ты такая мілая! — усклікнуў я. — Я мушу табе сказаць, якая ты мілая!

І ў той самы момант, калі я зрабіў крок да яе, яна адступіла, каб ухіліцца. Я не мог зразумець, як яна так добра ўсё пралічыла. Бо як бы я ні намагаўся, я не мог злавіць яе. Яна з лёгкасцю і грацыёзнасцю хутка пакрочыла між дрэваў, а я штосілы прыпусціў за ёй.

Аднак стрымлівала мяне не толькі прага ведаў, а і мае новыя боты. І персікавы брэндзі Вілема Прынсла. І яшчэ аглобля воза — яе ніжні край, што хаваўся ў траве.

Але грымнуўся я не моцна. Трава там была даўгая і густая. І нават калі ўпаў, вялізным шчасцем напоўнілася маё сэрца. І больш нічога ў свеце мне не было патрэбна.

Грыта спынілася. Павярнулася. Раптам яе цела, зграбнае і цёмнае сярод ценяў, хіснулася ў мой бок, а рука слізганула ў валасы. Яе пальцы крануліся вянка. І наступнае, што я помню, — маленькая белая ружа, да якой я змог дацягнуцца.

Я заўжды буду памятаць захапленне, з якім я падняў ружу, трымценне, з якім прышпіліў яе да свайго капелюша. Я заўжды буду памятаць шуміху, што ўсчалася, калі я ўвайшоў на кухню. Усе кінулі піць, каб толькі паглядзець на ружу на маім капелюшы. Маладыя адпускалі жарты. Старэйшыя хітра падміргвалі і паляпвалі па спіне.

Хоць Фрыца Прэторыюса і не было на кухні, каб стаць сведкам маёй перамогі, я ведаў, што ён усё роўна неяк пра гэта пачуе. І зразумее, што такому хлопцу, як ён, цягацца са мной, Схалкам Лоўрэнсам, — поўнае нахабства.

Рэшту ночы я быў героем.

Мужчыны на кухні пасадзілі мяне на стол. Яны ўсё частавалі мяне брэндзі і пілі за маё здароўе. І пасля, калі тузін іх павалок мяне на двор, каб пакласці на павозку на свежым паветры, яны заваліліся толькі адзін раз.

На світанні я ляжаў усё на той жа павозцы.

Калі я прачнуўся, то адчуў моцную млосць, пакуль не ўспомніў пра Грыціну ружу. Тая белая ружа дагэтуль была на маім капелюшы, каб увесь свет ведаў, што Грыта Прынсла з усіх мужчынаў абрала менавіта мяне.

Але што я не хацеў, каб свет ведаў, — дык гэта тое, што я спаў у павозцы нават тады, калі ўсе госці ўжо разышліся. А таму я паскакаў вельмі ціха, задаволены, што яшчэ ніхто не прачнуўся і мяне не пабачыў.

Галава ў мяне кружылася, але ў душы я адчуваў узмахі зялёных крыльцаў. І хоць стаяў ужо дзень, у траве шапацеў той самы лёгкі ветрык, што быў тады, калі Грыта, стоячы пад зорамі, кінула мне ружу.

Я павольна ехаў між дрэваў на схіле Аб'ятэрскапа і ўжо наблізіўся да мясца, дзе сцяжына зноў паварочвала на поўдзень, калі пабачыў штосьці, што прымусіла мяне зразумець: у гэтых модных пансіёнах дзяўчат вучаць не надта добра.

Спачатку я пабачыў на ўзбочыне каня Фрыца Прэторыюса.

Потым я пабачыў самога Фрыца. Ён сядзеў, прыхінуўшыся да акацыі, абапершыся шчакой на калені. Выглядаў ён бледным і хворым. Але што яшчэ больш прымусіла мяне задумацца пра пансіён шляхетных дзяўчат, дык гэта Фрыцаў капялюш, які валяўся на зямлі крыху наводдаль ад гаспадара, і маленькая белая ружа на ім.

---

[1] Вельдскуны (veldskoens) — моцны скураны ці замшавы абутак (афр.).
[2] Вельд (veld) — паўднёваафрыканскі стэп (афр.).
[3] Kêrels — хлопцы (афр.).
[4] Канцэрціна — язычковы пнеўматычны музычны інструмент, гармоніка з храматычным гукавым шэрагам без гатовых акордаў.

**Пераклад з ангельскай Юлі Цімафеевай**

# Андрыс Герардус Вісэр (1878–1929) (Паўднёвая Афрыка)

## Ружа

*Кароткі час красы,*
*Бо ружа вяне,*
*За светлыя часы*
*Я ўдзячны, Пане.*

*Нам часу не стае —*
*Ставаць не можа.*
*Навечна за яе*
*Я ўдзячны, Божа.*

## Чорныя валы

*Цяжкія капыты гадоў —*
*Валоў упартых, чорных —*
*Пакінуць тысячы слядоў*
*На пашах сэрца ворных.*

*Цяжкія капыты — і ў нас*
*Усё глыбеюць шнары.*
*Зламаны ты, і крочыць час,*
*Як капытом па твары.*

**Пераклад з афрыкаанс Ганны Янкута**

РЭЦЭНЗІЯ

# ПАПЯРЭДЖАННЕ

Міхась ЮЖЫК

**Раман Юры Станкевіча «П'яўка», выдадзены ў 2010 г. («Галіяфы», «Каўчэг»), уяўляецца мне дастаткова ўдалым сімбіёзам антыўтопіі і трылера. Гэта не дае, з аднаго боку, зрабіцца раману-антыўтопіі нудным (што нярэдка бывае) у сваёй павучальнасці і пераперчанасці гратэскам, а з другога, «П'яўка» не скочваецца да банальнай белетрыстыкі, дзе «добрыя» героі варагуюць з «ліхімі», ды яшчэ і выкрываюць і ловяць вампіра («п'яўку»), які тэрарызуе жыхароў паселішча.**




Дзеянне рамана пачынаецца ў Мегаполісе (разумей — Менску) ў 2050 г. пасля Непажаданых Падзей, падрабязнасці якіх аўтар напоўніцу не раскрывае. Згадваецца толькі тое, што з-за тэхнагеннай катастрофы ў спалучэнні з аб'ектыўнымі працэсамі глабальнага пацяплення расталі палярныя ледавікі — і карта Еўропы непазнавальна зыначылася, а так званая белая цывілізацыя прыйшла ў заняпад. Усё перакулілася з ног на галаву. У колішнім асветніцкім цэнтры сусвету Еўропе цяпер забаронены кнігі, а на абсягах Еўрабіі, як яна цяпер называецца, пануюць у сваёй большасці каляровыя расы і кіруюць балем уселякія сэксуальныя вычварэнцы, якія яшчэ на пачатку трэцяга тысячагоддзя называліся сэксуальнымі меншасцямі. Красамоўней тут скажуць цытаты з самога рамана, якія прыводжу: «Кнігі абывацелі, як правіла, знішчалі, але часам выкідвалі ад граху далей на звалку ці проста ў сметніцы. Я (ягерой, Берташ — М.Ю.) не здаваў іх службе бяспекі ці напрамую свайму начальству, а за невялікі хабар, які прапаноўваў смеццязборшчыкам, часам нахабна, хоць і рызыкоўна, прыкішэньваў, што пагражала мне тэрмінам у фільтрацыйна-папраўчым лагеры». «За пяць дзесяткаў год з пачатку дваццаць першага стагоддзя карпаратыўныя і заможныя сэксуальныя меншасці ўпершыню апынуліся ледзь не ў большасці <...> гомасексуальныя шлюбы, якія не здолеў забараніць нават іслам, вядома ж традыцыйна не давалі і не маглі даць патомства. Пасля таго, як нараджальнасць сярод белых дзесяцігоддзе назад упала значна ніжэй чым двое дзяцей на адну жанчыну, аднаўленне насельніцтва ідзе ў асноўным за кошт каляровых, сярод якіх прадстаўнікі розных рас і народаў. Вядома, сюды панаехалі не самыя лепшыя, і ўжо таксама дэградуюць. Яны салідарныя ў адным: непрыязні да белых, асабліва да аўтахтонаў <...> частка белых, альбо, як цяпер я, была сасланая ў Паселішчы, альбо змушана была яшчэ раней, як і зараз, пакідаць цэлыя кварталы і жылыя масівы і шукаць сабе прыстанішчы ў іншых месцах <...> так званая ксенафобія ва ўсіх яе, нават самых нязначных, праявах, жорстка праследуецца».

Вось прыкладна такую карцінку мы бачым на працягу цэлага рамана ў 280 старонак; далей развіваюцца і жахліва падаюць адно нюансы жыцця цяперашняй добрапрыстойнай Еўропы пасля Непажаданых Падзей. Заўважце, Юры Станкевіч для надыходу такой апакаліптычнай рэальнасці адводзіць нашай цывілізацыі ўсяго 40 гадоў, калі ўлічыць, што раман пісаўся ў 2008—2009 гадах. Аднак такая непрыхільная жорсткасць і скараспеласць выведаў заснавана, тым не менш, на жорсткай статыстыцы: калі сучасныя еўрапейцы не пачнуць нармальна нараджаць дзяцей, узнаўляць генафонд, то недзе праз паўстагоддзя белая раса папросту змізарнее і яе месца непазбежна запоўняць «варвары» трэцяга тысячагоддзя. Што і адбываецца ў рамане «П'яўка». Дакладней, ужо там адбылося.

Менавіта гэтая трапяткая і балючая тэма, а не трылерныя пошукі галоўнымі героямі Берташам і яго палюбоўніцай Мойрай вампіра, які сваволіць у паселішчы пад назвай Эдэм, і ёсць галоўнай фабулай рамана. Менавіта дзеля папярэджання нас аб тым, што павінна і можа здарыцца, Станкевіч не шкадуе фарбаў, каб апісваць у выглядзе страшылак «парадак» у краіне пасля Непажаданых Пазей. «Недахоп вады, а ўсе вадаёмы навокал паселішча (як мне гаварыла Мойра) раптоўна ператварыліся ў балота ці павысыхалі каля пяці гадоў таму, толькі пагаршалі спёку. Дажджы паўсюдна сталі рэдкай з'явай і іх, пэўна, з нецярплівасцю чакалі ў кожным тутэйшым бараку, дзе ўжо былі, як я прыкмеціў, падрыхтаваны ўсялякія ёмістасці і прыстасаваныя латкі». «Там-сям людзі ўжо выходзілі з засмечаных баракаў, некаторыя з іх мачыліся проста ля дзвярэй. Рытмічна грукалі барабаны»...

У Эдэме жыве мізэр праўдалюбцаў: пастар, мастак, яшчэ некалькі паплечнікаў Берташа і Мойры ў пошуках «п'яўкі», вампіра, які распачаў высмоктваць поначы жыццё з жыхароў Эдэма. Тут бачыцца пэўны намёк-насмешка аўтара: ці так ужо страшная гэтая п'яўка, калі жывая кроў даўно высмактана з гэтых істотаў, якіх па звычцы яшчэ называюць людзьмі? Вампір, якога нястомна ловяць галоўныя героі, акрамя функцыі зацікавіць чытача і змусіць яго дазнацца сэнсу Станкевічавай антыўтопіі, — гэтая п'яўка нясе яшчэ і сімвалічны сэнс. П'яўка — не столькі вампір, колькі чалавечае глупства, якое ў апантанасці навуковым прагрэсам не спыніла на мяжы тысячагоддзяў галоўнае — працэсы, што стыхійна распачаліся неўзабаве пасля Другой сусветнай вайны. Што гэта за працэсы? Гэта распад Традыцыі.

Паспрабуем угледзецца ў гісторыю Заходняй цывілізацыі. Яшчэ ў 50-х гадах аднаму знакамітаму архітэктару, ледзьве не прыжыццёваму генію, была выказана ў ЗША грамадская пагарда за тое, што ён, сямідзесяцігадовы старац, сыйшоўся і жыве грамадзянскім шлюбам з маладой жанчынаю. Знакамітасць мусіла дажываць свой век у самоце і адрынутасці ў межах свайго маёнтка. І вось праходзіць 10, 20, 30 гадоў — і аблічча людзей, маральныя і фізічныя, мяняюцца да непазнавальнасці. Белы мужчына — ужо часцяком не воін, не абаронца, не гаспадар свайму слову, а нейкі патлаты бязмускульны хіпі. Жанчына — ужо не шматдзетная верная ахоўніца хатняга агменю з багатымі формамі цела, якія вызначаюць яе пладавітасць, а хударлявая, у джынсах, сяброўчка гэтых не падобных да мужчын чалавечых самцоў, а ў далейшым жанчына — і наогул бярэ на сябе мужчынскія функцыі, імкнецца ў бізнэс, палітыку, прычым на самыя высокія пасады. Фотаздымкі сярэднестатыстычных людзей пачатку і канца дваццатага стагоддзя — гэта здымкі нейкіх іншых біялагічных тыпаў. Бо разбураецца, а ў рамане-папярэджанні «П'яўка» — ужо канчаткова і беспаваротна разбурана Традыцыя. Яе разбурэнне прывяло да экспансіі ў Еўропу чужародных культур, якія, перамяшаўшыся з бездзейнымі «карэннымі», сталіся ўсеагульным бескультур'ем.

Ю. Станкевіч хоча сказаць, мусіць: не тым багам моліцеся, спадары! І вось за добрапрыстойнай абалонкай вымеценая і вычышчанай Еўропы, якая ўжо даўным-даўно не вырабляе духоўнага прадукту, як ачагі ракавай пухліны існуюць на поўных правах месцы, куды ходзяць сынкі і дочкі самавітых бацькоў, і займаюцца, скажам мякка, не зусім добрымі справамі. Гэта, прыкладам, індустрыя стрыптыз-клубаў, дзе замест ежы табе падаюць на стол нейчае задняе месца, гэта казіно, дзе прадукуюць псіхічна хворых людзей — лудаманаў, і паўсюль можна спакойна купіць цяжкі наркотык, гэтую ўвасобленую помсту трэцяга свету. Паспрабуйце яшчэ адну асалоду — наш афганскі гераін, і неўзабаве ваша жыццё зробіцца горшым за наша.

У рамане многа, часам празмерна многа карыкатуры на побыт Мегаполіса і правінцыі ўзору 2050 года. Людзям з няўстойлівай псіхікай будзе пры чытанні няпроста. І толькі танюткай нітачкай праходзіць праз твор кволая надзея Берташа і Мойры, што некалі яны скончаць свае неадкладныя справы і ўцякуць на поўнач, паселяцца каля чыстай рэчкі, дзе яшчэ водзіцца рыба, і зажывуць, як у сапраўдным, а не карыкатурным Эдэме. Надзеі такой, як і прадчуваецца ў працэсе чытання, спраўдзіцца не наканавана: калі ўсім вакол дрэнна, хіба дваім можа быць добра? Мойра гіне ў фінальнай перастрэлцы, калі палюбоўнікі, выкрыўшы вампіра і сімулянцыю (спробу наладзіць віртуальную бессмяротнасць), ужо імчацца на машыне да запаветнай рэчкі. Іх наганяюць. Берташ застаецца адзін — і замест чыстай рэчкі з каханай бавіць лета каля бруднага азярка з паўдзікай нецыганкай.

Раман пакідае цяжкае ўражанне сваёй безвыходнасцю. Але не трэба забывацца на тое, што гэта найперш папярэджанне. Трэба памятаць, што гэта пакуль што — толькі прыдумка.

Аўтара — што адчуваецца цягам усяго рамана — непакояць пытанні веры. Нездарма ён увёў пастара і мастака, якія, вагаючыся, найбольш зняверваюцца, чым умацоўваюць веру ў Вышэйшы пачатак, у хрысціянскую Любоў. І не дзіва — такое беспрасветнае пекла вакол! Рэфрэнам гучыць на розныя лады і на розных старонках — ці ёсць ва ўсім які-небудзь сэнс, ці існуе справядлівасць, ці ёсць у канкрэтнага чалавека свабода выбару, або мы толькі кампутары, якія атрымліваюць сігналы звонку, або мы марыянеткі, якіх нехта водзіць за нябачныя ніткі? Бедны пастар Себасцьян упадае і ў кашчунства і ў роспач. Вось не самыя святатацкія вытрымкі з яго прамовы: «Не думайце і таго, што я хачу вас скіраваць на шлях дабрачыннасці, шчасця і справядлівасці, бо нічога гэтага няма і не магло быць. Тое, што нараджаецца на свет у мярзотных параксізмах болю і крыку, павінна само вызначыць, што ёсць дабро і што ёсць зло, не шукаючы гатовых адказаў у брудных, напаўвар'яцкіх, супярэчлівых тэкстах. Адрынце іх! <...> Але хто з вас адкажа мне, якой будзе вечнасць? Раем, у якім вы будзеце існаваць заўсёды? Лазняй з павукамі па вуглах, як выказаўся калісьці наш старажытны празорца? Мікрачыпам у камп'ютарнай нішы, які будзе бясконца пракручваць у сабе адны і тыя ж успаміны...». (А самае вострае, на жаль, мне не хочацца тут цытаваць.)

Будова рамана, паўтаруся, такая, што нават той, хто цікавіцца проста трылерамі і не шукае глабальнага сэнсу жыцця, у прамежку пагоні за вампірам міжволі нешта зачэпіць з галоўнага — з пытанняў праўдзівызначанасці/непраўдзівызначанасці нашага існавання, веры і нявер'я, задумаецца, а ці так усё добра і файна вакол, ці не пачалі мы і, галоўнае, я сам падгніваць знутры, ці ёсць у мяне, чытача, хоць нешта святое, акрамя таго, каб мне проста жылося камфортна і весела?

Я не ведаю ў беларускай літаратуры аналагаў «П'яўцы» ў плане спалучэння чытэльнасці, займальнасці з адначасовым шырокім ахопам адвечных пытанняў. Гэты сімбіёз, адчуваецца, даўся нялёгка Юры Станкевічу. У пагоні за галоўным ён дапусціў у сваю, у цэлым ёмкую і каларытную, мову зашмат русізмаў, пералічваць якія я не збіраюся, бо яны кінуцца ў вока любому прафесіяналу. Некаторыя дынамічныя сцэны ў рамане (пагоні, бойкі, адкопванне вампіра) падаюцца празмерна расцягнутымі, што дысануе з лапідарным стылем пісьменніка. Але не варта забываць, што Станкевіч гэтым самым пашырае кола сваіх чытачоў, як гэта ні дзіўна, прыцягваючы да галоўнага, ідэйнага (а глыбокіх, пранікнёных, супярэчлівых думак, асабістага аўтаравага болю тут — процьма) яшчэ і заблудныя душы тых, хто любіць, каб проста было цікава, займальна, чытэльна.



Юры Станкевіч

АСОБА

# УДУМЛІВЫ І ГЛЫБОКІ

Васіль ЖУКОВІЧ

**Генрых Далідовіч блізкі мне. Ды не таму, што ў адным — 1974-м — годзе мы дэбютавалі ў літаратуры: ён кнігай апавяданняў, я кніжкаю вершаў. І не таму, што абодва мы — заходнікі: ён — з-пад Налібоцкае пушчы, я — з-пад Белавежскае.**



Генрых Далідовіч падчас выступлення ў Дзяржаўным музеі Якуба Коласа

І не таму, што хodзім часта аднымі сцежкамі, непадалёк ад старажытнага Заслаўя, на нашых лецішчах, і нават адною карыстаемся драбінаю, якую разам змайстравалі, вольным часам гамонім пра літаратуру, культуру, нацыянальную ідэю, пра жыццё-быццё. Блізкі мне ён найперш таму, што ў ім, у сыне вясковага каваля, найлепшым чынам спалучылася сялянская любоў да зямлі, да працы на ёй з нічым не параўнанай інтэлігенцкай любоўю да літаратурнага поля, да бясконцае катаржнае творчае працы на гэтым неабсяжным полі. Каб незнаёмы чалавек паназіраў, як Генрых Вацлававіч шчырые на дачных сотках, сее і дагледае расліны, а пасля акуратна збірае ўраджай, то, пэўна, падумаў бы, што гэта яго асноўны занятак. А калі б ён уведаў, што і як стварыў знакаміты пісьменнік, што пасеяў для сучаснікаў і нашчадкаў на старонках сваіх шматлікіх апавяданняў, аповесцяў і раманаў і як дагледзеў кожную старонку, то не паверыў бы, што такі творца яшчэ на нешта знаходзіць час.

Усё Генрых робіць грунтоўна. І як не ўбачыш, каб ішоў ён задраўшы галаў (нясе яе трохі нахілена, падобна, нешта ўсё абдумвае), так не знойдзеш у яго твора, хутка збытага з рук, змайстраванага па прынцыпе цяп-ляп. Не выпадкова ад першага апублікаванага апавядання Генрыха Далідовіча да першага яго зборніка «Дажджы над вёскай» прайшло восем гадоў. Затое так прыхільна яго сустрэла літаратурная крытыка!

Ва ўсіх вядучых часопісах і ў колішнім «ЛІМе» з'явіліся рэцэнзіі. Выключна станоўчыя, нягледзячы на дробныя часам заўвагі. А благаславіў кнігу ў свет знаны В. Адамчык...

Героі пісьменніка — людзі простыя, як правіла — вясковыя, яны ўзятыя з той самай найраднейшае стыхіі, у якой ён сам нарадзіўся і рос. Пры ўсёй прастаце сюжэту яго проза дужа прывабная, ад яе цяжка адарвацца, як пачнеш чытаць. Да прыкладу, «Ліст да Олі» — апавяданне інтымнага характару. Аўтар не пабаяўся традыцыйнага трохкутніка, пабудаваў свой, непаўторны: Янак—Оля—Раман. Адметна тое, што няшчырае вяселле Олі з Раманам і шчырае каханне з Янакам адбываецца на вачах малога Пеці, якога Раман стараўся зрабіць даносчыкам. Расповед ідзе ад імя дарослага Пеці. І цешыць тое, што маладзіца праяўляе характар і вяртае нядаўна страчанае шчасце...

Да выхаду першае кнігі малады творца скончыў філфак БДУ(1968), настаўнічаў на Барысаўшчыне, служыў у арміі. У 1973 годзе яго запрасілі на працу ў рэдакцыю часопіса «Полымя», у аддзел прозы, якім кіраваў шматвопытны І. Пташнікаў. Тут Генрых хутка набываў не толькі рэдактарскі вопыт.

У эпіцэнтры літаратурнага жыцця, чытаючы штодня чужыя рукапісы, у тым ліку і масцітых, імкліва рос як пісьменнік. Рэгулярна, часам два гады запар, выходзілі з друку апавяданні і аповесці: «Цяпло на першацвет» (1976), «Маладыя гады» (1979), «Міланькі» (1980), «На новы парог» (1983), «Станаўленне»(1985).

Вядомасць, асабліва ў асяроддзі школьнай інтэлігенцыі, прынеслі аўтару аповесці пра вясковую школу, настаўнікаў:«Усё яшчэ наперадзе», «Завуч», «Дырэктар». Паспрыяў уласны вопыт працы ў школе.

Суровaю праўдай жыцця прасякнуты ўсе творы пісьменніка. Вось малады настаўнік («Усё яшчэ наперадзе») прыязджае ў чужую вёску працаваць. Яму думалася: «Буду даваць добрыя ўрокі, зацікаўлю дзяцей, арганізую літаратурны гурток, і мае паэты будуць друкаваць вершы не толькі ў раёнцы... Заўважаць і маю работу, маё стараннe, раскажуць па радыё, тэлебачанні. Фотакарэспандэнты, інтэрв'ю...» І вось ён прызнаецца, як яго «спусцілі з неба на зямлю дзеці: няўважліва слухалі, уцякалі з урокаў, а шасцікласнік Саша смела заявіў, што на трактарыста вывучыцца і без маёй мовы і літаратуры». Настаўнік разумее: інстытут не ўсё яму даў, сапраўдная школа жыцця пачынаецца тут, у вёсцы...

З усіх рэцэнзій на кнігі Генрыха Далідовіча мяне найлепш уразіла мудрае і зычлівае слова Валянціна Тараса «Апазнавальныя знакі таленту» («Маладосць», 1976, №10),чалавечая і грамадзянская пазіцыя рэцэнзента: «...апазнавальныя знакі таленту адразу былі ў наяўнасці ў Генрыха Далідовіча: добрая, жывая, вобразная мова, адчуванне чалавека, характару, своя інтанацыя, своя канцэпцыя жыцця. Але ёсць яшчэ адзін апазнавальны знак таленту, які сам па сабе не даецца, як кажуць, Богам, а здабываецца. Гэты знак — грамадзянская смеласць пісьменніка, яго імкненне не абыходзіць вострыя вуглы жыцця. Хацелася б, каб гэты знак больш выразна быў накрэслены на крылах таленту Генрыха Далідовіча».

Дасведчаны чытач цяпер, пэўна, ведае, што без такой смеласці пісьменнік не стварыў бы раманы «Гаспадар-камень»(1986), «Пабуджаныя» (1988), «Свой дом» (1992), якія склалі трылогію, прысвечаную аднаму з найскладаных і драматычных момантаў нашай нядаўняй гісторыі: станаўленню беларускае дзяржаўнасці ў 1917—1919 гадах. У аснове трылогіі — ідэя пабудовы свайго беларускага дома і паказ абуджэння і гартавання нацыянальнае свядомасці. Вялікую ролю аўтар надаў стварэнню вобразаў рэальных дзеячоў тагачаснага грамадскага і культурнага руху: Зміцера Жылуновіча (Цішкі Гартнага), Аляксандра Чарвякова, Язэпа Дылы. Пераканаўча паказаны і ворагі беларушчыны: Сталін, Мяснікоў, Ландар, Кнорын...

За раман «Заходнікі» аўтар уганараваны Дзяржаўнай прэміяй імя Якуба Коласа (1996 г.). У ім адлюстравана заходнебеларуская рэчаіснасць першых пасляваенных гадоў. Час гэты быў поўны чалавечых драм. Цяпер бальшавікі дабраліся і да былой Заходняй Беларусі, і тут яны жорстка ўсталёўваюць свае сталінскія парадкі, пазбаўляюць людзей права быць гаспадарамі на зямлі, сваёй зямлі, гвалтоўна разбураюць уклад спаконвечнага сялянскага жыцця, а таксама і сістэму чалавечых каштоўнасцяў. Пісьменнік смела стварае злавесны вобраз камуніста-падонка, старшыні сельсавета Кураглядава, надзеленага рэальнаю ўладай, які варожа ставіцца да людзей. Ён упэўнены, што ўсе тут супраць лініі партыі, «тут зона неспакойная», маўляў, заходнікі, бандыты... «Душагуб, людаед, нелюдзь», — так гавораць пра старшыню Сцяпан Грыгарцэвіч, якога Кураглядаў забівае па-бандыцку ў лесе. І да гэтага ў старшыні былі ўжо рукі ў крыві: ягонаю ахвяраю стаў Сцяпанаў дзядзька Францішак. На прыкладзе сям'і Грыгарцэвічаў аўтар рамана паказвае, як злачынная ўлада рассяляньвала беларускую вёску, не давала вольна дыхаць руплівым гаспадарам.

Генрых Далідовіч разгарнуў свой яскравы талент пісьменніка гісторыка-эпічнага мыслення. Напрыканцы XX стагоддзя ён капнуў глыбокія пласты нашай старажытнай гісторыі — звярнуўся да XIII стагоддзя і стварыў раман «Кліч роднага звона» (1997), у якім паказаў лёсавызначальны перыяд, калі зараджалася ВКЛ са сталіцаю ў Навагрудку, які тады называўся Навагародак. Уладарыў у той час князь Міндоўг. Да гонару раманіста, постаць слыннага князя атрымалася жывая. Неспрыяльныя тагачасныя палітычныя варункі падштурхоўвалі нашую старажытную бацькаўшчыну да магутнага дзяржаўнага ўтварэння з мэтаю незалежнага існавання ў свеце.

Шырокія мастацкія палотны даюцца-ўдаюцца далёка не кожнаму творцу. Тут, на гэтай шчодра-ўрадлівай глебе, Генрых Далідовіч пацалаваны Богам. А што дзеецца з яго малым жанрам, з якога ён пачынаў сваю няўрымслівую творчую дарогу? Пісьменнік не толькі не занядбаў апавяданне, а й развіў, значна паглыбіў і, значыць, узбагаціў яго, што засведчыла арыгінальная кніга «Жар кахання» (1996).

Хачу назваць гэтую прозу і вытанчанай, і гарачай. Вытанчанай — па майстэрству падачы самых далікатных пачуццяў, а гарачаю — па напале жарсцяў.

Адна з найбольш узрушальных у кнізе «Жар кахання»— гісторыя з 30-х гадоў мінулага стагоддзя пад найменнем «Іста». Іста — дзявочае імя, яно расшыфроўваецца: «Іосіф Сталін», што высвятляецца, калі малады паэт Алесь знаёміцца з юнаю прыгажуняю. Цікавая адзнака часу: многія людзі, адурманеныя камуністычнай ідэалогіяй і тадышнімі правадырамі, нярэдка давалі сваім дзецям падобныя імёны. Спакваля разгортваецца інтрыгуючы сюжэт. Двух маладых даволі хутка зблізае каханне...

Якое трывожнае было іх шчасце і як урэшце ўсё ў іх зладзілася, чытач, спадзяюся, пацікавіцца сам. Адно скажу: у шчаслівую сям'ю зусім нечакана ўварваўся рэпрэсіўны ўраган, увыніку Іста гіне на лесапавале, бацьку, камдыва, як «саўдзельніка банды Тухачэўскага» расстрэльваюць. Алесь каля дваццаці гадоў пакутуе ў таежным лагеры. Потым упершыню сустракаецца са сваім дарослым сынам, народжаным Істай...

На вокладцы кніжкі Г. Далідовіча «Сярод лесу, сярод поля» (2007) я прачытаў як анонс словы з яго новага рамана «Заняволены Дом»: «Калі не можаш рабіць тое, што трэба, і не хочаш хлусіць, дык і замаўчы на час, навучыся не аглумляцца ліхам. Здолей вылечвацца горам, прагай новага, ажыўляй засмучанае сэрца, сам ніколі (!) не абмельвай душу, каб яна не была галечная, напаўняй яе годнасцю. Найперш у цяжкую хвіліну вытрымкай і працай можна стаць самім сабой, Асобаю...».

А нехта, не дужа дасведчаны ў творчасці Генрыха Далідовіча, можа залічыць яго ў шэрагі «ціхіх» пісьменнікаў. Цікава, як у сваёй «Аўтабіяграфічнай нататцы» Іван Бунін выказваўся адносна крытычнай думкі пра яго творчую асобу: «...жыццёвы шлях мой быў даволі незвычайны, і пра яго і ўвогуле пра мяне доўга існавала даволі скажонае ўяўленне... І атрымлівалася так, што няма пісьменніка больш ціхага («пясняр восені», смутку, дваранскіх гнёздаў і да т. п.)..., чым я. А між тым чалавек жа я быў зусім не ціхенькі...».

Што да нашага Генрыха Вацлававіча Далідовіча, то дадам: ён ніколі ні ў літаратуры, ні ў жыцці не быў крыклівы, што аніяк не падпадае пад характарыстыку: «ціхі».

Не ціхі ён, а ўдумлівы, глыбокі — у свае плённыя 65 гадоў.

ПАЛІЦА

# І ПОТЫМ НАНАВА ПАЧАЦЬ…

**У гэтым нумары «Літаратурнай Беларусі» новыя выданні анансуе літаратурны бюлетэнь «Кніганоша», супольны праект Саюза беларускіх пісьменнікаў і Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына».**

**Бюлетэнь, які папулярызуе кнігі беларускіх незалежных выдавецтваў, штоквартальна рассылаецца ў папяровай і электроннай версіях у бібліятэкі і беларусазнаўчыя цэнтры нашай краіны і свету.**

### Адамовіч Славамір. Рым: выбраныя вершы. 2002—2010. Беларусь — Нарвегія: вершы. — Мінск: Медысонт, 2011. — 108 с.




Вершы Славаміра Адамовіча па-ранейшаму закранаюць адвечна хвалюючыя душу чалавечую пытанні кахання, волі, ладу ў грамадстве і лёсу Бацькаўшчыны.

На паэтычнай ніве яны выяўляюць арыгінальнага і адметнага сваім майстэрствам аўтара. Назва кнігі адпавядае аднайменнаму вершу, які ўключаны ў гэтую кнігу. Як тлумачыць сам аўтар, ён хацеў «даць другое жыццё беларускаму слову «рым». Яно азначае стан неспакою, рымецць — выказваць неспакой, хвалявацца».

### Гілевіч Ніл. Збор твораў у 23 тамах. Том 2: паэзія. — Мінск, 2010. — 496 с.




У другі том Збора твораў Народнага паэта Беларусі ўвайшлі лепшыя, на думку аўтара, вершы лірычнага і ліра-эпічнага характару, напісаныя ў перыяд з 1991 па 2010 год — за 20 гадоў творчай працы. Гэты перыяд — ад першых гадоў незалежнасці Беларусі да нашых дзён — адзін з самых плённых у творчасці Ніла Гілевіча. Новая кніга — працяг задуманага аўтарам Збора твораў у 23-х тамах, які славуты паэт выдае за свой кошт.

### Дудзіцкі Уладзімір. Творы. Укладанне, прадмова і бібліяграфічны каментарый Л. Юрэвіча. — Мінск: Лімарыус, 2010. — 400 с.




Гэты Збор твораў Уладзіміра Дудзіцкага (нар. 1911, пам. пасля 1976) з'яўляецца першым у Беларусі і найбольш поўным на сёння выданнем творчай спадчыны беларускага літаратара-эмігранта, які нарадзіўся ў в. Дудзіцы (сёння Пухавіцкі р-н).

Пакінуўшы радзіму ў 1944 г., аўтар прайшоў шлях праз Аўстрыю ў Венесуэлу, ЗША, Германію і зноў ЗША, дзе ягоны след згубіўся. Выданне твораў мусіла б стаць сапраўдным «вяртаннем» Уладзіміра Дудзіцкага ў Беларусь.

### Курыльчык Рышард. Нязломны з Назарэта: аповесць. Пераклад з польскай Анатоля Бутэвіча; ілюстрацыі Паўла Татарнікава. — Мінск: Кавалер, 2010. — 80 с.




У аповесці распавядаецца пра апошнія гады зямнога жыцця Ісуса Хрыста. Гэта — захапляльны мастацкі твор, арыгінальны як паводле зместу, так і па форме. Падзеі трох гадоў зямнога жыцця Ісуса Хрыста асвятляюцца ў розных па памеры раздзелах аповесці — «дванаццаці гадзінах». Адзінаццаць з іх надзвычай насычаны інфармацыяй, а апошняя — «гадзіна дванаццатая» — не мае тэксту. І ў гэта аўтарам закладзены глыбокі філасофскі сэнс: эпіграф аповесці прымушае асабліва задумацца на апошняй гадзіне: каго яна сапраўды забівае, у чым сэнс ахвярнай смерці Ісуса Хрыста на крыжы, што ёсць жыццё чалавека і для чаго ён жыве. Урэшце, што ёсць час, яго гадзіны ў жыцці чалавека, і што ёсць час Збавіцеля.

### Леденев Виктор. Очки: пьесы, рассказы, стихи. — Минск:Ковчег, 2010. — 316 с.




У творчасці вядомага пісьменніка, чалавека з незвычайным лёсам Віктара Ледзянёва цесна і часам сапраўды мудрагеліста перапляліся багаты жыццёвы вопыт аўтара і ўмелая выдумка. У яго драматургіі, прозе і паэзіі знайшло адбітак усё, што так блізка Віктару Ледзянёву, і чаму ён ніколі не здраджваў: любоў да людзей, святая памяць, праўдзівасць і гонар, які яго героі гатовыя адстойваць нават коштам уласнага жыцця, будуць гэта салдаты мінулых ці гіпатэтычных войнаў, вялікія музыканты ці падабныя дэтэктывы, юнакі ці убеленыя сівізной мудрацы.

### Няўвесь Алесь. Пустадомкі: вершаваныя фельетоны. — Смаленск: Універсум, 2011. — 431 с.




У чарговую кнігу Алеся Няўвеся — сучаснага Кандрата Крапівы, які не азіраецца на цэнзуру і цэнзараў — увайшлі фельетоны, напісаныя ў 2010 годзе. Гратэск, метафарычнасць, дасціпнасць, лёгкі стыль — усё гэта ўласціва творам аўтара.

З творамі са сваіх папярэдніх кніг аўтар прапануе пазнаёміцца на сваім сайце www.alesnauwes.com.

### Разанаў Алесь. З Вяліміра Хлебнікава: паэзія. — Мінск: Логвінаў, 2011. — 76 с.




Кніга — білінгва: у ёй змешчаны вершы Вяліміра Хлебнікава ў мове арыгінала і «з», здзейсненыя Алесем Разанавым у беларускай мове. Паэзію В. Хлебнікава перакладаць немагчыма, таму А. Разанаў не перакладае вершы, а «здзяйсняе» — спаборнічае з аўтарам і на аснове яго вершаў перастварае іх на беларускай мове, у чым можна пераканацца, параўнаўшы верш «Павысыпаліся з меха» з арыгіналам.

### Разанаў Алесь. І потым нанава пачаць: квантэмы, злёсы, вершы. — Мінск: Логвінаў, 2011. — 102 с.




«Квантэма, злёса, верш… — творы, што сабраліся ў гэтай кнізе, сваімі каранямі скіроўваюцца ў глыб пачатку, сваімі галінамі — у яго вышыню», — адзначаецца ў анатацыі да кнігі. Сапраўды, гэтая кніга, нібы падсумаванне, утрымлівае вершы, што былі напісаныя ў пачатку шляху і тыя, што «ўрэчаісніліся» зусім нядаўна. А назву кнізе даў радок з вядомага ўсім верша, што пакідае чытача ў чаканні новых твораў:

*...я маю права*
*ўсё закрэсліць*
*і потым нанава пачаць. (1964 г.)*

### Рыжкоў Віталь. Дзверы, замкнёныя на ключы: вершы. — Мінск: Логвінаў, 2010 — 108 с.




Першая кніга вершаў Віталя Рыжкова змяшчае выбраныя тэксты, напісаныя ў Магілёве і Мінску з 2002 па 2010 гады, асобны раздзел склалі паэтычныя пераклады. На аўдыёдадатку да кнігі змяшчаючца пакладзеныя на музыку вершы і пераклады ў непаўторным выкананні аўтара і перакладчыка.

### Шалкевіч Віктар. Requiem па непатрэбных рэчах: проза. — Гродна: Гарадзенская бібліятэка, 2011. — 100 с.




«Рэквіем…» — гэта дваццаць эсэ Віктара Шалкевіча. Як адзначае сам аўтар, «у кожнага чалавека знойдуцца ў хаце дзесяць-дваццаць рэчаў, якія абсалютна непатрэбныя, але расстацца з якімі няма сілы. Гэтая кніга — адначасова і падзяка, і вечная памяць тым рэчам, малым і вялікім, сярод якіх мы гадаваліся, якія калісьці былі патрэбныя і ўсіх нас зрабілі такімі, якімі мы ёсць цяпер, а не іншымі». Выданне праілюстравана здымкамі з прыватнага альбома аўтара.

### Шміт Катрын. Ты не памрэш: раман. Пер. з нямецк. А.Бахарэвіч — Мінск: «Макбел», 2011. — 264 с. — (Бібліятэка нямецкай літаратуры)




Гэлена Везэндаль не ведае, што з ёй. Яна прыходзіць у прытомнасць у бальніцы з праваламі ў памяці, страціўшы здольнасць размаўляць і кантраляваць сваё цела. Па дарозе назад да жыцця яна сутыкаецца з чужою жанчынай, якою была некалі яна сама, са шлюбам на мяжы разрыву і дзецьмі, якія былі гатовы ісці сваёю дарогай, але цяпер, заблытаўшыся, спыніліся. Гэты ні на што не падобны раман захоплівае дзякуючы сваёй унутранай дынаміцы і асабліва дзякуючы пераканаўчаму аповеду пра тое, як чалавек наноў вучыцца размаўляць. Раман узнагароджаны Нямецкай кніжнай прэміяй.

### Шчур Макс. Ліст, знойдзены на папялішчы: апавяданні. — Познань: Белы Крумкач, 2011. — 203 с.




«Кніга — вынік пэўнай стомленасці ад літаратуры, ад змагання з ёю ці «за» яе, свайго кшталту капітуляцыяй: як мінімум, пацверджаннем вядомага тэзісу, што «ўсё вартае ўжо было створана» — нездарма значную яе частку складаюць літаратурныя пароды, выраз пашаны і зайздрасці да маіх улюбёных аўтараў мінулага стагоддзя, імёны якіх залішне вядомыя, каб іх называць» — адзначае аўтар у прадмове да кнігі.

### Янсан Тувэ. Камета над далінай мумітроляў. Пераклад са шведскай Насты Лабады і Алесі Башарымавай; ілюстрацыі Тувэ Янсан. — Мінск: Зміцер Колас, 2011. — 154 с.: іл.




Гэтая казачная аповесць — другая з серыі кніг, прысвечаных мумітролям, чароўным і забаўным істотам, прыдуманым і намаляваным выдатнай фінскай пісьменніцай і мастачкай Тувэ Янсан (1914—2001). Адрасуецца дзецям малодшага школьнага ўзросту, а таксама ўсім аматарам і заўзятарам мумітроляў.

Выдаўцы абяцаюць выхад у хуткім часе новых кніг пра мумітроляў па-беларуску.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 1 ЛІПЕНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.25** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.15** «Сваты-3». Камедыйны серыял (Украіна). 4-я серыя.
**13.15** «Партызаны супраць Вермахта». Мастацка-публіцыстычны фільм (Беларусь). 3-я і 4-я серыі.
**14.15** «Сінематэка».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Эпоха».
**16.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда»(Украіна).
**17.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Урачысты сход і святочны канцэрт, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.
**23.35** Фантастычны трылер «1408» (ЗША).
**01.20** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Зачараваны Ўчастак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** ДО РЭ: Ігар Мікалаеў».
**23.10** Фільм «Памятай мяне», ЗША, 2010.
**01.05** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мiншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**09.00** Фільм «Вам - заданне». Беларусь.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Забойная сіла 3». Серыял.
**15.40** «Next 3». Серыял.
**16.50** «Ля параднага пад'езду».
**17.20** «Мiншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «На спіне ў чорнага ката». Беларусь, 2008 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Вялікі жывы канцэрт у Віцебску.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыя «Рэпетытар».
**10.45** Час футболу.
**11.15** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**12.15** Прыгодніцкі фільм «Апошняе лета дзяцінства» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**13.25** Жывы гук.
**14.10** Кінаспробы.
**14.30** «Рэальны свет».
**15.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.05** Медычныя таямніцы.
**16.40** Медычныя таямніцы +.
**16.50** Бітва экстрасэнсаў.
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.50** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**20.35** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Паўфінал.
**23.05** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**23.45** «Пра мастацтва».
**00.15** Дыялогі аб рыбалцы.
**00.40** Бітва экстрасэнсаў.

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Смерць Вазір-Мухтара».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Смерць Вазір-Мухтара».
**22.15** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**00.00** Навіны - Беларусь.
**00.10** Фільм «Прысуд».

---

НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.20** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Гадзіна Волкава».
**23.00** «Песня для вашага століка».
**00.05** Псіхалагічны трылер «Гульня слоў».

---

EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Германія - Нігерыя (Германія).
**11.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**11.15** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў (Мексіка). 1/8 фіналу.
**12.15** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў (Мексіка). 1/8 фіналу.
**13.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў (Мексіка). 1/8 фіналу.
**14.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Германія - Нігерыя (Германія).
**15.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**16.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Японія - Мексіка (Германія).
**18.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў (Мексіка). 1/8 фіналу.
**19.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Новая Зеландыя - Англія (Германія).
**21.10** Навіны.
**21.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**21.30** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня. Часопіс.
**22.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Сербія).
**23.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір КО.
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір КО.
**00.55** Навіны.
**01.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Новая Зеландыя - Англія (Германія).
**02.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Чароўнае дрэва», серыял: 4 серыя.
**07.45** «Гняздо», серыял: 5 серыя.
**08.40** Навігатар.
**08.55** «Euromaxx».
**09.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пікнік з клоунам», дак. фільм, Польшча.
**09.55** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**10.45** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г., Германія: 3 серыя, «Венгрыя. Вартаўнік жалезнай заслоны».
**11.40** Беларусы ў Польшчы.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Quo Vadis», тэлесерыял: 1 серыя.
**12.50** «Чароўнае дрэва», серыял: 4 серыя.
**13.15** «Гняздо», серыял: 5 серыя.
**14.05** «Euromaxx».
**14.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пікнік з клоунам», дак. фільм, Польшча.
**15.05** Навігатар.
**15.25** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г., Германія: 3 серыя, «Венгрыя. Вартаўнік жалезнай заслоны».
**16.15** Рэпартэр.
**16.45** YoLife!
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял: 4 серыя.
**17.30** Без рэтушы: «Афганец», дак. фільм, 2009 г.
**17.55** Форум: «Інваліды ў Беларусі».
**18.35** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.35** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.40** Аўтастопам праз Еўропу.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 1 серыя, «Парагвай».
**22.15** «Пітбуль», серыял: 17 серыя.
**23.05** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.15** Аб'ектыў.

## 2 ЛІПЕНЯ, СУБОТА

---

**06.50** Мультфільмы.
**07.25** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.40** «Шэф-кухар».
**10.40** «Пасля кірмаша». Камедыя.
**12.10** Сямейная драма «Дрэвы на асфальце» («Беларусьфільм»).
**13.35** «Партызаны супраць Вермахта». Мастацка-публіцыстычны фільм (Беларусь). 5-я і 6-я серыі.
**14.30** Відэафільм АТН « Карані дзяржаўнасці» цыклу «Зямля беларуская».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** «Юнацкасць у пагонах». Адмысловы рэпартаж АТН.
**17.00** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША).
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.30** «Месца сустрэчы». Музычна-забаўляльная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.40** Дэтэктыў «У жніўні 44-га…» (Беларусь-Расія).
**23.45** Канцэрт «Легенды «Рэтра FM» (2005).

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Смак жыцця».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**12.55** Камедыя «Запаветнае жаданне». ЗША, 2003 год.
**14.30** Фільм «Тытунёвы капітан».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Прапанаваныя абставіны». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Камедыя «Сем'янін».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Франц і Паліна». Расія.
**23.15** Драма «Чорная кніга».

---

**07.00** «Сапраўдная гісторыя».
**07.30** Фільм «На спіне ў чорнага ката». Беларусь, 2008 г.
**09.00** Фільм «Цешча». СССР, 1973 г.
**10.15** «Мінск і мінчане».
**10.50** Фільм «Беларускі вакзал». СССР, 1970 г.
**12.40** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.10** СТБ прадстаўляе: «Пяты фронт». Дакументальны фільм. Частка першая.
**14.00** Фільм «Белыя росы». СССР, 1983 г.
**15.40** СТБ прадстаўляе: «Пяты фронт». Дакументальны фільм. Частка другая.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Кадэт». Беларусь, 2009 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** СТБ прадстаўляе: «Гісторыя кахання». Юбілейны канцэрт.
**23.50** Фільм «Ворагі». Расія - Беларусь, 2007 г.

---

**08.00** «Загадкі дзеда Кандрата». Дакументальны фільм (НГТРК).
**08.25** Смешная часіна.
**08.55** Жансавет.
**09.30** Дача здароўя.
**10.05** Кінааповесць «Іван Макаравіч».
**11.35** Тэлебарометр.
**11.40** Нашы тэсты.
**12.20** Дыялогі аб рыбалцы.
**12.50** Рэальны свет.
**13.20** «Страсці па культуры».
**14.05** Серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**15.00** Гістарычны баявік «Бітва ля Чырвонай Скалы» (Кітай).
**17.35** Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору.
**19.15** Рамантычная камедыя «Таму што я так хачу» (ЗША).
**21.00** КЕНО.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.20** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч за 5-е месца. Прамая трансляцыя.
**23.05** Жывы гук.
**23.50** Фільм нашай памяці «Беларускі вакзал» (СССР).

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Фільм «Адзін і без зброі».
**08.20** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Прысуд».
**13.30** Мультфільмы.
**13.45** «Уся Расія».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.15** «Улада факту».
**16.00** Фільм «Маладая жонка».
**17.40** «Суботні вечар».
**19.25** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Прэм'ера. Фільм «Дублёрка». 2011 г.
**00.00** Фільм «Ваш прыпынак, Мадам!».

---

НТВ

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Агляд».
**08.45** «Медыцынскія таямніцы».
**09.25** «Увага: вышук!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Жывуць жа людзі!».
**11.00** «Кулінарны паядынак».
**12.00** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.10** «Вочная стаўка».
**18.05** «Выратавальнікі».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**19.55** «Праграма Максімум».
**21.00** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**21.55** «Ты не паверыш!».
**22.50** «Апошняе слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**23.50** Прэм'ера. Крымінальны баявік «Элітны атрад».

---

EUROSPORT

**09.30, 18.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Новая Зеландыя - Англія.
**11.00, 22.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**11.15** Вось дык так!!!
**11.30** Веславанне на байдарках і каноэ. Кубак свету. Слалам (Францыя).
**13.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». 1-ы этап.
**14.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Гонка 1-я.
**14.55** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». 1-ы этап.
**19.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. ЗША - Калумбія (Германія).
**21.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. КНДР - Швецыя (Германія).
**22.15** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір «Залатая слава» (Масква, Расія).
**23.30** Конны спорт. Турнір Global Champions (Партугалія).
**01.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. ЗША - Калумбія (Германія).
**01.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. КНДР - Швецыя (Германія).
**02.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25, 12.00** «Машына зменаў», тэлесерыял: 4 серыя.
**07.50** Калыханка для самых маленькіх.
**08.30, 13.20** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**09.20** Праект «Будучыня».
**09.50** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 1 серыя, «Парагвай».
**10.45** МакраФон: «Рок-карона: 1997–1999 гг.»: ч. 1.
**11.15** Аўтастопам праз Еўропу.
**11.35** Без рэтушы: «Афганец», дак. фільм.
**12.30** Калыханка для самых маленькіх.
**13.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**14.10** Праект «Будучыня».
**14.40** Форум: «Інваліды ў Беларусі».
**15.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**15.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**15.35** «89 міліметраў», дак. фільм, 2004 г., Германія–Беларусь.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 18 серыя.
**17.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.55** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 1 серыя, «Парагвай».
**18.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Госць «Белсату».
**20.05** Еўропа сёння.
**20.30** Рэпартэр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Невядомая Беларусь: «Зямля ў палоне», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**21.50** Суботні сеанс: «Увага, дзверы зачыняюцца», маст. фільм, 1998 г., Вялікабрытанія–ЗША.
**23.25** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**00.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.20** Аб'ектыў.

ТРАДЫЦЫІ

# ЛЕВЫЯ СУПРАЦЬ БУРШАЎ

Алег НОВІКАЎ

**Самы стары студэнцкі прафсаюз Германіі можа быць забаронены з-за напісанага яшчэ ў XIX стагоддзі статуту, які патрабуе прымаць у шэрагі арганізацыі выключна тых, хто мае нямецкую кроў.**



На ўкраінскім моладзевым жаргоне прафесійна-тэхнічная вучэльня (ПТВ) называецца «бурса», а яе гадаванцы — «бурсакі». Нягледзячы на тое, што ў апошнія часы ПТВ стала модна называць тэхнічнымі каледжамі, назвы «бурса» і «бурсакі» захаваліся, як і старыя стэрэатыпы адносна іх. Лічыцца, што бурса — месца для лузераў, якія не здолелі закончыць 11 класаў і пайсці ў ВНУ.

Парадаксальна, аднак слова «бурса» ў Германіі ўспрымаецца абсалютна інакш. Бурсамі (па-нямецку буршэншафтамі) называюцца элітарныя таварыствы студэнтаў. У свой час праз буршэншафты прайшлі такія вядомыя асобы, як Карл Бош (хімік і заснавальнік славутай фірмы), Фердынанд Паршэ (аўтабудаўнік), Макс Вебер (сацыёлаг), Фрыдрых Ніцшэ (філосаф), Робер Шуман (музыкант), Віктар Адлер (бацька аўстрыйскай сацыял-дэмакратыі), Тэадор Герц (заснавальнік руху сіяністаў) і г.д.

Увогуле, «буршы» — так называюць сяброў буршэншафтаў — прадукт нямецкай палітычнай культуры пачатку XIX стагоддзя. Моладзь, якая пратэставала супраць французскай акупацыі, а пасля — расійскага дамінавання над раз'яднанай Германіяй (тут існавала аж 36 дзяржаваў) шукала формы арганізацыі. Аптымальным асяродкам сталі студэнцкія таварыствы. Дарэчы, цяперашні чорна-чырвона-жоўты сцяг Германіі нарадзіўся падчас студэнцкай маніфестацыі ў 1817 годзе. Падчас той акцыі ўзнікла і практыка паліць кнігі, якую пазней пасля пераnялі нацысты. Цягам першага кніжнага аўтадафэ ў агонь ляцелі творы самых рэакцыйных пісьменнікаў Германіі.

Сярод кніг, якія палілі буршы, былі творы Аўгуста фон Кацэбу — драматурга і раманіста, а яшчэ агента царскага ўраду. У 1819-м радыкальны бурш Карл Людвіг Санд падчас прыватнай аўдыенцыі ў Аўгуста фон Кацэбу ўваткнуў яму ў горла кінжал. Забойства вітала ўся прагрэсіўная Еўропа. У далёкай Расіі Аляксандр Пушкін прысвяціў Санду верш «Кінжал». Аднак руху буршаў выхадка Санда дорага каштавала. На саміце кіраўнікоў нямецкіх дзяржаў у Карлсруэ аўстрыйскі міністр Мітэрлінх дабіўся прыняцця агульнай заявы аб пераследу буршэншафтаў. Таварыствы сышлі ў падполле і цалкам адрадзіліся падчас рэвалюцыі 1848 года.

Рэспубліканскі прагрэсіўны імідж руху буршаў знік пасля франка-прускай вайны. У аб'яднанай Германіі буршы сталі ультрапатрыётамі. Бісмарк зрабіў з іх свой «БРСМ». У 1882 годзе быў заснаваны праўладны Агульнагерманскі саюз буршаў (ADB).

Кансерватары задавалі тон у буршэншафтах і ў часы Веймарскай рэспублікі. У 1920 годзе, задоўга да прыходу Гітлера да ўлады, у буршэншафтах было забаронена сяброўства яўрэяў. А ў часы дыктатуры NSDAP Герман Гес, які адказваў за моладзевую палітыку нацыстаў, прымусова запісаў іх у Нацыянал-сацыялістычны саюз нямецкіх студэнтаў. Усе буршэншафты былі забароненыя.

Пасля вайны буршэншафты пачалі стыхійна адраджацца. Натуральна, у акупаванай Саветамі зоне хутка гэтую лавачку прыкрылі. Праўда, ніякіх шансаў у буршаў на тое, каб легальна існаваць у ГДР апрыёры не было. Адроджаныя буршэншафты лічылі, што мяжа Одэр–Нэйсэ штучная. Яны сістэматычна пастаўлялі кадры для кансерватыўных і правых палітычных груповак. Напрыклад, сябры аўстрыйскіх буршэншафтаў дасюль патрабуюць уваходжання Аўстрыі ў склад Германіі.




Студэнцкая рэвалюцыя 1968 года выклікала некалькі расколаў унутры буршэншафтаў, аднак раскольнікі не здолелі стварыць кансалідаваны полюс. Толькі ў 1996-м ліберальнае крыло буршаў здолела аб'яднацца ў рамках так званага Neue Deutsche Burschenschaft (Новы нямецкі буршэншафт). Адзін з пунктаў статуту арганізацыі спецыяльна патрабуе ад яе сяброў прызнання сучасных межаў ФРГ.

Тое, што кансерватыўныя па сваёй прыродзе буршэншафты дасюль існуюць і застаюцца дастаткова ўплывовым грамадскім інстытутам (у Бундэстагу 6 дэпутатаў з былых буршаў), даўно не падабаецца левым партыям. Яшчэ больш не падабаецца феномен буршаў феміністкам. Жанчын у буршы прынцыпова не прымалі, а каштоўнасці буршаў заўсёды будаваліся на кульце мужчыны, якому мора

**Студэнцкая рэвалюцыя 1968 года выклікала некалькі расколаў унутры буршэншафтаў, аднак раскольнікі не здолелі стварыць кансалідаваны полюс**

па калена. Доўгі час лічылася, што кожны нармальны бурш павінен мець шнар на твары — след бойкі на шпагах. Фішкай буршаў з'яўляюцца буйныя п'янкі. Гораду Эйзенаху, дзе кожны год буршы ўзгадваюць маніфестацыю 1817 года, чатыры дні гулянняў студэнтаў прыносяць 10 мільёнаў еўра.

Аднак зараз над рэліктам эпохі Бісмарка, здаецца, збіраюцца хмары. 13 чэрвеня кіраўніцтва Deutsche Burschenschaft выключыла са сваіх шэрагаў арганізацыю ў Манхейме. Прычына была ў тым, што ў Манхейме ў буршы прынялі юнака кітайскага паходжання (дарэчы, ён паспеў паслужыць у Бундэсверы).

Інцыдэнт стаў падставай агульнанацыянальнай дыскусіі. Буршаў абвінавачваюць у расізме.

Самі буршы пакуль робяць выгляд, што нічога асаблівага не здарылася. На сайце Deutsche Burschenschaft нападкі на аб'яднанне характарызуюць як «эмацыйную дыскусію». Пры гэтым робіцца спасылка на тое, што ўсё было адпаведна статуту ад 1815 года: пры выключэнні секцыі з Манхейму лідары буршаў кіраваліся пунктам, які дазваляе прыймаць у арганізацыю выключна немцаў. Асобы, якія не маюць еўрапейскага паходжання, згодна дакументу, «не з'яўляюцца прыналежнымі да нямецкага народа».

Спасылка на дакумент, прыдуманы ў часы нацыянальнай барацьбы нямецкага народа, палка з двума канцамі. Пункт супярэчыць прынятаму ў 2000 годзе закону аб грамадзянстве. У тым годзе ўрад эсдэкаў і Зялёных пастанавіў, каб прыналежнасць да нямецкай нацыі вызначалася не па прынцыпу крыві, а па прынцыпу месца нараджэння.

Такім чынам, у апанентаў буршаў з'явілася прававая падстава патрабаваць забароны карпарацыі. Варта згадаць, што ў 2007 годзе партыя Левыя ўжо патрабавала ад ураду забароны буршаў. Тады ўрад не знайшоў для гэтага падстаў. Цяпер Левыя, хутчэй за ўсё, зноў будуць патрабаваць забароны. «Нямецкія буршэншафты праявілі сябе як частка аўтарытарнай, нацыяналістычнай, структурнай кансерватыўнай традыцыі», — ужо заявіла Петра Рэнер, эксперт Левых па ўнутранай палітыцы. Яшчэ адзін матыў для Левых, каб атакаваць буршаў, — кампанія ў нямецкай прэсе. Левых вінавацяць у антысемітызме з-за надзейнай рэзалюцыі супраць Ізраілю. Заклік забараніць буршаў, якія сімпатызуюць правым, можа палепшыць антыфашысцкае рэнаме партыі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Стабільная яшчэ ўчора Беларусь сёння развальваецца адамаль што дзённых скачкоў інфляцыі. І выратаваць Аляксандра Лукашэнку, які губляе ўладныя рычагі, можа толькі распродаж дзяржаўнай уласнасці ў інтарэсах замежных крэдытораў.

**From.ua (Украіна)**

Пратэсты супраць шырокіх санкцый паступілі з боку Італіі і Латвіі, дзвюх дзяржаў са значнымі дзелавымі інтарэсамі ў Беларусі. Аднак у канчатковым выніку дыпламаты прынялі рашэнне на карысць самага поўнага набору санкцый з усіх магчымых.

**«Independent» (Вялікабрытанія)**

Меры, якая прымае Беларусь (абмежаванні крэдытавання і куплі валюты прыватнымі прадпрымальнікамі, якія закупляюць расійскія камплектуючыя), з'яўляюцца парушэннем дамоваў Мытнага саюза і зоны свабоднага гандлю. Страты ад такіх абмежаванняў складаюць дзясяткі мільёнаў долараў. Пагрозы могуць застацца пагрозамі — Лукашэнка цяпер не ў тых умовах, каб не выконваць патрабаванні Расіі па крэдыце, а акрамя крэдыту іншых мер па выйсці з крызісу ў Беларусі не відаць. Словы пра закрыццё межаў і абмежаванне імпарту сведчаць пра эканамічную агонію беларускага рэжыму.

**«Ведамасці» (Расія)**

Аднак і атрыманне крэдытаў можа не выратаваць беларускую эканоміку, лічаць эксперты. Гэтыя крэдыты дапамогуць выйсці з бягучай сітуацыі, гэта значыць прытармазіць падзенне. Але насамрэч іх хопіць у лепшым выпадку для таго, каб забяспечыць існаванне рэспублікі да канца года, крыху ўзняць узровень жыцця і стабілізаваць сітуацыю. Але насамрэч з новага года праблемы паўстануць па-новаму. Не сакрэт, што крэдыты пойдуць не на рэструктурызацыю эканомікі, яны будуць выдатканы на падтрыманне статус-кво.

**«Аззатык» (Казахстан)**

У Лукашэнкі засталося 2–3 гады. Гэты тэрмін у яго апошні, таму што апошнія прэзідэнцкія выбары паказалі: нягледзячы на тое, што ён трымаў уладу, ён не мог вырашыць ніводнай унутрыпалітычнай, знешнепалітычнай ці эканамічнай праблемы. Той крызіс, які разгарнуўся, толькі лішні раз даказвае неэфектыўнасць дзейснай мадэлі ва ўмовах атрымання датацый з боку Расіі. У 2015 годзе пройдуць новыя прэзідэнцкія выбары, прыйдуць новыя палітычныя сілы, якія, магчыма, змогуць утаймаваць той палітычны і эканамічны крызіс, што да гэтага часу разгорнецца ў Беларусі.

**«Хвиля» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ІТАЛІЯ. РАСКОЛ РУХУ АЎТАНАМІСТАЎ

Як піша італьянская прэса, партыя Ліга Поўначы, якая выступае за стварэнне на Поўначы Італіі асобнай дзяржавы або аўтаноміі Паданія, можа раскалоцца. Прычына — курс яе старшыні Умберта Босі, які падтрымлівае цяперашні ўрад Сільвіа Берлусконі. У той жа час кожны другі сябра Лігі Поўначы, адпаведна апытанням, выступае за выхад партыі са складу кабінету. На партыйным сваце, якое прайшло на днях, Босі паспрабаваў пераканаць аднапартыйцаў, што партыя пакіне кабінет, як толькі пабачыць, што знаходжанне ва ўрадзе можа нанесці шкоду іміджу партыі. Аднак цалкам пераканаць партыйны базіс не ўдалося. Інакш не былі б прынятыя некалькі ўльтыматумаў на адрас Берлусконі. Сярод іх ёсць экзатычнае патрабаванне — перанос шэрагу міністэрстваў з Рыму на Поўнач Італіі. Эксперты кажуць, што наўрад ці гэтыя крокі заспакояць партыйныя нізы. Акрамя таго, у працюўнікаў Босі ёсць важны аргумент. Удзел Лігі Поўначы ў кааліцыі з правымі не садзейнічаў стварэнню незалежнай Паданіі.

**Па матэрыялах «RFI» (Францыя)**

### УКРАІНА. НА ВЕЧНЫМ АГНІ СМАЖЫЦЬ НЕЛЬГА

Суд вырашыў пакінуць за кратамі актывістку праварадыкальнай групоўкі «Брацтва Св. Лукі» 20-гадовую Ганну Сінькову, якая абвінавачваецца ў тым, што смажыла яечню на Вечным агні ў кіеўскім парку Славы. 16 снежня мінулага года ў Кіеве некалькі чалавек правялі акцыю пратэсту — падсмажылі на Вечным агні яечню і сасіскі. Свае дзеянні яны растлумачылі пратэстам супраць немэтазгоднага выкарыстання прыроднага газу. Спачатку Сіньковай інкрымінавалі хуліганства, цяпер судзяць за здзек з магіл. Калі віну дакажуць, дзяўчыне пагражае да 5 гадоў турмы. Абаронцы актывісткі настойваюць на змене меры стрымання, паколькі Сінькова ўжо амаль тры месяцы знаходзіцца ў турме. У дадатак дзяўчына скардзіцца на жудасныя ўмовы і кажа пра пагрозы на свой адрас. Адначасова ў «Брацтве Св. Лукі» прыдумалі новую версію ўчынку Сіньковай: кажуць, што гэта быў культурны перфоманс. Усім вядомым артыстам Захаду дасланыя заклікі выступіць у абарону Ганны. Аднак наўрад ці гэта дапаможа. Грамадскасць яўна выступае за асуджэнне Сіньковай, і Партыя рэгіёнаў не ўпусціць шанец папіярыцца.

**Па матэрыялах «Сегодня» (Украіна)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. КАДАФІ ЗАПРАСІЛІ НА АЛІМПІЯДУ



Ужо на этапе падрыхтоўкі Алімпіяду 2012 года ў Лондане суправаджаюць скандалы. Яшчэ не забыўся казус, выкліканы тым, што сімвал гульняў падобны на свастыку. І вось новы скандал. Аказалася, што арганізатары алімпіяды даслалі некалькі соцень білетаў Махамеду Кадафі, сыну лівійскага дыктатара, які ўзначальвае Лівійскі нацыянальны спартовы камітэт. Рашэнне не проста неэтычнае, аднак і абсурднае. Сямейству Кадафі забаронены ўезд у краіны ЕС. Праўда, як піша прэса, непаслядоўнасць — гэта фірмовая картка алімпійскага кіраўніцтва. Падобныя запрашэнні атрымалі алімпійскія ведамствы Бірмы і Зімбабве. Гэта падштурхнула шматлікія праваабаронччыя арганізацыі ўзняць пытанне пра ўзвядзенне алімпійскіх санкцый для дыктатарскіх рэжымаў.

**Па матэрыялах «The Gardian» (Вялікабрытанія)**

### БАЛГАРЫЯ. ХТО ЗБІЎ АХОЎНІКА?

Галоўны муфцій Балгарыі заявіў пра намер заснаваць атрады мусульманскай самаахвовы, паколькі «балгарская дзяржава не здольная абараніць іх ад атак правых радыкалаў». Напярэдадні ў балгарскай правінцыі быў моцна збіты ахоўнік адной з мячэцяў. Раней мусульмане (як правіла, гэта этнічныя туркі) некалькі разоў станавіліся аб'ектамі нападу сябкоў партыі «Ataka». Георгій Пырванаў, прэзідэнт краіны, лічыць, што мусульманскія атрады самаахвовы — гэта небяспечная гульня з агнём. Ён заклікаў прававерных супакоіцца, абяцаўшы ім забарону «Атакі». Аднак у гэта мала хто верыць, паколькі арганізацыя мае дэпутацкую групу, і ў дадатак гарантуе большасць правячай кансерватыўнай кааліцыі Пырванава. У сваю чаргу, апазіцыя спрабуе выкарыстаць унутраныя супярэчнасці ўрадавага лагеру і патрабуе галасавання наконт даверу кабінету. Што тычыцца «Атакі», то яна дыстанцыявалася ад нападу на ахоўніка мячэці. Аднак, на думку шмат каго, менавіта «Атака» стаіць за эскалацыяй нападаў на туркаў. Апошнім часам рэйтынг партыі пачаў падаць, і атакаўцы вырашылі нагадаць пра сябе за кошт экстрэмісцкіх акцый.

**Па матэрыялах «Junge Welt» (Германія)**

ЦІКАВА

# КІТАЙЦЫ ХОЧУЦЬ ПАЗБАВІЦЦА АД ДОЛАРАЎ

*Алег НОВІКАЎ*

**Навіна пра тое, што беларускія ўлады кансультуюцца ў кітайцаў наконт сцэнару фінансавай стабілізацыі, выклікала шок у грамадстве — як вядома, у КНР фізічныя асобы не могуць набываць валюту.**



Кітайскі юань нарадзіўся на свет у 1889 годзе і быў прывязаны не да долара ЗША (кітайцы называюць яго «мэй дзін» — амерыканскае золата), а да мексіканскага песа. Песа лічыўся самай стабільнай валютай ва ўсёй Паўднёвай Азіі, паколькі Мексіка мела багатыя срэбраныя руднікі. З таго часу кітайскія грошы перажылі цікавую гісторыю.

Пасля антыманьчжурскай рэвалюцыі на змену імперскім юаням прыйшла новая валюта — кітайскі долар, таксама заснаваная на срэбным стандарце. Рост сусветных коштаў на срэбра прывёў да адтоку каштоўнага металу з Кітая і падрыву валютнага рынку. У 1920–1930-я гады шматлікія прыватныя банкі і муніцыпалітэты пачалі друкаваць свае боны як замену долару.

У 1935 годзе ўладам давялося распачаць грашовую рэформу і ўвесці папяровыя грошы фабі. Новую грашовую адзінку чакала гіперінфляцыя, выкліканая пачаткам інтэрвенцыі японцаў.

Калі пасля вайны ў 1948 годзе Гаміньдан пачаў новую рэформу і прывязаў валюту да золата, за новы юань давалі 300 мільёнаў старых грошаў.

Аднак залаты юань доўга не пратрымаўся. І ўжо праз год з'явіўся новы «сярэбраны юань», які можна было абмяняць на сто тысяч залатых. Даводзіць рэформу да фіналу прыйшлося камуністам, якія ў тым жа годзе захапілі ўладу ў краіне. Створаны імі Народны банк Кітаю выпусціў свой юань. Банк скупляў залатыя юані па тым жа курсе, што і банкі Гаміньдану.

Аднак стабільнасці на грашовым рынку КНР не было. За паўстагоддзя існавання «чырвонага» Кітаю ў краіне мела месца пяць грашовых рэформаў. Апошняя — у 1994 годзе. Перш за ўсё яна скасавала дзве разнавіднасці юаняў: «народныя» і «валютныя» (прызначаныя галоўным чынам для замежнікаў).

Зараз у краіне адна валюта — юань (RMB). Пасля праведзенай у 1994-м дэвальвацыі юаня яго афіцыйны курс у адносінах да долара ЗША закансерваваўся. Аднак гэта не значыць, што цяперашні курс юаня справядлівы. Кітайская банкаўская сістэма цалкам дзяржаўная, і курсы тут устанаўліваюцца штучна. Кітайскі знешні гандаль рэгулюецца такім чынам, каб асноўная маса валюты, атрыманай ад экспарту, збіралася ў руках дзяржавы і выдавалася імпарцёрам на набыццё тавараў, якія вызначае дзяржава.

У самім Кітаі аперацыі з валютай рэгулююцца Дзяржаўнай адміністрацыяй валютнага кантролю. Да 1996 года любая такая аперацыя была магчымая толькі з ухвалы гэтага органа. З 1996 года існуе свабодная канвертацыя юаня ў замежныя валюты для правядзення бягучых плацяжоў. Прадпрыемствы з замежным капіталам могуць мець валютныя рахункі, аднак сума на такіх рахунках не павінна перавышаць усталяваных межаў. Залішнія валютныя сродкі павінны быць прададзены ўпаўнаважаным органам. Тое ж самае тычыцца кітайскіх прадпрыемстваў-экспарцёраў. Яны павінны прадаваць дзяржаве 85% сваёй валютнай выручкі.

Усё гэта тычыцца юрыдычных асобаў. Што да фізічных, то ім, як вядома, набываць валюту забаронена. Забарона выклікала стварэнне чорнага рынку наяўнай валюты. У Кітаі валютчыкі працуюць каля вялікіх гатэляў. У маленькіх гарадах, дзе небяспека трапіць на паліцэйскага большая, валютныя трансакцыі ідуць праз пасярэднікаў. Гэта адміністратары гатэляў і інтэрнэт-кавярняў, афіцыянты, таксісты. Яны могуць падказаць інтурысту, дзе можна выгадна здаць свае грошы.

Наколькі гэта небяспечна? Сайт Vip.by пужае турыстаў не толькі прававымі наступствамі, аднак і фізічнай экзекуцыяй за такія аперацыі. «Дзейнічае ў Кітаі і паралельны «чорны» рынак, дзе долар, натуральна, значна даражэй. Але звычайнаму турысту там рабіць няма чаго. Калі ён і не стане ахвярай кітайскіх валютчыкаў, то напэўна патрапіць на вочы паліцэйскаму. Калі амерыканцу ці немцу за дробнае парушэнне будзе зробленая толькі заўвага, рускага «па старым сяброўстве» паліцэйскі абавязкова аштрафуе, а то і паб'е», — піша сайт.

Заходнія турысты, наадварот, пішуць, што чорнаму рынку можна цалкам давяраць. «Лепшы сродак хутка абмяняць валюту на мясцовыя грошы — пайсці на чорны рынак. Дзе вам дадуць за іх на 5–15 працэнтаў больш, чым у дзяржаўных банках. Большасць турыстычных гідаў раяць трымацца далей ад валютчыкаў, паколькі ёсць рызыка быць падманутым, аднак такое бывае рэдка. За 4 месяцы знаходжання ў Кітаі я ніколі не сустракаў валютчыкаў, якія мелі намер падсунуць фальшывыя банкноты або аблічыць мяне. Галоўнае — пераканацца, што табе даюць сапраўдную валюту. Для гэтага дастаткова паглядзець на вадзяны знак» (China travel).

Актыўна цікавяцца доларамі і тутэйшыя. Прычына простая — банкаўскія дэпазіты ў валюце больш выгадныя. Гэта свядомая палітыка дзяржавы, якой патрэбная валюта. Інфляцыя ў Кітаі невялікая (5 працэнтаў штогод), аднак усё ж мае месца. У дадатак у краіне практычна няма крэдытнай палітыкі для малога бізнэсу, які ў тым ліку гандлюе з замежжам. Як следства, узніклі нефармальныя крэдытныя ўстановы, якім таксама зручней праводзіць аперацыі ў доларах. Нарэшце, шмат маладых кітайцаў вучацца за мяжой. Ім таксама патрэбна валюта.

Але ў Кітая ёсць адмысловыя прычыны турбавацца пра тое, што друкаванне грошай у ЗША ў адказ на фінансавы крызіс здольнае падарваць кошт кітайскіх доларавых рэзерваў (Кітай — другая краіна ў свеце па запасах долараў). У самой краіны патэнцыйныя страты, з якімі можа сутыкнуцца Кітай у выніку яго крэдытавання амерыканцамі, выклікаюць трывогу. Урад жадаў бы дыверсіфікаваць свае доларавыя запасы. Але любая яго спроба скінуць долары рызыкуе выклікаць рэзкі абвал валюты. Таму фінансісты абдумваюць два спосабы выйсця з «доларавай пасткі»: пераканаць свет прыняць новую сусветную валюту або садзейнічаць міжнароднаму выкарыстанню юаня.

Але сапраўдная праблема Кітая — гэта штучнасць курсу юаня, які вельмі заніжаны. Калі Кітай сапраўды жадае паменшыць сваю залежнасць ад долараў ЗША, ён павінен дазволіць свабодныя біржавыя гандлёвыя сесіі. Гэта прывядзе на першым этапе да страты яго сапраўдных рэзерваў. Такім чынам, пакуль Кітай захоўвае сваю бягучую палітыку валютнага абменнага курсу, ён, як не дзіўна, дапамагае долару заставацца галоўнай валютай свету, ускосна падтрымліваючы доларавы ажыятаж у Беларусі.

З НАГОДЫ

# ЯК ПАДЗЯЛІЦЬ ПЕРАМОГУ?

Алег НОВІКАЎ

**Напярэдадні і падчас урачыстасцяў з прычыны 70-й гадавіны пачатку вайны ў інтэрнэце актыўна згадвалі публічную цытату Пуціна пра тое, што Расія магла перамагчы ў Другой сусветнай самастойна.**



Першапачаткова пуцінская фраза, сказаная ў лютым гэтага года, была накіраваная супраць Украіны. Пуцін сказаў яе падчас інтэрв'ю, адказваючы на пытанне: «Калі б Расія і Украіна былі рознымі дзяржавамі, ці прайграла б Расія вайну 1941–1945 гадоў?». У адказ журналіст пачуў: «Расія перамагла б у Вялікай Айчыннай і без Украіны».

Аднак хутка заяву Пуціна пачалі трактаваць больш шырока. Як спробу давесці, што Расія была здольная перамагчы Гітлера не толькі без Украіны, аднак увогуле без падтрымкі іншых народаў СССР і дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі.

На першы погляд, фраза Пуціна — абсалютны гістарычны нонсэнс. Хаця б таму, што раней ніводная нават самая нацыяналістычная расійская гістарычная школа не ставіла пытанне так катэгарычна. Натуральна, можна было сустрэць вельмі супярэчлівыя тэзісы пра тое, што прыбалты, заходнія ўкраінцы, часткова малдаване, крымскія татары ўсе як адзін змагаліся на баку акупантаў.

Аднак як можна цалкам адмаўляць ролю Украіны і Беларусі? Нават калі ўсур'ёз разглядаць катастрофу ўлетку 1941-га як свядомы сабатаж украінскіх салдат супраць савецкага кіраўніцтва, нельга не пагадзіцца з каментарам карыстальніка Alexey на форуме Gidepark: «Мы развažаем пра вынік вайны без удзелу Украіны, і правільна было б гэты адлік пачынаць з 22 чэрвеня 1941 года. Калі б не баі на правабярэжнай Украіне, у якіх былі скаваныя сілы немцаў і румын, бітва пад Адэсай, развязка наступіла б досыць хутка. Мы з Украінай немцаў пад Хімкамі ледзь спынілі. А без Украіны не ўтрымалі б Масквы. Гэта не значыць, што прайгралі б вайну цалкам, гэта значыць, што страцілі б еўрапейскую частку тэрыторыі, і надоўга».

**Калі выхадцы кожнай этнічнай групы ў Расіі пачнуць, адпаведна закону, апранацца ў касцюмы з нацыянальнымі элементамі, то гэта хутчэй паскорыць дэзінтэграцыю**

Таму не дзіўнай была рэакцыя афіцыйнай Украіны. Прычым супраць рэвізіі вайны выступіў не толькі ўкраінскі МЗС, аранжавыя партыі, аднак і традыцыйна прамаскоўскія арганізацыі ветэранаў. Так, украінскія ветэраны напісалі спецыяльны ліст, у якім сказалі, што словы «кіраўніка суседняй братэрскай дзяржавы» абразлівыя, але яны не крыўдзяцца, паколькі Пуцін сказаў гэта выпадкова.

Выпадкова не выпадкова, аднак той выраз Пуціна меў значны водгук ва ўсіх рэспубліках былога СССР. Пазней да пакрыўджаных украінцаў далучыліся нашчадкі іншых былых нацменаў. На інтэрнэт-форумах можна сустрэць выразы кшталту «пра тое, што гаручка была азербайджанская, ужо ніхто не памятае?», «медзь казахстанская і вальфрам казахстанскія, якія дадавалі ў танкавую браню — без іх гэта не браня».

Праўда, калі меркаваць па статыстыцы апытанняў на форумах, большасць расіян таксама не зразумелі кіраўніка свайго ўраду. Адпаведна апытанню на рэсурсе, толькі 18 працэнтаў падзяляюць думку Пуціна, 62 — супраць.

Тут сваю ролю, відавочна, адыграў міф аб вялікай перамозе, які сфармаваўся даўно. У тым міфе ясна прапісана: фашызм перамог не рускі, а вялікі савецкі народ. «Хіба не была вялікая краіна СССР і хіба не перамог народ гэтай краіны?» — задаецца пытаннем карыстальнік Roko. Супраць перагляду гісторыі, як не дзіўна, выступаюць рускія нацыяналісты, якія падазраюць, што Пуцін сваім квазі-нацыяналістычным выразам на самай справе дае зразумець, што Расія адмаўляецца ад імперскіх амбіцый у зоне экс-СССР.

Аднак згадак пра савецкі народ — пераможцу Другой сусветнай вайны на расійскіх інтэрнэт-форумах вельмі мала. Часцей каментатары не згодныя з Пуціным у тым, што ён выключыў са спісу пераможцаў славян, спрабуюць рэабілітаваць беларусаў і хаця б усходніх украінцаў.

Карыстальнік Lida: «Калі частка Украіны была супраць савецкай улады, то Беларусь, здаецца, ваявала сумленна, як і Расія. Вядома, мы перамаглі б усё адно, нават калі б і засталіся сам-насам з гітлераўцамі, але з братамі-славянамі лягчэй было. Іншыя рэспублікі — малыя. Не хачу прынізіць іх ролю ў той вайне, але ясна, што яна меншая за нашы тры рэспублікі — Расію, Беларусь, Украіну, на чыіх тэрыторыях галоўным чынам і ішла Вялікая Айчынная».

Але тэма славянскага сяброўства часам вельмі буксуе. Пуцінафілы ўпіраюць на тэзіс пра тое, што ў 1943-м, калі адбыўся пералом, Украіна і Беларусь былі даўно пад акупацыяй, і атрымліваецца, што беларусы і ўкраінцы, быццам, фармальна ні пры чым.

«Карэнны пералом у вайне быў дасягнуты фактычна без удзелу Украіны і Беларусі — яны былі захоплены немцамі. Асноўны цяжар вайны лёг на плечы народаў Паволжа і Урала (рускія, татары, мардва, чувашы, башкіры, мары, удмурты і інш.)», — піша карыстальнік Tron.

Яўна правакацыйную пазіцыю занялі грузінскія нацыяналісты — прыхільнікі Саакашвілі. Карыстальнік Ledo сцвярджае: «Расія здольная ваявацъ з Грузіяй, з Азербайджанам і г. д. А з буйнымі дзяржавамі яна аб…лася б. Калі б не Сталін, ніхто з рускіх не стаў бы ваяваць».

Відавочна, што падобная эмацыйная і ксенафобская дыскусія не можа ўплываць на афіцыйныя дзяржаўныя канцэпцыі краін СНД. Аднак тое, што пуцінская Расія, якая будуе сваю ідэалогію на нацыяналізме і шавінізме, дазваляе сабе ставіць такія пытанні, дастаткова сімвалічна. Калі не разглядаць версію, што Уладзімір Уладзіміравіч папросту сказаў глупства.

Праўда, не выключана, што Пуцін усё ж такі ўсведамляў тое, што казаў. Проста быў пастаўлены ў жорсткія ўмовы. Карыстальнік Ivaz піша: «Я ўкраінец, але ніколькі не крыўджуся на Пуціна за выказванне. Калі лідары былых савецкіх рэспублік, а цяпер суверэнаў, адмаўляюцца ад усяго, што звязана з СССР, а прыбалты і ўкраінскія нацыяналісты нават ганарацца сваім узброеным супрацьстаяннем з СССР на баку Германіі, што павінен быў зрабіць расійскі прэм'ер? Таксама прызнаць сябе паражэнцам?»

Можа, і так, аднак ніводная рэвізіяністыцкая тэорыя Другой сусветнай вайны апошнім часам не была такой папулярнай.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### КАНСТАНЦІН ГРЫШЧАНКА



Усе чакаюць, ці выканае міністр замежных спраў Украіны абяцанне, якое даў 22 красавіка. Тады Грышчанка заявіў, што адразу пасля мясцовых выбараў у Малдавіі (іх другі тур прайшоў 19 чэрвеня) Кіеў прад'явіць Кішынёву тэрытарыяльныя прэтэнзіі. Гаворка ідзе пра ўчастак у раёне трасы «Адэса — Рэні». Гэта гісторыя пачалася яшчэ ў 1999 годзе. У той час Украіна і Малдова падпісалі дамову пра дзяржаўную мяжу. Па ёй Кіеў у 2002 годзе саступіў Кішынёву частку тэрыторыі на Дунаі, дзякуючы якой Малдова атрымала выхад да Чорнага мора. У сваю чаргу, Кішынёў абавязаўся перадаць Кіеву ўчастак аўтадарогі працягласцю 7,7 кіламетра. Аднак гэтага дагэтуль не адбылося. Цяпер Кіеў любым коштам намагаецца забраць выкрадзенае назад. Сітуацыя для гэтага і спрыяльная, і не вельмі. З аднаго боку, невялікая Малдова — добры «кандыдат для біцця». З другога, на сапраўдныя вайсковыя акцыі Кіеў пайсці пабаіцца. Магчыма, у выпадку ігнаравання сваіх патрабаванняў украінцы могуць адказаць дыпламатычным манеўрам — падтрымаць пазіцыю Расіі ў прыднястроўскім пытанні. Аднак да гэтага Украіна, магчыма, паспрабуе пагуляць мускуламі. Для дэманстрацыі сур'ёзнасці сваіх намераў украінскія ваенныя аналітыкі прапануюць правесці ў ліпені гэтага года ў прымежных з Малдовай раёнах маштабныя вучэнні. Але спачатку сваё слова павінен сказаць Грышчанка.

### ВАЦЛАЎ КЛАУС



Першы прэзідэнт Чэхіі 19 чэрвеня адсвяткаваў 70-ю гадавіну з дня нараджэння. Падзея адзначалася з вялікай, па мерках краіны, помпай. Так, была выдадзена спецыяльная памятная кніга на 300 старонак у гонар прэзідэнта. Кніга з'яўляецца зборнікам тэкстаў, прысвечаных Вацлаву, якія напісалі розныя вядомыя еўрапейскія палітыкі і эканамісты. Кнігу прэзідэнт будзе падпісваць для кожнага ахвочага. Нават пры такіх сціплых маштабах святкавання для чэхаў гэта нешта незвычайнае. Часопіс «Reflex» параўнаў святкаванне дня нараджэння Клауса з маштабнымі ўрачыстасцямі ў гонар 70-годдзя імператара Іосіфа Другога, якія ўся Аўстра-Венгрыя (Чэхія была яе часткай) святкавала 18 красавіка 1990 года. Між тым, аналітыкі спрабуюць зразумець ролю Клауса ў сучаснай чэшскай гісторыі. Яму прыгадваюць развал Чэхаславакіі і фантастычны інстынкт палітычнага выжывання. Клаус не пакідаў кабінетаў улады 20 гадоў, і нават тады, калі яго партыя прайгравала выбары. Нельга не згадаць пра цікавую ідэйную эвалюцыю Клауса: ён пачынаў як рэйганіст, а цяпер з'яўляецца крытыкам еўрапейскай інтэграцыі, сябрам Пуціна і апанентам тэзісу пра існаванне глабальнага пацяплення. На думку большасці, у наступным годзе, калі другая прэзідэнцкая кадэнцыя Клауса закончыцца, ён усё ж канчаткова пойдзе з вялікай палітыкі. Дарэчы, не абышла прэса і выпадак, які адбыўся 12 красавіка гэтага года падчас сустрэчы з прэзідэнтам Чылі. Тады Клаус паклаў у кішэню пратакольную асадку. Што гэта было — намер або выпадак — дасюль актыўна дыскутуецца ў краіне.

### ПЕДРА ЭСКАБАР



Педра Эскабар — лідар рэгіянальнага аддзялення партыі Аб'яднаная Левая (IU) у іспанскай правінцыі Экстрэмадура. Арганізацыя Эскабара (па сутнасці нашчадак Кампартыі) выступіла супраць абрання прадстаўніка Сацыялістычнай рабочай партыі Іспаніі (PSOE) на пасаду старшыні рэгіянальнай адміністрацыі. Затое яна не супраць, каб мясцовы ўрад узначаліла правая Народная партыя (PP). Думаецца, апошнія самі не чакалі такога сюрпрызу. PP у Экстрэмадуры не толькі не мае большасці ў мясцовым парламенце, аднак увогуле за ўсе гады існавання іспанскай дэмакратыі не была тут пры ўладзе. Здрада адзінству левых сіл на месцы аукнулася скандалам на нацыянальным узроўні. Нацыянальны каардынатар IU абвясціў пра тэрміновы партыйны сход. На ім гаворка будзе ісці пра выключэнне секцыі ў Экстрэмадуры з шэрагаў IU. Бонзы ў Мадрыдзе баяцца, што IU можа зрабіць тое ж і ў другіх рэгіёнах. Гэта можа значыць палітычны пераварот. Ні сацыялісты, ні іх галоўныя канкурэнты — кансерватары не маюць абсалютнай падтрымкі і могуць прыйсці да ўлады выключна за кошт падтрымкі малых партый (той жа Аб'яднанай Левай або каталонскіх ці баскскіх нацыяналістаў). Звычайна левыя падтрымлівалі PSOE як аднадумцаў. Аднак цяпер яны, відавочна, не жадаюць блакавацца з партыяй, якая дыскрэдытавала сябе за апошнія гады кіравання краінай. Аж да таго, што, здаецца, гатовыя галасаваць за PP — партыю франкістаў, шматлікія сябры якой у часы дыктатуры Франка жорстка праследавалі камуністаў.

ЛЁСЫ

# МАСТАК АЛЕСЬ ПУШКІН

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Маё знаёмства з гэтым вельмі таленавітым і цікавым чалавекам адбылося ў 1994 годзе і адразу ўразіла. Упэўнены, многія ведаюць легенду пра тое, што падчас нейкай бітвы воін сваёй крывёй правёў па бялізне паласу і падняў над галавой тое, што пазней стане бел-чырвона-белым сцягам. Пушкін зрабіў крыху інакш. У медычнай установе ён здаў 250 грамаў сваёй крыві, а потым на белым палотнішчы (два на метр) правёў ёй чырвоную паласу. Больш крэатыўнага варыянта засведчыць для гісторыі свой маральны выбар і прыдумаць цяжка.**



## Малюнкі дзяцінства

На Божы свет я з'явіўся 6 жніўня 1965 года, а літаральна праз некалькі дзён, калі мяне збіраліся ў першы раз купаць, здарыўся вельмі цікавы і містычны выпадак. Да нас прыйшоў міліцыянер. Побач з мястэчкам здарылася нейкая аварыя, і ён высвятляў усе абставіны. Я даволі часта думаю пра гэты Знак. Шмат хто лічыць: пры першым купанні трэба ўважліва сачыць за ўсім, што адбываецца, бо нешта можа сведчыць пра далейшы лёс немаўля. Невыпадкова беларусы лічаць, што яго трэба праводзіць у прысутнасці дзеда і бабы. Класці залатую манетку ў ванначку. Альбо лажыць пад яе кніжку, каб дзіця расло разумным і цягнулася да ведаў. Гэта вельмі важная рэч.

Мабыць, той выпадак паказвае, што ўсё жыццё будзе супрацьстаянне дзяржаўнага чалавека і мяне.

Тата, Мікалай Іванавіч Пушкін, меў тады сорак адзін год. У мястэчку Бобр (Крупскі раён Мінскай вобласці) ён нарадзіўся ў 1924 годзе, а памёр у 2007-м. Пражыў тут усё жыццё. Дарэчы, адсюль усе нашы продкі па яго лініі. Дзед Іван Дамэнтавіч Пушкін жыў з 1898 года па 1978, прадзед Дамэнта Канстанцінавіч Пушкін таксама нарадзіўся і памёр у Бабры. Тут са сваімі дзецьмі цяпер жыву і я. Так што як мінімум пяць пакаленняў Пушкіных паходзяць з мястэчка Бобр.

Вельмі каштоўна, што, нягледзячы на дзве сусветных вайны, калектывізацыю, часы «чорных варанкоў», Курапатаў, паездак на цаліну і г.д. наш род жыве на адным месцы на працягу пяці пакаленняў. Ганаруся гэтым і цаню. Мне прыемна, што я хаджу па зямлі, па якой хадзіў мой прадзед, збіраю грыбы ў тым лесе, дзе мой дзед вязаў мётлы, гляджу на рэчку, дзе тата некалі лавіў рыбу.

Тата працаваў электрыкам на Бобраўскім лесапільным заводзе, які вырабляў дэталі для пініна «Беларусь». Гэта быў філіял вядомага барысаўскага завода, а дрэвы для распілоўкі туды прывозілі з Усходняй Сібіры — цудоўныя елачкі, якія вытрымалі вельмі моцныя маразы. Вагонамі — у Беларусь, каб тут працягваліся «прыродныя спевы».

Маці звалася Ганнай Іпалітаўнай Пушкінай (дзявочае прозвішча — Сільмановіч). Яна з вёскі Ухвала, што ў 30-ці кіламетрах ад Бабра ў бок Бялыніч. Калі я нарадзіўся, яна ўжо не працавала. Інвалід другой групы.

Чаму? Адразу пасля вайны яна працавала ў падсочкі і збірала смалу. У вялікія снежныя пасляваенныя зімы хадзіла ў гумовых ботах. Яе бацькоў нават «да начальства» выклікалі за тое, што яна прыдумала і спявала ў школе частушку: «Слава Сталину-грузину, что он выдумал резину»…

Гумовыя боты, што яна надзявала на ногі, каб збіраць смалу, з якой потым на каніфольнай фабрыцы рабілі серпанціну, шкіпінар, каніфоль, і сталі прычынай поліартрыту. Мяне і сястру выхоўвала ўжо хворай.

Святлана, на год старэйшая за мяне, таксама жыве ў Бабры. Я вельмі рады, што мы часта сустракаемся ў бацькоўскай хаце, дзе зараз месціцца мая майстэрня, вечарамі разам п'ем гарбату і пра нешта гаворым. Для нашага часу гэта даволі рэдкая з'ява. Часцей бывае так, што адзін ва Уладзівастоку альбо Алма-Аце, а другі, скажам, у Брэсце.

У мяне быў яшчэ старэйшы брат Сяргей, які ў 37 год, на жаль, памёр ад гарэлкі. А яшчэ быў — Аляксандр Мікалаевіч Пушкін. Нарадзіўся ён у 1960 годзе і пражыў толькі адзін годзік. На нашых магілках ёсць магіла менавіта з такім надпісам.

Праз чатыры гады яго імя далі мне. Цяпер трэба пражыць «за дваіх».

## Першыя фарбы

Прыкладна з 6-ці гадоў я пачаў маляваць. І быў такім дзіцём, якое не вельмі цягнецца да кампаній. Усе дзеці хадзілі на рэчку альбо ў кіно, а я заставаўся дома і маляваў. Калі мне было 13 гадоў, у нашым раённым цэнтры праходзіў нейкі конкурс, куды прыехаў мастак з Мінску. Дакладней, са школы-інтэрната па музыцы і выяўленчаму мастацтву імя Ахрэмчыка, што зараз называецца Рэспубліканскім каледжам мастацтва. Звалі яго Пётр Пятровіч Шарыпа. Тады ён быў у нашым раёне ў камандзіроўцы. У райцэнтр сабралі таленавітых дзяцей з вясковых школ, і ён праводзіў тэсты — мы рабілі кампазіцыі, нацюрморт, малявалі алоўкам, акварэллю, а з тыльнага боку пісалі свой хатні адрас і асабістыя дадзеныя.

У траўні 1978 года мы атрымалі запрашэнне прыехаць у Мінск на Валгаградскую, 5 (зараз вуліца Макаёнка) і прайсці другі тур экзаменаў на паступленне. Заснаваў гэтую школу-інтэрнат знакаміты Рыгор Шырма, а мэта — сабраць туды з усёй краіны таленавітых дзяцей. Спачатку яна месцілася пры Оперным тэатры, а ў другой палове шасцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя пабудавалі асобны будынак. У ім яна размешчана і сёння. Жывапісныя месца, парк Чэлюскінцаў, пяць карпусоў, якія пераходамі злучающца паміж сабой. Гэта побач з дзіцячай чыгункай і насупраць шпіталя КДБ.

Школа была закрытага тыпу, дзе нас выпускалі за яе межы толькі з дазволу выхавальніцы. Як салдат у арміі.

Бацька мой паступіў мудра — магчымасць вучыцца ў сталіцы ён вітаў вельмі шчыра. Так пасля пяці класаў сярэдняй школы вёскі Бобр я стаў працягваць вучобу ў Мінску.

Да таго ж мой тата бачыў, што ў нашым раёне ёсць адзін мастак-афарміцель, які малюе леніных-марксаў, атрымлівае шмат грошай і можа купляць тыя ж цукеркі «Мішка на поўначы» амаль кілаграмамі альбо піць самы дарагі каньяк. Ён марыў, каб такім жа багатым, заможным стаў і я. Ён так і казаў — навошта табе ўсё жыццё цягаць дошкі на станок на нашым лесазаводзе, вывучышся, будзеш пісаць нешта накшталт «Слава КПСС!» і зажывеш вельмі добра.

Мы паспяхова здалі тры экзамены, а жніўні прыйшоў ліст, дзе пісалася, што я залічаны ў гэтую вучэльню. Не скажу, быццам бы для маёй маці гэта было нечым асабліва радасным. У нашым мястэчку «школа-інтэрнат» выклікала пэўныя асацыяцыі з «неблагополучными семьями», і ёй не вельмі хацелася аддаваць туды свайго сына. Аднак бацька на гэты конт быў непрыступны — вучыцца.

Пётр Пятровіч Шарыпа стаў маім першым настаўнікам. Дзякуй Богу, ён жывы і сёння і дагэтуль там выкладае. Не так даўно мы бачыліся на пасяджэнні суполкі «Пагоня» і дамовіліся ў будучым кантактаваць рэгулярна.

Вучыўся я да 1983 года, і калі была абарона маёй дыпломнай працы («Вясковыя ганчары» паявіліся пасля паездкі ў Івянец), менавіта ён быў маім кіраўніком і даў характарыстыку на паступленне ў тагачасны Беларускі Дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, які зараз стаў Акадэміяй мастацтваў Беларусі.

Адвучыўся там восем гадоў. Капітальная адукацыя. Мы малявалі там цэлымі днямі і начамі. У класе было 16 чалавек — шэсць хлопцаў і дзесяць дзяўчат. За межы школы-інтэрната выходзілі даволі рэдка. Думалі толькі пра мастацтва.

## Палітра жыцця

Мая вучоба цягнулася там сем гадоў. Чаму так доўга? Таму што ў іх уваходзяць два гады вайсковай службы. Пасля першага курса мяне прызвалі ў знакамітую 40-ю агульнавайсковую армію, якая ваявала ў Афганістане. Дакладней, у 181 верталётны полк, што месціўся ў Кундузе. Служыў з 1984-га па 1986 год.

Адразу пасля звальнення ў запас аднавіўся на другі курс. Гэта ўжо быў час (сапраўдны росквіт) перабудовы. У 1990 годзе я зрабіў дыпломную работу «Гісторыя сваёй школы», якая там вісіць і сёння. Больш за 20 гадоў. Дарэчы, менавіта за яе мяне прынялі ў Саюз мастакоў СССР. Чырвоная скураная кніжачка захавалася дагэтуль.

Беларусь быццам бы ачнулася ад сну і пачала хутка адраджацца. Гэтая хваля свабоды літаральна захліснула мяне. Я ездзіў на выставы ў Рыгу, Вільню, Маскву, Санкт-Пецярбург. Першыя вальныя соймы маладзёжных суполак. Паяўленне «Талакі», «Майстроўні», святкаванне «Гукання вясны» ў парку Янкі Купалы. На базе чацвёртага курса я стварыў першую суполку БНФ.

На гэты ж час прыходзіцца і першая «адсідка». Арыштавалі мяне за ўлёткі, якія клеіў на фасадзе нашага інстытута перад «Дзядамі» 1988 года. 15 сутак. Колькі іх будзе потым, я нават і не лічыў. Затым было святкаванне 25 сакавіка 1989 года 71-ай гадавіны Беларускай Народнай Рэспублікі. Я стварыў Дэкларацыю сацарту. Асабіста напісаў 12 плакатаў, якія мы хацелі несці на плошчу Леніна, але дайсці далі толькі да Дома Друку. Там і пахапалі. Арыштавалі 130 чалавек. За гэта мне тады далі два гады ўмоўна і пяць гадоў «поражения в правах», але вучоба працягнулася.

Тата гэтага зразумець не мог. У іх час мяне б у лепшым выпадку адправілі ў Сібір «валіць лес», а тут такая дэмакратыя. Словам, на сваім лёсе я адчуў, што ў краіне нешта змянілася.

У 1990 годзе мяне размеркавалі ў Віцебск і адразу ўзялі на ўлік у мясцовай міліцыі. Працаваў там у мастацкім камбінаце, рабіў персанальныя выставы. Напэўна, цяпер такой адноснай свабоды ў Беларусі ўжо няма. З вучэбнай установы выключылі б адразу…

Чаму абраў менавіта гэты горад? Таму што ў Віцебска цудоўная гісторыя. Там працавалі Малевіч і Шагал. Спачатку я там



уладкаваўся на працу ў мастацкі камбінат і нават атрымаў інтэрнат. Потым знайшоў сабе майстэрню, купіў мальберт і пачаў рыхтаваць першую выставу, якая называлася «Сацарт. Дэкларатыўнае мастацтва». Напісаў адпаведны Маніфест і зрабіў перфоманс: сеў на асла і з голубам у руцэ 25 сакавіка (Дзень Волі) пад гукі духавога аркестру праехаўся па Віцебску. І адразу са словамі: «Ён прынясе нам свабоду!» гэтага голуба адпусціў. Ніякіх «дазволаў» на такія мерапрыемствы з боку ўлады тады не існавала. І ўвогуле — час быў іншы.

Мне дазволілі адкрыць першую ў горадзе, і адну з першых у краіне, прыватную галерэю. 50 квадратных метраў. Недалёка ад музею Марка Шагала. Лабараторыя эксперымента «У Пушкіна» праіснавала да 1997 года, калі цэнзура вярнулася зноў.

Паралельна некаторы час працаваў мастаком у Віцебскім акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа. І чатыры з паловай гады ездзіў кожны тыдзень у Магілёў. Тры гадзіны язды на цягніку. Туды мяне запрасіў Фелікс Янушкевіч. Дакладней, Беларуская каталіцкая грамада, якую ён узначальваў. Гэта быў час адраджэння храмаў — каталіцкіх і праваслаўных.

Я рэстаўрыраваў і аднаўляў там катэдру Святога Станіслава, цяпер гэта Кафедральны касцёл Небаўзяцця Святой Дзевы Марыі. Велічэзны.

Тыдзень працаваў у Магілёве, а на выходныя ехаў у Віцебск. Сілаў хапала на ўсё.

Магілёў — прыгожы горад, і час тады быў вельмі цікавы. У горадзе рэстаўрыравалі каля двух з паловай тысячы квадратных метраў фрэсак, стварылі фестываль «Магутны Божа», правялі шмат выстаў. У тым ліку і маіх.

Дарэчы, менавіта там я пазнаёміўся з будучай жонкай Янінай Дэмух. Яна працавала настаўніцай у сваім Стаўбцоўскім раёне і прыехала ў наш касцёл на вакацыі. Жонка — каталічка, муж — праваслаўны. Вельмі ўласціва нашай Беларусі.

Мы бралі шлюб у 1997 годзе. Выхоўваем дваіх дзетак.

### Колеры будучыні

Мястэчка Бобр находзіць з 1516 года. Гэта афіцыйнае ўзгадванне ў летапісе. Думаю, з'явілася яно крыху раней. У Бабры «да камуністаў» было дзве сінагогі, касцёл і праваслаўная царква. У 1936 годзе яе разабралі і прадалі на дровы.

Зараз у нашым мястэчку жыве 1100 жыхароў, з якіх 78% — пенсіянеры. 50 чалавек раней былі асуджаныя. У школе вучыцца 160 хлапчукоў і дзяўчынак, а ў дзіцячы садзік ходзіць усяго 30 дзяцей. І адзін — мастак. Прыемна.

Невыпадкова тата, калі там адрадзілі царкву, з гонарам сказаў: «Яе будзе распісваць мой сын». Так і павінна быць у жыцці. Прызначэнне чалавека ў тым і заключана, каб вяртаць «даўгі» зямлі, якая яго нарадзіла і выхавала.

На жаль, менавіта з гэтай царквой звязана найбольш сумная падзея апошніх 15-ці гадоў майго жыцця. Яна з'яднала мой з Янінай лёс. Там я хрысціў сваіх доўгачаканых дзетак (Міколку — чакалі шэсць год). Адпяваў маму і тату… З таго, што я зрабіў у сваім жыцці, гэта работа была самай важнай.

17 лютага 2011 года, з двух да чатырох гадзін раніцы, яе не стала. Калі ў 8 гадзін я туды прыйшоў, убачыў адны галавешкі і тры званы, якія засталіся на званіцы. Усе абразы згарэлі, а фрэскі абсыпаліся. Мароз тады быў — мінус 25. Пажарныя палівалі са шлангаў, усё цякло па сценах і замярзала, а потым разбуралася і абсыпалася. Уявіце — на гарачыя сцены льецца ледзяная вада…

Патрэскалася нават падлога, хаця і была зроблена з керамічнай пліткі.

Мабыць, такой была Божая воля. Нават калі пажару «дапамаглі» нейкія спецслужбы, без жадання Яго нічога б не адбылося. Як кажуць, факт застаецца фактам. Гэтую царкву адраджалі ўсёй вёскай. Прастаяла 15 гадоў.

Зараз усяго гэта зноў няма. Трэба пачынаць з нуля. Бычцам бы ўсім нам нехта кажа — калі вы любіце сваю краіну, мястэчка і верыце ў Бога, рабіце ўсё наноў. Атрымліваецца своеасаблівая «перазагрузка».

Так, былі памылкі. Так, царква распісвалася і ў 1996 годзе, калі я эмацыйна рэагаваў на падзеі. Канешне, было і лукаўства, калі ў «Судным дні» намаляваў пэўных людзей. Паказваў гэта журналістам, якія зубаскалілі і задавалі складаныя пытанні бацюшку. Той чырванеў і не ведаў, што адказаць.

Вакол кіпела шмат страсцей. Была рацыя. На фрэсцы па правым баку ад Хрыста стаялі праведнікі, па левай — грэшнікі. Анёл трубіў у трубу і пад ёй — людзі. Адзін, барадаты мітрапаліт, прыкрываўся крыжам, другі з зачосам і вусамі, бараніўся вялікімі кулакамі. За імі амапаўцы. Усё было вельмі пазнавальным. Дзякуючы таму, што дакументы былі ў парадку, а эскіз зацвердзілі, сем гадоў яе ніхто не чапаў. Пасля таго, як у 2005 годзе яе паказалі «Вести», літаральна на наступны дзень, у Бобр прыехалі протаярэй Мінскай епархіі Мікалай Кожыч і з ім два невядомых чалавека (не магу знайсці іх прозвішчы). Фрэску замалявалі валікамі.

Цікава, як я ўвогуле пачаў там працаваць. 1995 год. Пасля слоў таты, я зрабіў і прынёс на пасяджэнне царкоўнага камітэта (зараз іх ужо няма) праект на трох планшэтах. «Дваццатка» (колькасць чальцоў) усё гэта ўважліва разглядзела, бабулі пасадзілі мяне ў машыну (тры селі побач) і павезлі на споведзь да благачыннага айца Івана Місіюка, які тады быў галоўным у нашай акрузе. Споведзь, як у першых хрысціян, была публічнай, і калі я нешта спрабаваў замаўчаць пра сваіх дзяўчат, бабулі адразу задавалі адпаведныя пытанні. Толькі пасля гэтага Благачынны даў благаславенне і зацвердзіў яго пячаткай. Гэта потым выратавала і дазволіла фрэскам пасля існаваць да «цэнзарскіх валікаў».

…Зразумела, што пасля таго, як царква згарэла, людзі казалі — з-за Пушкіна, таму што там быў намаляваны Лукашэнка. Магчыма, і так. Але менавіта яны вырашылі, што адраджаць фрэскі буду таксама я.

Жартую, што пасля пажару ў мяне было тры шляхі.

Першы. Спіцца, паламаць пэндзлі, выкінуць палітру, бо такая Божая воля і яму не да спадобы такое мастацтва.

Другі — з'ехаць у эміграцыю, бо ў Беларусі працаваць мне не даюць.

Трэці шлях. Зноў брацца за работу па аднаўленні нашай царквы.

Яго і абраў.

КІНО

# КІНАШЭДЭЎРЫ ПАЎТАРАЮЦЦА Ў МІНСКУ

Андрэй РАСІНСКІ

**Усё лета ў мінскім «Цэнтрывідэа» ў межах праграмы «Экран паўторнага фільму» дэманструюцца стужкі, што ўвайшлі ў скарбонку сусветнага кіно.**

У праграме ўжо паказалі «Фотапавелічэнне» Антаніёні, «О, шчаслівы!» Ліндсэя Андэрсэна, «Жанчыну ў пясках» Тэсігахары.

Да 26 чэрвеня на экране вытанчаная «Хірасіма, маё каханне» Алена Рэнэ 1959 года. Таксама ў праграме — стужкі Альфрэда Хічкока. Трымценнік «Галавакрут» — да 3 ліпеня; «Псіхоз» — з бацькам усім кінаманьякаў Норманам Бэйтсам (з 4 па 10 ліпеня), чорная камедыя «Непрыемнасці з Гары» (11–17 ліпеня). Элегантная шпегаўская гісторыя, якой дасюль зайздросціць Джэймс Бонды, — «На поўнач праз паўночны Захад» будзе прадстаўлена з 18 па 24 ліпеня.

Луіс Бунюэль прадставіць «Вірыдыяну» (25–31 ліпеня), Карлас Саўра — «Паляванне» — пра наступствы грамадзянскай вайны (1–7 жніўня). Залімітныя прыгоды ў джунглях ад Вэрнэра Герцага «Фіцкаральда» выпрабуюць вас на трываласць з 8 па 14 жніўня.




Класічныя нуары — «Мальтыйскі сокал» і «Двайная страхоўка» ідуць з сярэдзіны жніўня. Лета завяршае «Ноч паляўнічага» Чарльза Лоўтана — стужка, ад якой шалеў Стывен Кінг. Страшная гісторыя пра падступнага айчыма — з 29 жніўня па 4 верасня. У якасці адмысловай разынкі — «Манхэтан» Вудзі Алена, ледзьве не найлепшая ягоная стужка.

Усе фільмы дэманструюцца на мове арыгіналу з рускімі субтытрамі.

АНОНС

# ПЕРШЫ ІСТЭРН БЕЛЛІТУ

**Новы раман «Тэорыя змовы» Уладзіслава Ахроменкі ўжо ў продажы! 30 чэрвеня — аўтограф-сесія ў кнігарні «ЛогвінаЎ»: выпускнікам ВНУ, якія трапілі пад абавязковае размеркаванне, — зніжкі.**




«— А як мне жыць у краі, дзе пануе… суцэльная змова супраць гэтага самага краю?! — інфантыльна заенчыў адраджэнец. — Мова, гісторыя, сымболі…

— Наконт «змовы» абсалютна згодны, — нечакана пагадзіўся фацат у стэтсане. — І ці не галоўны змоўнік — ты! Бо ні халеры не робіш, каб саматуж змяніць сваё жыццё да лепшага, а спадзяешся адно на цуды...»

Выйшаў з друку першы «сольны» раман Уладзіслава Ахроменкі — пісьменніка, вядомага чытачу па кнігах «Янкі, або апошні наезд на Літве» і «Праўдзівая гісторыя Кацапа, Хахла і Бульбаша», створаных ім у суаўтарстве з Максімам Клімковічам.

### Жанр:

Кінараман-фарс (а таксама сатырычны раман, прыгодніцкі раман і раман-выхаванне, істэрн — вестэрн на ўсходні манер)

### Кароткі змест:

Выпускнік сталічнага ВНУ па імені Скіргайла — натхнёны паэт, высакародны адраджэнец і малады спецыяліст — трапляе па размеркаванні ў Таргачоў — тыповы райцэнтр сінявокай. Скіргайлавы рамантычныя парывы сустракаюць татальнае непаразуменне з боку простых таргачоўцаў, раённай улады, а таксама кантынгенту расійскай ракетнай базы «Волга-Волга», што стаіць у Таргачове. На шчасце, маладзёну выпадае ўнікальны шанец выправіцца ў мінулае — і кардынальным чынам змяніць лёс Радзімы. Патрабуецца для гэтага ўсяго нічога — прадаць душу д'яблу…

### Цытаты:

«Скіргайла, ну злазь, Хрыстом Богам прашу! — амаль спачувальна папрасіў цыбаты сяржант. — Я ўсё разумею, сам беларускую школу канчаў. Толькі вось «спадаром» мяне абзываць не трэба... У нас у Таргачове за такое лыча чысцяць!»

«Тое, што ты душу за Радзіму запрадаў, — зразумець яшчэ можна. З кім не бывае… Але нашто ты ў тое ВКЛ палез? Свайго часу замала?»

«Правільна, баба, гаворыш, — салідарна пацвердзіў былы партызан. — Чытаць, пісаць і страляць кожны мужчына павінен умець нават з заплюшчанымі вачыма!»

Урывак з рамана: http://www.novychas.org/literature/уладзіслаў-ахроменка-тэорыя-змовы-урывак-рамана

### Водгук:

http://novychas.org/culture/ёсць-што-чытаць-беларускія-пісьменнікі-нарэшце-пачалі-прадукаваць-«літаратуру-для-ўсіх»

### Дзе купіць:

- У рэальнай кнігарні «ЛогвінаЎ» (Мінск, праспект Незалежнасці, 37а, ст.м. «Плошча Перамогі», будынак у дварах за домам «Подзвіг народу»).
- Падчас аўтограф-сесіі 30 чэрвеня з 19:00 па 21:00 ў кнігарні «ЛогвінаЎ» — з подпісам аўтара.
- У віртуальных кнігарнях: http://knihi.by (worldwide) http://alib.by (толькі па Мінску).
- Замовіць па адрасе tarhachou@gmail.com

### Увага! Акцыя!

30 чэрвеня падчас аўтограф-сесіі выпускніку ВНУ, які прад'явіць дакументы, што пацвярджаюць яго размеркаванне за межамі горада Мінска, — зніжка 50%.

РАСКРЫЙ ТЭОРЫЮ ЗМОВЫ!

УСПАМІН

# СВЕДКІ І ТВОРЦЫ ГІСТОРЫІ

Калі вядомаму гісторыку мастацтва Маі Міхайлаўне Яніцкай споўнілася 80 гадоў, а праз некалькі дзён у фальварку «Добрыя мыслі» мінская інтэлігенцыя сабралася павіншаваць яе з юбілеем, цяжка верылася ў такі паважаны ўзрост гэтай прыгожай жанчыны. Як заўжды, стылёва апранутая, далікатная і трапная на ветлівае і выразнае слова, жвавая і энергічная.

Па яе кнігах — а яна аўтарка 7 манаграфій — сёння можна вывучаць гісторыю беларускага шкларобства. А таксама атрымліваць звесткі па бясконцых пытаннях гісторыі ўжытковага мастацтва Беларусі — у шматлікіх каталогах, энцыклапедыях, пачынаючы яшчэ з першай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі (1969–1976), у каталогах выстаў. Уся экспазіцыя шкла Музея старажытнабеларускай культуры, уключаючы ўнікальныя рэканструкцыі археалагічных шкляных вырабаў — праца Маі Міхайлаўны.

Яніцкая не адставала і ад новых тэхналогій — пакінуўшы ў 1991-м Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі Навук, працавала ў Скарынаўскім цэнтры, а затым у Інстытуце праблем культуры, дзе стварала серыю мультымедыйных дыскаў, прысвечаных нацыянальнай мастацкай спадчыне.

Маю Міхайлаўну як даследчыка і спецыяліста ведаюць многія. Але наша газета палічыла за лепшае павіншаваць юбілярку публікацыяй фрагменту яе ўспамінаў пра карані яе роду і падзеі 70-гадовай даўніны. Мая Міхайлаўна выдатна памятае пачатак вайны. З юбілярам размаўляе Аляксей Хадыка.



Мая Яніцкая і Аляксей Марачкін

***— Ці праўду сцвярджае паганоска, быццам сядзіба яе продкаў знаходзілася побач з Сувораўскай вучэльняй?***

— Побач з Суворайскай вучэльняй была сядзіба бацькоў майго мужа. А дом маіх бацькоў знаходзіўся ў Лагойскім раёне, у вёсцы Вялікія Кропавічы. Там жыла бабуля, уроджаная Караліна Сапега, якая паходзіла са знакамітага магнацкага роду. Дачка Антона Сапегі. Я асабіста падобная да таго Антона Сапегі.

Муж маёй бабулі Караліны з Сапегаў, Казлоўскі, увесь час быў арандатарам, а потым, зарабіўшы грошы, набыў сядзібу. Яна месцілася ў мясцінах, дзе валодалі землямі продкі Янкі Купалы: на тых самых могілках, дзе і мае продкі, пахаваная маці вялікага беларускага песняра.

У 1939-м, з прыходам савецкай улады, пачалася ліквідацыя хутароў, і продкаў прымусілі перанесці сядзібу. Яе паставілі ў вёсцы, але мясціну, дзе яна папярэдне стаяла, людзі па-ранейшаму называюць Казлоўшчынай, ад імя дзеда. Хата аж дагэтуль стаіць у Вялікіх Кропавічах. Казлоўскія, як і Сапегі, былі каталікамі.

Другі мой дзед, Лука Пракопавіч Лапцэвіч, з кулакоў, праваслаўны. Яны жылі на Віцебшчыне, у ваколіцах Плешчаніц. Прадзед Пракоп служыў валасным пісарам і меў пяць сыноў. Зямлі ў яго было 40 валок, якія ён пароўну падзяліў паміж сынамі: адпаведна, дзеду дасталася 8 валок. У дзеда нарадзіліся два сыны і пяць дачок. Пасля рэвалюцыі ён быў раскулачаны і сасланы ў Сібір. Калі ў 1938 годзе ён вярнуўся, хата яшчэ стаяла. Пазней яе перавезлі ў Мінск, на вуліцу Слясарную (бацькі пераехалі ў Мінск раней за дзеда). Мне было яшчэ два гадкі, а мой бацька ў 1933-м ужо актыўна арганізоўваў саўгасы і калгасы, зрабіўшыся апантаным партыйным дзеячам. Ён прыняў камунізм, як многія маладыя прымаюць нешта новае... Перакананаму камуністу, яму заўсёды даставаліся папрокі аднапартыйцаў за бацьку-кулака. А ён асабіста ездзіў па вёсках, раскулачваў няшчасных людзей. Мне падаецца, што многія беды нашай сям'і ў далейшым — Божая кара за яго дзейнасць. Памятаю, як аднойчы ён вярнуўся з працы і з відавочнай палёгкай сказаў: «Нарэшце з мяне знялі чортаву пячатку!» Мне было гадоў шэсць, у той дзень Сталін заявіў: «Сын за бацьку не адказвае...»

Дзеда па вяртанні са ссылкі ў Мінск перад вайной зноў арыштавалі, і ён сядзеў у Ігумене (сёння — Чэрвень). Маці вазіла яму перадачы. З пачаткам вайны ён вярнуўся ў Мінск, перавезены з-пад Плешчаніц, дом. Каля 100 метраў, пяць пакойчыкаў, кухня. На новым месцы яго збіралі традыцыйнай талакой. На той час бацька зрабіўся дырэктарам мэблевай фабрыкі «Радзіма» ў Мінску. На вуліцы Слясарнай, у раёне, дзе яна падыходзіць да Свіслачы і дзе знаходзіцца хлебазавод-аўтамат, атрымоўвалі сядзібныя ўчасткі рабочыя станкабудаўнічага і іншых заводаў і фабрык. Ім давалі па 9 сотак з магчымасцю пабудаваць драўляны дамок і зладзіць гародзік.

Цікава, што дом перажыў вайну, бамбёжкі і шмат часу пасля. Яго знеслі, калі на Слясарнай пачалі будаваць дамы для начальства з ЦК КПБ. Там жылі мама і мой брат Валеры Лапцэвіч, на той час намеснік галоўнага інжынера Белпрампраекта. Пасада дапамагла яму з мамай кожнаму атрымаць па аднапакаёвай кватэры.

Раскажу, як я перажыла пачатак вайны ў Мінску: бо сведак застаецца небагата. Скажам, як паводзілі сябе немцы — вельмі па-рознаму. У чэрвені 1941-га горад здалі без адзінага стрэлу. Калі зараз кажуць, быццам Савецкая армія супраціўлялася — гэта няпраўда. Немцы не прыйшлі, пяхоты не было — яны прыехалі: самае простае — салдаты на роварах, а так збольшага матацыклісты. Вось я і чую, як на нашай вуліцы хлопцы крычаць: «Немцы едуць!» Я гляджу — едуць звычайныя людзі. А ў савецкіх газетах, якія я чытала з шасці гадоў, малявалі выключна нейкіх буржуінаў або чарцей! Я так сабе і кажу ўголас: «Дык гэта ж людзі!» І гэтыя людзі адразу ўзяліся наводзіць парадак, бо некалькі дзён было міжуладдзе, усё апынулася разбураным, усё расхваталі, разрабавалі заводы, крамы. У першыя ж дзень-два немцы наладзілі харчаванне — з машын з вялікіх чанаў людзям раздавалі суп. І так некалькі дзён, пакуль не наладзілася жыццё. А горад тым часам гарэў — немцы разбамбілі цэнтр, увесь сённяшні праспект. Ужо пазней астатняе дабамбіла савецкая авіяцыя. Калі сполахі пачалі аціхаць, мама сказала мне: "Схадзі ў горад, паглядзі, што там робіцца". Слясарная, дзе мы жылі, не лічылася горадам. Горад — тое, што ў цэнтры на пагорках. Падымаешся на гару да Дома афіцэраў — і ты ў горадзе.

І вось, даходжу я да ўздыму, што ля Дома афіцэраў, і бачу: стаяць вісельні, дзве ці тры. На першай вісеў хлопец гадоў шаснаццаці. Я хутка пабегла назад да мамы, спалоханая... Вось такія першыя ўражанні ад немцаў. Потым мяне яшчэ хацелі забраць як «юду», жыдоўку. Як гэта адбылося? Трэба ж было сям'і з нечага жыць — маці, дзеду, бацькавай незамужняй сястры Дашы і траім дзеткам, з якіх я, дзесяцігадовая, была старэйшай. Усіх трэба накарміць! І мама, узяўшы ўсе свае лепшыя адзежы, модныя сукенкі з крэпдэшыну, бацькавы бастонавы касцюм пайшла на Чэрвеньскі рынак і абмяняла на карову. (Маме пашанцавала перад вайной у Лагойску скончыць курсы швачак, і гэта ёй вельмі дапамагала. Яна мела дызайнерскі талент і вырабляла выдатныя строі і сукенкі — магла пашыць нават не прымяраючы на чалавека, на вока. Гэта нас і ратавала). І вось яна прывяла карову ў наш агарод. А за гародам пачынаўся пасёлак «Камінтэрн», там жылі розныя начальнікі і артысты опернага тэатра — перад самай вайной іх засялілі ў двухпавярховыя драўляныя дамкі. Адна з акторак, угледзеўшы нашу карову, таксама набыла сабе рагульку і, прыйшоўшы да маёй мамы, папрасіла, каб я іх пасвіла разам.

**У Мінску паўсюдна віселі афішы, дзе паведамлялася: за галаву камуніста прапаноўваецца 25 тысяч акупацыйных марак, а за галаву кожнага члена яго сям'і — па 5 тысяч**

А ўвосень за гэта паабяцала нам машыну дроваў. Так пачалася мая праца пастушкі.

Аднойчы, у дажджлівы дзень лета 1941-га, я выйшла пасвіць каровы, накінуўшы на плечы карычневую хустачку. Тая была з дзіркай, якую маці зацыравала латкай у жоўты колер, і латка якраз прыпала на спіну. Тут ідуць два нямецкія, менавіта нямецкія, паліцаі-патрулі, бачаць мяне, крычаць «юдэ!» і ўжо мяне хапаюць і цягнуць. Выратавала суседка Капусціна, якая, выскачыўшы, блытаючы нямецкія і беларускія словы, здолела патлумачыць, што я не габрэйка.

Тым часам маці і надалей працавала швачкай — шыла мужчынскія буркі і штаны, а я хадзіла на Чэрвеньскі рынак і прадавала. «Выбачай, дачушка, — сказала мама, — ты ў мяне адзіная старэйшая, будзеш за сына!» На рынку надаралася падпрацоўка — купіўшы бохан, пакроіць яго на лусты і прадаваць разам з вадой. Тады пад канец дня можна было напрацаваць яшчэ на адзін бохан. А пагандляваўшы вопраткай, трэба было набыць тканіны на новую працу... Калі пазней у СССР пра нас, з акупаваных тэрыторый, казалі — здраднікі, я думала: каб у вас язык адсох! Колькі мільёнаў, без аніводнага стрэлу, кінула ў палон савецкая дзяржава! У першыя дні вайны ў небе лёталі адны месершміты! Мая мама са здзіўленнем казала: а дзе ж слаўныя сталінскія сокалы, пра якіх грымела прапаганда перад вайной?

Пад канец 1941-га, у снежні, мы сышлі з горада. У Мінску паўсюдна віселі афішы, дзе паведамлялася: за галаву камуніста прапаноўваецца 25 тысяч акупацыйных марак, а за галаву кожнага члена яго сям'і — па 5 тысяч. На нашай сям'і можна было добра зарабіць. А тут адна суседка пытаецца ў маці — а ці праўда, што твой Міша да вас прыходзіць уначы? Маці зразумела, што час з'язджаць з горада.

Бацька, праўда, загінуў у першыя ж дні вайны — яго разбамбілі ў вайсковым эшалоне, што рушыў з Мінска на Брэст, 24 ці 25 чэрвеня. Па вайне мы атрымалі фальшывае паведамленне, што бацька прапаў без звестак у верасні 1944-га. Мы яшчэ тады падумалі, як жа ён ад пачатку ліпеня да верасня 1944-га ў вызвалены Мінск, дзе пакінуў усю сям'ю, не даслаў ніводнай весткі? Пазней мы зразумелі: такімі падманамі савецкая ўлада складала з сябе абавязкі даглядаць сем'і палеглых франтавікоў. Пра яго смерць распавёў увосень 1945 года адзін з ягоных таварышаў па працы, які ацалеў пад бамбёжкай у тым цягніку і здолеў адыйсці з фронтам на Усход.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284—85—11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП "Плутас-Маркет". г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 685

Падпісана да друку 24.06.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.